Речевой образ газеты «СБ. Беларусь сегодня» меняется. Динамика употребления рассматриваемых конструкций показательна в плане языкового «очищения», высвобождения от лексической избыточности. Сравним с вышеуказанными примерами иллюстрации из медиатекстов 2010 года: ***Актуальные проблемы*** *и перспективы развития волонтерского движения в России и Беларуси* (21.01.2010); *В Год родной земли* ***проблема мусора*** *для Минской области была* ***актуальна*** *как никогда* (03.02.2010); *...Обсудили* ***актуальные проблемы*** *на «круглых столах»* (19.03.2010); *...Были заслушаны доклады по* ***актуальным проблемам*** *союзного строительства в контексте геополитических… …И другие* ***актуальные проблемы*** *международной активности субъектов Союзного государства* (08.06.2010); *...В центре внимания находятся наиболее* ***актуальные проблемы****, затрагивающие интересы всего человечества* (02.06.2010); ***Актуальным проблемам*** *строительства и развития Союзного государства будет посвящена научно-практическая конференция* (25.05.2010); *Об* ***актуальных проблемах*** *и конкретных де-*

лах... (06.10.2010); *Западный транзит. **Проблема** незаконной миграции остается одной из наиболее **актуальных** для мирового сообщества* (29.09.2010); *На его заседаниях обсуждаются **актуальные проблемы** развития сельскохозяйственного производства и социальной...* (09.09.2010); *Разговор шел о российско-белорусском газовом конфликте и других **актуальных проблемах**...* (25.06.2010) и др. Конструкции стандартизированы, лишены конкретики, коммуникативно подчинены доминанте – *актуальная проблема*.

Словосочетание *актуальная проблема* приобрело устойчивый характер. Околонаучное звучание оно приобретает в диссертационных исследованиях, когда говорят не об актуальности заявленной *темы*, а так называемой актуальности *проблемы*. Хотя синтагматика слова *актуальный* чрезвычайно богата, что обеспечивается парадигматическим уровнем (‘важный’, ‘существенный’, ‘насущный для настоящего времени’, ‘злободневный’, ‘современный’): ‘актуальный’ (-ая/-ое): тема, вопрос, характер, интернет, сток: *При этом наши с вами системы интегрированы, то есть вы видите **актуальный сток**: эта кружка у нас на складе физически есть* (Национальный корпус русского языка – далее НКРЯ); инструмент, сюжет, текст, дизайн, дискурс: *Никонов Андрей. Великое потрясение Европы (**актуальный дискурс**)* (НКРЯ)*;* вид отдыха, разговор, театр, альманах, намек, комментарий, способ, опыт, проект, среда, задача, статья книга требование, исследование, порядок власти: *Словом pouvoir Делёз обозначает **актуальный порядок власти**, близкий пониманию власти у Фуко, при котором власть мыслится не как сила, а как взаимодействие сил* (НКРЯ); пласт кино: *Таков **актуальный** (читаемый) **пласт кино**, остальное – виртуальные образы прошлого (причем прошлого, всегда принадлежащего другим, а потому вечно загадочного или ложного), формирующие целое фильма* (НКРЯ); эпитет, акт, пример, призыв, художник, крем, стиль, фильм, предмет исследования, семинар, принцип, диалог, труд, уровень, смысл, план: *Потребность перестает разуметься сама собою, и «производство потребностей» из плана глубокого основания производства переходит в **план актуальный** – непросто проявленный, а прямо-таки агрессивно доминирующий* (НКРЯ); закон, дуэт, отчет, параметр, репортаж, пассаж, вывод, контекст, символ, ответ, комплекс мер, тонус: *Впрочем, польза от всего этого несомненна – в первую очередь, психологический тонус, крайне **актуальный** под четвертьфинал, где играть придется с Францией – еще одним хоккейным «карликом» не без сюрпризов* (НКРЯ); тренд, подарок, идея, сфера, угроза, социология, дата, история, тайна, версия, личность, инициати-

ва, среда, задача, статья, книга, вещь, тусовка: *Отцы и деды, **актуальная** западная **тусовка** и набор российского инди* (НКРЯ); информация, штучка: *«Интимные места» – не только **актуальная штучка**, пришедшаяся как нельзя лучше во времена очередных борений за нравственность и изобличающая античеловечность, глупость и фальшивость таких кампаний* (НКРЯ); новинка, информация, тенденция, причина, задолженность, требование, исследование и многие другие.

В синонимический ряд лексемы *проблема* при разной степени семантической близости включены слова: апория, вопрос, гемор, геморрой, головная боль, головняк, дело, загадка, загвоздка, задача, закавыка, закавычка, заковырка, заколупка, закорючка, заморочка, засада, затруднение, затруднительное положение, затык, кариес, кикоз, колбаса, материя, осложнение, переделка, переплет, положение, предмет внимания, предмет обсуждения, препятствие, рак головы, рана, сага, сложность, сложнячка, тема, трабл, трудность, узкое место, хоботня. Наиболее экспрессивные элементы не допускают к себе приближение *актуальный*: ср. актуальный кикоз или трабл? Это же касается и книжных элементов: актуальная апория? Данная речевая ситуация свидетельствует об экстралингвистическом характере устойчивости словосочетаний типа *актуальная проблема*, вызванной ходом семантического освоения более известного слова посредством менее известного заимствования: *потенциальные возможности*, *специфические особенности*, *амплуа актера* и др.

Ради справедливости следует указать на тот факт, что газета «СБ. Беларусь сегодня» продолжает использовать в текстах подобные словосочетания: *100 грантов на исследования по **актуальным проблемам*** (17.01.2017); *...Обменялись взглядами **по актуальным проблемам** международной политики...* (11.03.2017); *...Создать атмосферу живого общения **по актуальным проблемам** современности…* (24.01.2017); *…**Одна из самых актуальных проблем** современной медицины…* (20.01.2017); *...Обычно встречаются **по актуальным проблемам** четыре раза в год…* (11.01.2017); *...Давали интервью **по актуальным проблемам** союзного строительства…* (03.01.2017). Однако они становятся менее частотными.

Тексты «СБ. Беларусь сегодня» приобретают современные черты – становятся информативными, еще более содержательными, лишенными заданной трафаретности, стандарта и клише. Высвобождение от лексической избыточности характерно для журналистской практики в целом, о чем свидетельствует статистика употреблений их в газетном корпусе НКРЯ. Так, по состоянию на март 2003 года частота употребле-

ния фраземы *актуальная проблема* на миллион словоформ составляла 0,92551 ед., тогда как на апрель 2014 года – 0,44003 ед.

Неоднократно подчеркивалась особая роль речевой практики журналиста. Медиатексты современности являются предвестником будущих изменений в языке, виртуальная речь выявляет болевые точки современной вербалистики и свидетельствует о некоторой растерянности лингвистов в осознании того, что происходит с языком (см., например: М. Кронгауз «Русский язык на грани нервного срыва», В. Плунгян «Портится ли русский язык?» и др.). Язык газеты – мощное орудие формирования речевого вкуса, и сегодня он становится доминирующим в совокупности текстов функциональных стилей. Отсюда творческая и интеллектуальная напряженность в работе редакционных коллективов, отдельных журналистов, от чьих успехов зависит эффективная коммуникация в социуме.

Уладзімір Касько
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

МАСТАЦКАЕ КАНСТРУЯВАННЕ КНІГІ: АД ЭЛЕМЕНТА ДА СІСТЭМЫ

Чалавек схіліўся над кнігай. І яна, як бурны паток, падхапіла яго, павяла ў цікавае, захапляючае падарожжа па краінах і кантынентах, будзячы думку пра подзвіг, выхоўваючы высакародныя пачуцці, фарміруючы светапогляд. Пачаўся таямнічы час «духоўнага зліцця чалавека з вялікімі розумамі ўсіх часоў і народаў» [цыт. па: 3], як ахарактарызаваў чытанне А. М. Горкі.

Кніга – сябар чалавека, крыніца ведаў. Без яе немагчыма ўявіць сваё жыццё. Вось чаму так радуемся мы кожнаму новаму выданню, выпушчанаму нашымі выдавецтвамі.

Па дадзеных дзяржаўнага статыстычнага ўліку [5], у 2016 годзе выдавецтвамі і выдаючымі арганізацыямі розных форм уласнасці выпушчана 9581 назваў кніг і брашур агульным тыражом 23,14 млн экз. На беларускай мове ўбачылі свет 1 122 назвы кніг і брашур, што складае 11,7 % у агульнай колькасці выпушчанай у рэспубліцы выдавецкай прадукцыі і 16,2 % у яе сукупным тыражы. Павялічваецца доля вучэбнай літаратуры ў сукупным аб'ёме выпуску – 51,4 % ад агульнай колькасці выпушчанай прадукцыі і 76,1 % у сумарным тыражы. Нарошчваюць выпуск кніг на беларускай мове дзяржаўныя выдавецтвы «Мастацкая літаратура», «Народная асвета», «Вышэйшая школа», «БелЭН»,

выдавецкі дом «Звязда». Апошнім выпушчана ў мінулым годзе 52 назвы кніг агульным тыражом 72,8 тыс. экз. Сярод іх – кнігі сучасных беларускіх аўтараў, творы для дзяцей і юнацтва пра прыродазнаўства, распачаты выпуск перакладаў на беларускую мову твораў вядомых кітайскіх паэтаў.

Вынікі работ беларускіх кнігавыдаўцоў у мінулым годзе традыцыйна падвёў 56-ы Нацыянальны конкурс «Мастацтва кнігі», у якім прынялі ўдзел 39 выдавецтваў. У ліку дыпламантаў сталі кнігі дзяржаўных выдавецтваў «Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі», «Народная асвета», «Мастацкая літаратура», «Вышэйшая школа». Поспех садзейнічаў кнігам, багатым на змест, мастацка і паліграфічна аформленым. Гэтым крытэрыям адпавядалі кнігі-пераможцы Міжнароднага конкурсу дзяржаў-удзельнікаў СНД «Мастацтва кнігі», праведзеным у 2016 годзе ў Бішкеку. У намінацыі «Гран-пры» дыплом быў прысуджаны кнізе «Уладзімір Мулявін. Сэрцам і думамі» (выдавецтва «Мастацкая літаратура»), заахвочвальныя атрымалі кнігі А. Аблажэй «Красноречивое сердце», «Вечерняя сказка» (выдавецтва «Мастацкая літаратура»), «Звонкие краски слова» («Планета», «Беловагруппа»).

Пры вызначэнні кніг-пераможцаў асобным радком адзначаецца мастацкае канструяванне выдання. Яно падраздзяляецца на знешняе (супервокладка, вокладка, пераплётныя крышкі, форзац, футарал) і ўнутранае – афармленне тытульнага ліста, пачатковай, звычайнай і канцавой старонак, ілюстрацый і іншых унутраных частак выдання [1].

Праект мастацкага афармлення рыхтуе мастацкі рэдактар, пры неабходнасці – з прыцягненнем мастака. Асновай для распрацоўкі праекта служаць:

– тып выдання (жанр твора, чытацкія аўдыторыі, умовы чытання і тэрміны карыстання кнігай);

– аб'ём выдання ў аўтарскіх аркушах;

– склад выдання (колькасць і віды тэкстаў, ілюстрацыйнага матэрыялу);

– плануемы тыраж [6].

У праекце павінны быць адлюстраваны дадзеныя аб фармаце папяровага ліста выдання, паласы набору, спосабы і сродкі прыгатавання друкаваных форм (спосаб набору тэкстаў, гарнітуры і памеры шрыфтоў для набору, спосабы і сродкі афармлення тытульных элементаў, ілюстраванай часткі выдання, спосабы друку, якасць паперы, пераплёту і г. д.).

Стадыі мастацкага канструявання выдання:

– вывучэнне рукапісу твора, мэты і чытацкае прызначэнне кнігі;

– улік фінансавых і матэрыяльных магчымасцей выдавецтва і друкарні;

– распрацоўка праекта афармлення выдання з улікам рэкамендацый выдавецтва, падрыхтоўка макета выдання;

– разгляд і зацвярджэнне макета на мастацка-тэхнічным савеце;

– выраб арыгіналаў знешняга і ўнутранага афармлення, а таксама ілюстрацыйнай часткі выдання для рэпрадуцыравання;

– перадача выдавецкага арыгінала тэхнічнаму рэдактару.

Асноўныя элементы кнігі – форзац, каптал, тытульны ліст, фронтыспіс, шмуцтытул, калонтытул; калонлічбы. Кожны з іх патрабуе асобнага разгляду. Спынімся на элементах, якія складаюць аснову любога тэксту [1].

Шрыфтом прынята называць камплект знакаў, неабходных для друкавання тэксту на пэўнай мове [4]. Галоўныя патрабаванні да шрыфтоў – зручнасць чытання, прастата распазнавання адметных асаблівасцяў знакаў.

Малюнак знака шрыфту мае свае стылявыя асаблівасці. Шрыфты выдзяляюцца графічнай асновай знакаў пісьменства, малюнкам, абрысам, памерам.

Пад графічнай асновай знакаў маецца на ўвазе камплект знакаў алфавіту, неабходны для ўзнаўлення тэксту на пэўнай мове – рускай, беларускай, англійскай і г. д.

Па малюнку шрыфт характарызуецца асаблівасцямі асобных элементаў, якія ўтвараюць літару. Так, у рускім алфавіце некаторыя літары, як прапісныя, так і радковыя, маюць аднолькавы малюнак – Нн, Оо, Сс, некаторыя ж – розны – Аа, Бб, Ее. Адна з галоўных прыкмет таўшчыні штрыхоў, якія характарызуюць малюнак шрыфта, – адносіны таўшчыні асноўных і злучальных штрыхоў. Асноўныя штрыхі літар звычайна завяршаюцца падсечкамі, якія маюць розныя канцоўкі.

Абрысы шрыфтоў характарызуюцца насычанасцю – таўшчынёй, нахілам адносна гарызантальнай лініі шрыфту, адноснымі памерамі шырыні і вышыні знакаў і характарам запаўнення штрыхоў, засечак.

Па насычанасці шрыфты бываюць светлыя (унутрылітарны прасвет у 2-4 разы большы за таўчшыню асноўнага шрыфту), паўтлустыя (унутрылітарны прасвет роўны або нават шырэйшы за асноўны штрых), і тлустыя (унутрылітарны прасвет вузейшы за таўшчыню асноўнага штрыха).

Па нахіле шрыфты падзяляюцца на прамыя, курсіўныя – тыя, якія імітуюць рукапісны тэкст.

Па памерах шырыні і вышыні знакаў шрыфты падзяляюцца на 5 груп:

– нармальныя (адносіны шырыні ачка да вышыні прыкладна 3:4);

– вузкія (прыкладна 1:2);

– звышвузкія (1:3);

– шырокія (1:1);

– звышшырокія (шырыня ачка перавышае вышыню).

Па мэтавым прызначэнні ўсе *паліграфічныя шрыфты можна падзяліць на 4 групы*:

– тэкставыя – прымяняюцца ў асноўным для кніжна-часопіснага, газетнага і іншых тэкстаў. Гэта шрыфты прамога светлага абрысу кеглем ад 5 да 12 пт;

– выдзяляльныя – кегль ад 5 да 12 пт нахільнага, курсіўнага, таксама паўтлустага і тлустага абрысаў;

– тытульныя – для загалоўкаў, тытульных лістоў ад 16 да 48 пт;

– афішна-плакатныя – кегль звыш 48 пт.

У залежнасці ад віду выданняў шрыфты падзяляюцца на газетныя, кніжныя, картаграфічныя і спецыяльнага прызначэння.

Асноўныя гарнітуры, якія выкарыстоўваюццца ў выдавецкай справе Беларусі. У залежнасці ад віду выдання і чытацкай прыналежнасці ў выдавецтвах рэспублікі прымяняецца вялікая колькасць шрыфтоў.

Для набору газет – новая газетная, газетная рубленая, брусковая, газетная, а таксама літаратурная, звычайная новая.

Для часопісаў і кніг – часопісная рубленая, новая часопісная, а таксама літаратурная, звычайная новая, Баннікаўская, акадэмічная школьная, брусковая, рубленая.

Для слоўнікаў, энцыклапедый – Кудрашоўская (энцыклапедычная Кудрашоўская слоўнікавая), Бадоні кніжная, звычайная, звычайная новая.

У літаратуры для дашкольнага і школьнага ўзросту – букварная, школьная, Елізавецінская, Баннікаўская, літаратурная, акадэмічная, рубленая і г. д.

Для набору плакатаў, афіш, рэклам – плакатная, акцыдэнтная, новая, старажытная, рубленая і г. д.

У сувязі з шырокім укараненнем у выдавецкую справу камп'ютарнай тэхнікі колькасць шрыфтоў рэзка ўзрасла. Найбольш распаўсюджанымі сталі Таймс, Хельвеціка, Баскервіл. Камп'ютарам можна стварыць шрыфты новых мадыфікацый.

Кегль – гэта памер шрыфту ў друкарскіх пунктах, які вызначае вышыню літары або знака з уключэннем невялікіх прабелаў зверху і знізу,

неабходных для ўтварэння міжрадковага прабелу (інтэрліньяжу), а таксама для размяшчэння падрадковых і надрадковых элементаў [4]. Пункт роўны ў айчыннай сістэме адзнак вымярэння 0,376 мм, а ў англійска-амерыканскай – 0,356 мм.

Назвы кегляў: 3 пт – брыльянт, 4 пт – дыямант, 5 пт – перл, 6 пт – нанпарэль, 7 пт – міньён, 8 пт – петыт, 9 пт – боргес, 10 пт – корпус, 11 пт – цыцэра, 14 пт – міталь, 16 пт – тэрцыя, 20 пт – тэкст. Найбольш часта сустракаюцца кеглі 6, 8, 10, 12, 16, 20 пунктаў.

Над мастацкім афармленнем кнігі плённа працавалі ўсходнеславянскія першадрукары Францыск Скарына, Іван Фёдараў, Пятро Мсціславец [2]. 500-годдзе з дня выхаду першай кнігі беларускага першадрукара Францыска Скарыны ўрачыста адзначылі сёлета мільёны кніжных аматараў свету, шматлікія мастакі, паліграфісты. Кніга заслужыла такую пашану.

Літаратура

1. Акопов, А. И. Основы издательского дела : учеб.-метод. пособие / А. И. Акопов. – Ростов на/Д : Изд-во Института массовых коммуникаций, 1996. – 49 с.
2. Волк, А. А. Книгоиздательское дело в Белоруссии : истор. очерк / А. А. Волк, А. И. Ракович. – Минск : Изд-во БГУ, 1977. – 280 с.
3. Касько, У. К. Кнігазнаўства : тэзісы лекцый для студэнтаў / У. К. Касько. – Мінск : БДУ, 2002. – 26 с.
4. Касько, У. К. Слоўнік выдавецкіх тэрмінаў / У. К. Касько. – Мінск : БДУ, 2012. – 130 с.
5. Справочно-аналитическая информация о деятельности отрасли СМИ и печати в 2016 году. – Минск, 2017.
6. Что нужно знать об издательской деятельности : практ. пособие. – Минск : Нац. книжн. палата, 2014. – 156 с.

Алена Кунахавец-Плявака
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

ЖУРНАЛІСТ РАЁННАГА ВЫДАННЯ: ВОПЫТ САЦЫЯЛАГІЧНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ

Сучасныя ўмовы і фактары развіцця медыясферы абумоўліваюць змяненні ў патрабаваннях да сацыяльных, прафесійных і асабістых якасцей саміх журналістаў. Сёння практычна любы чалавек можа распаўсюджваць інфармацыю: галоўнае – мець пад рукой тэлефон з доступам у інтэрнэт. Пры гэтым для многіх людзей рэчаіснасць звузілася да экрана смартфона, а карціна свету – да стужкі навін у сацыяльных

сетках, што не можа не выклікаць апасенняў. Менавіта таму вялікае значэнне набывае прафесіяналізм і адказнасць людзей, якія заняты ў сферы медыяіндустрыі. У сувязі з гэтым узрастае актуальнасць правядзення сацыялагічных даследаванняў сучасных сродкаў масавай інфармацыі.

Звернемся да вынікаў апытання журналістаў мясцовых выданняў Брэстчыны, што праводзілася ў красавіку–чэрвені бягучага года. У анкетаванні прынялі ўдзел 75 творчых супрацоўнікаў 14 раённых газет паўднёва-заходняй вобласці нашай рэспублікі. Сярод рэспандэнтаў 15,8 % займаюць пасаду намесніка рэдактара і адказнага сакратара, 31,6 % − загадчыка аддзела, 38,6 % − карэспандэнта і фотакарэспандэнта, 7 % − літаратурнага рэдактара. Паказальна, што 92 % апытаных маюць вышэйшую адукацыю, сярэднеспецыяльную і паслядыпломную – адпаведна па 4 %. Большасць журналістаў мясцовых выданняў скончылі профільныя вышэйшыя навучальныя ўстановы: сярод супрацоўнікаў раённых газет Брэстчыны – выпускнікі Інстытута журналістыкі БДУ, а таксама аддзялення журналістыкі філалагічнага факультэта Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Аднак, як паказвае практыка, па-ранейшаму ў рэдакцыях на розных пасадах працуюць людзі, якія фактычна не маюць адпаведнай адукацыі (14,55 %), журналістыка прываблівае настаўнікаў (пераважна гісторыка-філалагічнага накірунку), эканамістаў і інжынераў. Ацэньваючы ўзровень сваёй прафесійнай кваліфікацыі, 14,3 % творчых супрацоўнікаў раённых газет называюць яго высокім, 73,47 % лічаць дастатковым для работы на сваёй пасадзе і 10,2 % прызнаюць, што пакуль ім не хапае тых навыкаў і ўменняў, якімі яны валодаюць. Пастаяннае самаразвіццё і самаўдасканаленне – неад'емныя атрыбуты дзейнасці супрацоўнікаў любога выдання, аднак асабліва значна і актуальна гэта для журналістаў мясцовага друку. Імклівае развіццё медыясферы, пашырэнне каналаў атрымання і распраўсюджвання інфармацыі патрабуюць ад работнікаў СМІ трымаць руку на пульсе часу.

Адзначым, што сярод удзельнікаў нашага апытання аказалася 73,9 % жанчын і толькі 26,1 % мужчын. На пачатку 2000-х гэтыя суадносіны ў рэдакцыях рэгіянальных СМІ выглядалі крышку інакш: 57,8 % жанчын і 42,2 % мужчын. Аднак, як бачым, характэрная тэндэнцыя акрэслілася ўжо тады. Здагадкі Я. І. Дзмітрыева аб тым, што ў хуткім часе журналістыка стане практычна жаноцкай прафесіяй і галоўную ролю ў рэгіянальных СМІ будзе адыгрываць слабы пол, спраўдзіліся [1, с. 32]. Сёння жанчыны складаюць большую частку калектываў мясцовых выданняў: яны і галоўныя рэдактары, і загадчыкі аддзелаў

прамысловасці і сельскай гаспадаркі, і распрацоўшчыкі традыцыйна «мужчынскіх» тэм, такіх як асвятленне палітычных, эканамічных падзей рэгіёна. Мужчыны, напрыклад,часцей, чым жанчыны, займаюць пасады фотакарэспандэнтаў, працуюць з тэхнікай.

Сярэдні ўзрост творчых супрацоўнікаў рэдакцый, што прынялі ўдзел у апытанні, – 40 гадоў. Размеркаванне рэспандэтаў па ўзроставых групах выглядае наступным чынам: да 30 гадоў – 34 % , ад 31 да 40 гадоў – 21,28 %, ад 41 да 50 гадоў – 17 %, ад 51 да 60 гадоў – 21,28 %, больш за 60 гадоў – 6,4 %. Дарэчы, папярэднія сацыялагічныя даследаванні паказвалі, што ў мясцовых рэдакцыях працуюць людзі сталага ўзросту: на пачатку 2000-х гадоў «у корпусе рэгіянальных журналістаў пераважаюць людзі з вопытам работы СМІ савецкага перыяду» [1, с. 28]. Яшчэ адзін цікавы факт: у час правядзення сацыялагічнага даследавання на Брэстчыне ў грамадска-палітычных выданнях не было ніводнага творчага супрацоўніка з вопытам работы да аднаго года, пры гэтым дзве трэція журналісцкага корпуса мелі стаж прафесійнай дзейнасці ад 10 і болей гадоў [1, с. 30]. Сёння сітуацыя змянілася: працэсы «ажыўлення» мясцовага друку, пашырэння тэматычнай і жанравай разнастайнасці выданняў у выніку кадравага амаладжэння рэдакцый з'яўляюцца станоўчымі тэндэнцыямі развіцця рэгіянальнай перыёдыкі. Адзначым, што звычайна супрацоўнікі мясцовых СМІ да прыходу ў рэдакцыю не маюць вопыту журналісцкай работы, «раёнка» – традыцыйна першае месца працы для пачынаючых акул пяра. Паказальна, што многія з іх усё сваё свядомае жыццё застаюцца вернымі рэдакцыйнаму калектыву мясцовага выдання.

Адзначым, што 87,76 % журналістаў раённых газет Брэстчыны больш чым на 50 % задаволены сваёй працай. Пры гэтым 20,4 % апытаных выбралі максімальны паказчык – задаволенасць на 100 %; 24,49 % журналістаў на 90 % задаволены ўмовамі працы, 16,33 % і 20,4 % – адпаведна на 80 % і 70 %. Цікава, што з павышэннем узросту работнікаў павышаецца і ўзровень вышэйадзначанага паказчыка. Безумоўна, задаволенасць з'яўляецца адным з найважнейшых фактараў павышэння прадукцыйнасці і эфектыўнасці працы. Зніжэнне гэтага паказчыка прыводзіць да негатыўных наступстваў у кадравым забеспячэнні рэдакцыі, аднак з другога боку – у цалкам задаволенага супрацоўніка адсутнічае імкненне да самаўдасканалення (у прафесійным і асобасным плане), зніжаецца ўзровень матывацыі, пагаршаецца зацікаўленасць у выніковасці публікацый. Такім чынам, у ідэале задаволенасць працай работнікаў павінна быць не максімальнай, а аптымальнай.

Характарызуючы ступень прафесійнай свабоды і самастойнасці, 72,55 % творчых супрацоўнікаў раённага друку адзначылі, што не адчуваюць ціску ў адносінах да выбару тэм для будучых матэрыялаў альбо спосабу прадстаўлення інфармацыі, калі-нікалі з такой сітуацыяй на практыцы сутыкаюцца 7,84 % журналістаў. Аднак 13,73 % апытаных называюць гэта звычайнай з'явай: «тэмы ў асноўным прапаноўвае рэдактар», «бывае так атрымоўваю, што нават звольніцца хочацца». Улічваючы тое, што некаторыя рэспандэнты ўвогуле пакінулі гэтае пытанне без адказу, можна гаварыць аб тым, што ўсё ж такі праблема існуе. У той жа час на пытанне: «Ці дастаткова і поўна раённая газета адлюстроўвае падзеі, што адбываюцца ў рэгіёне?» большасць рэспандэнтаў далі станоўчы адказ (67,27 %), аднак ёсць і тыя, хто прытрымліваецца іншага пункту гледжання: 21,8 % апытаных адзначылі, што інфармацыя не заўжды падаецца поўна і аб'ектыўна; 10,9 % журналістаў лічыць, што многія падзеі і мерапрыемствы асвятляюцца аднабакова.

Ацэньваючы ступень уплыву газеты на прыняцце рашэнняў па развіцці той ці іншай сферы рэгіёна, большасць рэспандэнтаў адзначылі, што пэўны ўплыў аказваецца: 41,5 % журалістаў лічаць яго істотным, 45,3 % – неістотным. 5,94 % творчых супрацоўнікаў «раёнак» увогуле адмаўляюць верагоднасць аказання ўсялякага ўплыву. Пры гэтым 77,55 % рэспандэнтаў узровень дзейснасці і эфектыўнасці сваіх газетных публікацый называюць высокім.

Большасць журналістаў адзначылі, што ўзровень іх працоўнай актыўнасці складае 90–100 % (66,67 % з агульнага ліку апытаных), яны працуюць з поўнай самаддачай. Аднак сярод творчых супрацоўнікаў раённых газет Брэстчыны ёсць і тыя, у каго ўзровень працоўнай актыўнасці па тых ці іншых прычынах дасягае толькі 40–50 %. Відавочна, пэўныя рэзервы творчых сіл у рэдакцыях ёсць, таму для кіраўнікоў гэтых устаноў галоўнай бачыцца задача поўнага раскрыцця патэнцыялу сваіх супрацоўнікаў. У адваротным выпадку – паўстае заканамернае пытанне: ці месца ў рэдакцыйным калектыве людзям, не зацікаўленым у пасяховай дзенайсці выдання?

Для любога калектыву важнымі з'яўляюцца пытанні працоўнай матывацыі, паколькі лічыцца (і не без дастатковых на тое падстаў), што эфектыўны работнік – гэта высока матываваны работнік. Паказальна, што для многіх творчых супрацоўнікаў рэгіянальных СМІ асноўнымі фактарамі матывацыі ў прафесіі сталі адчуванне ўласнай карыснасці, неабходнасць самарэалізацыі, павага з боку блізкіх людзей і значнасць работы. Выданням з такімі супрацоўнікамі, безумоўна, будзе забяспечана доўгае жыццё.

Літаратура

1. Дмитриев, Е. И. Журналисты региональных СМИ: социально-демографический портрет / Е. И. Дмитриев // Газета + радио. В помощь редакторам региональных СМИ. – Минск, 2004. – С. 27–49.

Татьяна Назарова
Волгоградский государственный университет (Россия)

ФУНКЦИИ ИНТЕРВЬЮ-МОНОЛОГОВ В ЖУРНАЛЕ «РУССКИЙ РЕПОРТЕР»

Медиахолдингом «Эксперт» в дополнение к материнскому одноименному деловому журналу издается адресованный массовому читателю иллюстрированный журнал «Русский репортер». Цель этого издания можно обозначить как журналистское исследование социального самочувствия населения страны, переживающей идентификационный кризис. В начале 2017 г. после полугодичной приостановки задачи издания были сформулированы более определенно. В программном обращении к читателям главный редактор В. Лейбин сообщил, что редакция наблюдает бум городского активизма в регионах, перемену в общественных настроениях: «Теперь людям нужны не только хлеб и потребительское забытье, но и интересные занятия, самореализация. И это – наши люди, для них мы работаем. Для вас то есть» [2, с. 1]. Так обозначен принцип отбора сообщений. Не менее определенно обозначена и коммуникативная стратегия издания: редакция обращается к читателю, которому «надоел шум и гвалт в медиа». «Осмысленная, содержательная коммуникация», по мнению В. Лейбина, возможна только в диалоге издания с теми, кто «занят реальным творческим делом». В каждом номере рассказывая о деятельности десятков людей, журнал выполняет ценностно-регулирующую и социально-креативную функции, формулируя и подтверждая фактами систему ценностей социально активной личности, представляя субкультуру волонтерства как массовое, охватившее всю страну движение.

Журнал использует различные механизмы ценностно-нормативного влияния. Основная тактика – демонстрация предпринятого редакцией исследования психологии социально активной личности. «Русский репортер» стремится к предельной достоверности и широко использует интервью как метод и жанр, экспериментируя с его видами. Убедительны циклы коротких интервью-монологов, рассказывающих о творческих

начинаниях разных людей, которые создают несколько авторов, находящихся в разных регионах. Такая форма была апробирована уже в первом номере журнала за 2017 г., использованные в ней приемы пропаганды социальной активности характерны для журнала в целом. Сюжеты цикла «10 героев нашего времени» с характерным подзаголовком «Кто и зачем меняет жизнь вокруг себя» демонстрируют основные тенденции современного активизма и включают несколько одинаковых элементов. Первый – максимально короткие сообщения корреспондентов: ответы на вопросы: кто? (имя автора идеи), где? (название города), что сделал? (в одном предложении изложена суть проекта). Второй – фотография участников проекта, отражающая их деятельность. Третий – монолог респондента-организатора проекта. Монологи строятся по единой схеме: герой (респондент) рассказывает об импульсах, благодаря которым возникла идея, о людях, которые откликнулись и помогли ее воплощению, о целях, об уже пройденном командой пути и о планах на будущее.

Единство циклу придает общая для всех выбранных журналом респондентов мотивация деятельности и оценка результатов. Имеющие разную языковую выраженность, но совпадающие по сути, повторяющиеся в каждом монологе схемы мышления создают у читателя представление о типичных чертах характера современника. И это именно те качества, которые в каждом из номеров «Русского репортера», вышедших в 2017 г., представлены как эталонные. Интерес представляет то, что в результате журнального исследования специфики ценностей субкультуры волонтеров выявлено, что поведение «прогрессоров» определяют традиционные ментальные ценности. Регулирует деятельность всех респондентов цикла интервью-монологов мета-ценность соборности (общинности), по мнению этнопсихологов, свойственная россиянам и заложенная на генетическом уровне как национальная доминанта [4, с. 196]. Индивидуальный успех для героев цикла недостаточен для обретения смысла жизни. Идея единения с другими с гуманитарной целью актуализируется в репликах персонажей. Каждый из авторов проектов оценивает свою работу по двум критериям: учитывается степень общественной полезности, число вовлеченных в деятельность, мера поддержки окружающих.

Объективация константы «соборности» в текстах «Русского репортера» тесно сопряжена с концептом «труд». В монологах респондентов самохарактеристика героев выстраивается с помощью имплицитно выраженного их отношения к труду. Герои цикла – это люди, для которых найденное интересное дело стало главным содержанием жизни. Цен-

ность труда В. И. Карасик рассматривает как доминирующую в отечественной культуре [1, с. 250]. Но отношение к труду может быть разным. Слово «труд» произошло от латинского «трудо» – «принуждаю, заставляю» [5, с. 108]. Журнал акцентирует то, что труд, самостоятельно, свободно выбранный, не воспринимается героями как обязанность, никто не упоминает о напряжении, о потраченных силах, возможность принести добро удовлетворяет потребность в творчестве. Представление о труде связано в сознании героев с ментальной ценностью нестяжательства. В монологах каждого из героев возникает тема работы без оплаты. Труд и деньги в сознании героев чаще противопоставляются: «Вообще у меня такой принцип: если уж начал что-то делать, делай это хорошо. Но не ради денег» [3, с. 13].

Редакция, создавая в циклах интервью-монологов образ «прогрессора», дополняет характеристику с помощью своего объяснения бума социальной активности, эксплицитно выраженного в лиде, вставных комментариях или в своеобразном заключении с пометкой «от редакции». Обычно корреспондентами актуализируются концепты «свобода» и «патриотизм». Подчеркивается свободный характер деятельности авторов проектов: «спонтанно, на энтузиазме, люди сами реализуют свою свободу, а не бюрократический план». По мнению корреспондентов, социальных лидеров сближает желание «жить в России» и «опыт некоторой разочарованности в нашей политической и управленческой системе, в условиях заметной отчужденности государственной системы от общества, они решили не ждать более подходящих условий для обустройства жизни, а взять ситуацию в свои руки и сделать, что возможно, сами» [3, с. 11]. При этом позиция журналистов может оказаться спорной, может противоречить утверждениям героев материала или включенным в текст комментариям специалистов. Например, неорганичной для характеров героев цикла о волонтерах выглядит попытка редакции представить их активность как конфликтную по отношению к государству. Респонденты считают свою деятельность дополняющей государственную социальную политику: «Мы стараемся не перекладывать на свои плечи то, что и так может сделать государство, а взять на себя пласт работы, которую не могут выполнить власти» [3, с. 14]. Способность жить и действовать, не рассчитывая на чью-либо поддержку, респонденты считают нормой, а патерналистские ожидания отклонением. Фронтальное изучение всех выпусков журнала за 2017 г. не позволяет сделать вывод о том, что журнал стремится любого мыслящего и деятельного человека представить в оппозиции государственной системе. Хотя в фокусе постоянного внимания редакции личность, отстаивающая свои права в борьбе

с представителями разных ветвей власти, преодолевающая несовершенство законов, позиция журнала представляется более сложной. «Русский репортер», скорее, наблюдает и изучает отношения общества и государства, стремясь объективно оценить деятельность власти и понять пути развития общества и государства в целом. Авторы называют свой метод «журналистским исследованием» и указывают на его рамочную ограниченность, обусловленную спецификой профессии, предупреждая о недостаточной репрезентативности выборок и невозможности однозначных доказательных выводов. Читателю предлагается материал для размышлений, и спорность выводов журналистов способна привлечь внимание общества к поискам новых схем мышления и поведения эффективнее, чем открытая пропаганда социального активизма.

Литература

1. Карасик, В. И. Языковой круг: личность, концепты, дискурс / В. И. Карасик. – Волгоград : Перемена, 2002. – 477 с.
2. Лейбин, В. Э. От редактора / В. Э. Лейбин // Русский репортер. – 2017. – № 1. – С. 1.
3. Рыжкова, А.10 героев нашего времени / А. Рыжкова, Ю. Ахметова, А. Костюковский, Е. Яковлева // Русский репортер. – 2017. – № 1. – С. 10–17.
4. Стефаненко, Т. Г. Этнопсихология / Т. Г. Стефаненко. – М. : Аспект Пресс, 2006. – 368 с.
5. Фасмер, М. Этимологический словарь русского языка : в 4 т. / М. Фасмер ; пер с нем. – 2-е изд. – М. : Прогресс, 1986–1987. – Т. 4. – 1987. – 576 с.

Дзмітрый Нікановіч
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

КІРАВАННЕ КАНТЭНТАМ МЕДЫЯФРАНШЫЗЫ

У «стагоддзе інфармацыйнай перагрузкі» няпроста стварыць уласнае СМІ «з нуля» – на медыярынку імкліва расце канкурэнцыя. Для станаўлення новага медыярэсурсу звычайна неабходна некалькі гадоў, пры гэтым няма гарантыі таго, што сфарміруецца аўдыторыя, здольная нестыхійна звяртацца да яго кантэнту. Таму значна менш затратным і з большай верагоднасцю паспяховым спосабам стаць медыяпрадпрымальнікам можна праз пакупку франшызы ў вядомага брэнда. Рэкламадаўцы, аўтарытэтныя журналісты, лідары меркаванняў, а значыць, і масавы чытач, хутчэй аддадуць перавагу не пачаткоўцу, а медыякампаніі, якую ведаюць не толькі ў краіне, але і за яе межамі (часопісы *Esquire*, *Cosmopolitan*, тэлеканал *MTV* і інш.). Часам разам з

імем і рэпутацыяй кампаніі-франчайзеры прапануюць гарантаваны пакет рэкламадаўцаў і праверaную сістэму дыстрыбуцыі.

Беларускія СМІ могуць практыкаваць франчайзінг у імкненні да высокай якасці медыякантэнту: яго вытворчасць па франшызе прадугледжвае захаванне пэўных якасных характарыстык і ўжыванне абумоўленых тэхналогій – распрацаваную, пралічаную і, як правіла, зручную схему вырабу. Выданні, якія выпускаюцца па франшызе, маюць унікальны фармат, бо валодаюць доступам да міжнародных матэрыялаў сеткі – і такая разнастайнасць дазваляе вылучыцца на фоне канкурэнтаў. Менеджмент кантэнту, які атаясамліваецца з якаснай арганізацыяй медыязместу, забяспечвае стварэнне напаўнення выдання з арыентацыяй на аўдыторыю, сусветныя тэндэнцыі і сучасны прафесійны інструментарый. Да таго ж, мяркуем, задачы менеджменту кантэнту ў дачыненні да франшызы СМІ наступныя:

- следаванне рэдакцыйным стандартам франчайзінгавай сеткі;
- выкананне патрабаванняў стайлбуку і брэндбуку;
- дарэчная карэкціроўка эстэтычнага і сэнсавага напаўнення ў адпаведнасці з культурным асяродкам.

Расійская даследчыца К. Зверава сцвярджае, што фармат кожнай франшызы часопіса *Esquire* з'яўляецца «адкрытым» і развіваецца ў сваім унікальным напрамку: часам нават складваецца сітуацыя, што франшызу і арыгінал, апроч лагатыпа, нічога не звязвае. Так, азіяцкія *Esquire* разгортваюцца справа налева; прысвечаны інтэр'ерам і аглядам дарагіх месцаў для адпачынку; у выданні практычна няма людзей і няма рэакцыі на падзеі, што адбываюцца ў грамадстве [2, с. 71].

Прыклад з *Esquire* (невядома, ці ён сведчыць пра выключэнне з правілаў альбо ўсё ж такі адлюстроўвае агульнапрыняты падыход да напаўнення медыяфраншыз) актуалізуе пытанне пра розныя стылі кіравання кантэнтам падобных выданняў, пра суаднясенне ў працэсе іх вытворчасці строгага рэгламенту сеткі і творчай свабоды, адведзенай для франчайзі.

У залежнасці ад профілю даследавання ўзнікаюць падыходы да вызначэння «медыяфраншызы», якія ў тым ліку вылучаюць на першы план змястоўна-фармальныя характарыстыкі медыяпрадукцыі. Так, у дысертацыі мастацтвазнаўцы А. Глазковай медыяфраншыза дэфініруецца як «сукупнасць медыяматэрыялаў, у рамках якой фарміруецца і падтрымліваецца адзіны апавядальны і вобразна-тэматычны лад якога-небудзь мастацкага твора, як правіла, часткова або цалкам абаронены аўтарскім правам» [1, с. 266].

Каб выявіць падабенства нацыянальных версій вядомых СМІ, мы прааналізавалі кантэнт расійскіх і беларускіх выданняў франчайзінгавай сеткі «Комсомольская правда» за 2017 г., што дазволіла вылучыць узнаўляльныя зместавыя атрыбуты медыябрэнда.

Лагатыпы беларускай і расійскай версіі ідэнтычныя па напісанні і каляровым выкананні. Заўважаныя адрозненні з'яўляюцца сэнсава апраўданымі, неабходнымі, не перашкаджаюць брэндавай айдэнтыцы. У комплексе лагатыпа змяшчаюцца:

– інфармацыя пра рэгіянальную прыналежнасць газет: «Комсомольская правда *в Белоруссии*» (далей у тэксце – *BY*), « Комсомольская правда. *Газета нашего города. Москва*» (далей у тэксце – *RU*);

– іміджавыя звесткі: найбольш значныя (згодна з пазіцыянаваннем) узнагароды рэдакцыі: ордэн Леніна (1930), ордэн Кастрычніцкай Рэвалюцыі (1975), ордэн Айчыннай вайны I ступені (1945), ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга (1950, 1957);

– даведкавыя даныя: «*Издатель ЗАО "БелКП-ПРЕСС". Основана в январе 1999 г. Общеполитическая, научно-популярная, для досуга 16+*» (*BY*); «*Основана в мае 1925 года*» (*RU*); спасылка на вэб-сайт *www.kp.by* (*BY*) і ўказанне FM-дыяпазону радыёстанцыі (*RU*) і інш.

Назіраецца агульны падыход да структурна-кампазіцыйнага і візуальна-графічнага мадэлявання нумароў, што праяўляецца:

– у дызайне вокладак – аднолькавыя фотаздымкі і фотакалажы змяшчаюцца на тытульных палосах у нумарах ад 25.08 *(RU) – 26.08 (BY)*; 08.08 *(RU)* – 10.08 *(BY)*; 27.04 *(RU)* – 26.04 *(BY)*;

– у камбінаванні элементаў унутранай кантэнт-іерархіі – адметныя рубрыкі і раздзелы выкарыстоўваюцца як у расійскім, так і ў беларускім фарматах з нязначнымі мадыфікацыямі («*Мужчина и женщина*», «*Юбилей*»; «*На диване с "Комсомолкой"*», «*Календарь астролога*» і інш.);

– у спалучэнні фірмовых колераў пры афармленні газетнай прасторы – чырвонага, чорнага, сіняга.

Цікавасць выклікае практыка выкарыстання асобных кантэнт-адзінак, якая дэманструе заканамернасць злучэння ў беларускім нумары сеткавых і мясцовых журналісцкіх матэрыялаў.

Тып I. Ідэнтычныя загалоўкі, тэкст і афармленне: паласа з публікацыямі «*Корчевников и Малахов обсудили жен, болезни, смену работы*», «*Буду сам ездить в регионы. Мы должны менять страну!*»; артыкулы «*Пособие для Примадонны*», «*7 признаков того, что у вашего летнего романа будет продолжение*», «*Боярского Маргарита Терехова отхлестала до крови*» (нумары ад 25.08 (*RU*) і ад 26.08 (*BY*)); «*Дочки*

олигарха – самые завидные невесты Британии» – «*Девушки, Абрамович снова свободен!*» ад 08.08 (*RU*) і ад 10.08 (*BY*); «*Историк Павел Пряников: Ленин работал носильщиком за три франка*», «*Из Солнца выпорхнул херувим*» ад 27.04 (*RU*) і ад 26.04 (*BY*).

Тып II. Ідэнтычныя тэкст і назва з нязначнымі адрозненнямі ў афармленні: «*Хочешь научиться экономить? Говори нет!*», «*В Ватикане разъяснили: ангелы выглядят не так, как все думают*», «*"Неуловимые мстители": Эротическую сцену вырезали, а китайца заменили цыганом*» у нумарах ад 27.04 (*RU*) і ад 26.04 (*BY*).

Тып III. Аднолькавыя назва і афармленне з фармальнай адаптацыяй тэксту: «*Филипп Киркоров: При таком гастрольном графике меня ни одна женщина не вытерпит!*» у нумарах ад 27.04 (*RU*) і ад 26.04 *(BY)*.

Тып IV. Ідэнтычныя тэкст і афармленне з адаптацыяй загалоўка: «*Пугачева отдает свою пенсию в $180 поклоннице-инвалиду*» ад 26.08 (*BY*) – «*Пугачева отдает свою пенсию в 10 700 рублей поклоннице-инвалиду*» ад 25.08 (*RU*); «*В Москве школы вокруг Соборной мечети могут перенести линейку 1 сентября из-за Курбан-байрама* » ад 26.08 (*BY*) – «*Школы вокруг Соборной мечети могут перенести линейку 1 сентября из-за Курбан-байрама*» ад 25.08 (*RU*).

Сустракаюцца і іншыя спосабы адаптацыі сеткавых матэрыялаў для беларускай франшызы: скарачэнне аўтарскіх тэкстаў, зрушэнне сэнсавых акцэнтаў у адпаведнасці з рэгіянальнай павесткай, замена фотаздымкаў, варыяцыі вёрсткі і пад.

Справядліва будзе адзначыць, што рэдакцыя «Комсомольской правды в Белоруссии» пераважна працуе з нацыянальнымі медыяпадзеямі, якасна ствараючы рэгулярны паток мясцовых навін: «*Александр Лукашенко: Если говорить о моем спортивном кредо, я совсем не хоккеист, а футболист*», «*Средняя зарплата в июле выросла на 8 рублей*» (26.08); «*Надо выходить на уровень 5-7 % годовых*», «*Александр Лукашенко: Коробит, что предприниматели пытаются работать, а мы начинаем блох выискивать*», «*Комбайнеры на уборочной: Получка в тысячу долларов и работа с семи утра до девяти вечера*» (10.08); «*Главная площадь Гомеля: ушедшая история города*» (26.04). У гэтым кантэксце варта прыгадаць і рубрыку «Женщины в истории Беларуси» – унікальны праект, аналага якому ў расійскай версіі няма.

Такім чынам, апісаныя кантэнт-тактыкі і комплекс зместавых атрыбутаў медыябрэнда фарміруе ўяўленне пра прынцыпы менеджменту медыякантэнту абедзвюх рэдакцый. Вывучэнне напаўнення медыя-

франшыз выклікае вялікую цікавасць для філалагічных даследаванняў, бо дазваляе абагульніць і сістэматызаваць вопыт журналістаў-практыкаў па кіраванні зместам газет франчайзінгавай сеткі.

Літаратура

1. Глазкова, Е. А. Художественно-выразительное своеобразие трансмедийных экранных произведений : дис. … канд. искусствоведения : 17.00.03 / Е. А. Глазкова; Академия медиаиндустрии. – М., 2017 – 268 с.
2. Зверева, Е. Современные журнальные издания синтетического типа: реализация принципов синергетики / Е. Зверева // Журналістыка-2016: стан, праблемы, перспектывы : матэрыялы 18-й Міжнар. навук.-практ. канф., прысвечанай 95-годдзю БДУ, 10-11 ліст. 2016 г., Мінск / рэдкал. : С. В. Дубовік (адк. рэд.) [і інш.]. – Вып. 18. – Мінск : ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа», 2016. – С. 70–73.

Вольга Самусевіч
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

ІДЭАЛАГІЧНЫЯ ТЭКСТЫ Ў БЕЛАРУСКІМ МЕДЫЯДЫСКУРСЕ

У сучасных умовах фарміраванне грамадскай думкі пераважна адбываецца ў масавакамунікатыўнай прасторы. У нашых рэаліях журналістыка заўжды мела ідэалагічны модус, накіраваны на сцвярджэнне ў грамадстве пэўных каштоўнасцей, адпаведных канкрэтным задачам эпохі.

Медыядыскурс не толькі траслюе і падтрымлівае, але і ўмацоўвае ідэалагічную аснову грамадства. Так, стабільнасць, да якой імкнецца кожная краіна, можа быць забяспечана толькі прадумана пабудаванай ідэалогіяй, з апорай на ўніверсальныя канцэпты, канстантныя для любога соцыуму, аднак якія праз СМІ атрымліваюць актуальнае для канкрэтнага гістарычнага перыяду семантыка-ідэалагічнае напаўненне. Па меркаванні даследчыкаў, сродкі масавай інфармацыі ствараюць тэкстуальна-ідэалагізаваную «аўдыя-іконасферу», у якой жыве сучасны чалавек і якая служыць дакладнай канцэптуалізацыі рэчаіснасці [1, с. 19].

Справядліва адзначае Н. Клушына, што сярод шматлікіх дыскурсаў сучаснасці менавіта ідэалагічны медыядыскурс фарміруе грамадскую думку на базе агульнага фонду ідэалагічных ведаў, прадстаўленых у СМІ праз прызму нацыянальных інтарэсаў [3, с. 276]. Вучоная вызначае ідэалагічны медыятэкст як тэкст на палітычныя тэмы, створаны журналістам, які мае ўласнае разуменне палітычнай сітуацыі, выразную

аўтарскую пазіцыю, уласную стылістыку [3, с. 279]. Даследчыца, аднак, папярэджвае, што палітычны тэкст не роўны тэксту ідэалагічнаму. Палітычны тэкст выключае суб'ектыўнасць, ідэалагічны тэкст, наадварот, мае выразны асобасны пачатак, бо ствараецца журналістам – творцам. Імператыўнасць, агітацыйнасць, падкрэсленая афіцыйнасць палітычнага дыскурсу нейтралізуецца ў сучаснай медыйнай прасторы, якая мае спецыфічныя параметры і развіваецца па ўласных законах [3, с. 281].

Сёння ідэалагічны медыядыскурс патрабуе як пільнай навуковай увагі, так і рэдактарскага разумення яго павышанай сацыяльнай значнасці. Гэта вынікавана шэрагам фактараў: павелічэннем тэхналагічных магчымасцяў СМІ ў фарміраванні грамадскай думкі; ростам адукацыйнага і культурнага ўзроўню аўдыторыі, што павышае патрабаванні да канцэптуальна-змястоўнага напаўнення тэкстаў СМІ; інтэнсіфікацыяй патокаў сацыяльнай інфармацыі, ахопам і хуткасцю медыяўплыву; эксплікацыяй ідэалагічнай канатацыі.

Актывізацыя цікавасці як практыкаў і тэарэтыкаў журналістыкі, так і аўдыторыі да тэкстаў ідэалагічнай тэматыкі выклікана шматлікімі прычынамі, абумоўленымі патрэбамі грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця краіны; навукова абгрунтаванымі патрэбамі духоўнага развіцця асобы; неабходнасцю канцэнтравання медыяўвагі на значных напрамках сацыяльна-эканамічнага развіцця (інтэнсіфікацыяй вытворчасці, паскарэннем навукова-тэхнічнага працэсу, выкарыстаннем эканамічных рэзерваў); мэтанакіраванасцю, канкрэтнасцю і аператыўнасцю ў адносінах да медыярэпрэзентацыі сацыяльна-эканамічнай праблематыкі; імкненнем журналістаў асвятляць пераважна сацыяльныя праблемы; інтарэсамі і пажаданнямі аўдыторыі.

Сёння відавочны той факт, што якасць (змястоўная, фактуальная, канцэптуальная, моўна-стылістычная і інш.) ідэалагічнага тэксту інтэрнэт-прасторы саступае якасці аналагічных (ідэалагічных) матэрыялаў перыёдыкі. Аднак даследаванні медыярынку засведчылі тэндэнцыю рэзкага змяншэння аўдыторыі прынт-выданняў.

Гэты факт, як і сам рытм сучаснасці, патрабуе ад перыядычных СМІ мець нешта асаблівае, што можа прыцягнуць увагу чытацкай аўдыторыі да выдання, а ў прыватнасці да палітычнай тэмы, складанай праблемы, якія рэдакцыя лічыць найбольш важнымі і актуальнымі. Арыгінальная форма сама па сабе прыцягвае ўвагу, паколькі садзейнічае здзяйсненню кантакту з чытацкай аўдыторыяй дзякуючы асэнсаванаму «правацыраванню» яе цікавасці рэлевантнымі журналісцкімі прыёмамі.

Гэта арыгінальнасць выяўляецца, на думку даследчыкаў, у падыходзе да тэмы; у архітэктоніцы – у кампазіцыі твора і мантажы фактычнага матэрыялу; у абпрацоўцы дэталяў публікацыі; у злучэнні форм і прыёмаў з розных жанраў, што вынікуе эфект нечаканасці і здзіўлення; у адраджэнні малавядомых, пазабытых форм з практыкі мінулага, годных для паўторнага крытычнага выкарыстання; у стылі аўтара [2, с. 45].

Такім чынам, актыўныя палітычныя і сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні і працэсы, што адбываюцца ў сучаснай Беларусі, выклікалі эскалацыю ідэалагічнага складніка ў медыядыскурсе. Аднак пакуль адчуваецца недахоп якаснага ідэалагічнага медыятэксту, насычанага аналітыкай, канструктыўнымі ідэямі, небеспадстаўнымі развагамі і палемікай. Асноўную прычыну гэтага мы бачым у тым, што сёння ў журналістыцы не так шмат прафесіяналаў, якія б не толькі памайстэрску валодалі словам, але і свабодна арыентаваліся ў палітычнай сітуацыі, аперыравалі эканамічнымі ведамі, глыбока ведалі гісторыю, права і ідэалогію, галоўнае – мелі выразную грамадзянскую пазіцыю і разумелі сацыяльную адказнасць за сваё слова.

Літаратура

1. Володина, М. В. Язык СМИ – основное средство воздействия на массовое сознание / М. В. Володина // Язык средств массовой информации : учеб. пособие для вузов / под ред. М. В. Володиной. – М. : Академический проект ; Альма Матер, 2008. – С. 6–24.
2. Георгиев, Д. Режиссура газеты / Димитр Георгиев. – М. : Мысль, 1979. – 262 с.
3. Клушина, Н. И. Власть, СМИ и общество (стратегии и тактики формирования общественного мнения) / Н И. Клушина // Язык СМИ и политика / под ред. Г. Я. Солганика. – М. : Изд-во Моск. ун-та; Фак-т журналистики, 2012. – С. 262–283.

Наталья Саянова
Белорусский государственный университет

ЭВОЛЮЦИЯ ПУБЛИЦИСТИКИ: ЖАНРОВЫЙ АСПЕКТ

На протяжении многих веков существования публицистика как сфера литературной, общественно-политической и позже собственно журналистской деятельности отражала различные актуальные проблемы социума, влияла на формирование общественного мнения, способствовала интеллектуальному и научному прогрессу. Тематические приоритеты публицистики неоднократно изменялись, расширялся диапазон проблем,

в различные исторические периоды смещались идеологические акценты. Жанровая система публицистики в свою очередь также эволюционировала от устных выступлений времен античности, средневековых теологических трактатов-исповедей, сатирических памфлетов Ренессанса, эссеистики XVI–XVIII вв. к появлению в XIX в. не только литературных, но и журналистских жанровых форм – репортажа, очерка, фельетона, наиболее активное развитие получивших в периодике на протяжении XX в.

Начало XXI в. – период активных технологических изменений и в обществе, и в журналистике, влияющих как на сознание аудитории, так и на публицистический процесс. По мнению исследователя жанровой типологии современной белорусской прессы профессора Т. Д. Орловой, «различные нормативные признаки жанров находятся в динамическом взаимодействии. К сожалению, оперативность, исследование, анализ уходят на второй план. Неизменными и усиливающимися элементами остаются информативность, коммуникативность и включение авторской оценки в предмет описания» [1].

Ускорение общего жизненного темпа, изменение информационных ожиданий аудитории, кардинальное увеличение объема новостей, обусловившие фрагментарность и мозаичность мышления и восприятия картины мира, и в то же время не исчезнувшая потребность аудитории в некоем авторитетном мнении, своеобразном «гуру», позволяющем увереннее ориентироваться в окружающей действительности, спровоцировали трансформацию жанровой системы журналистики, исчезновение традиционных публицистических жанров и замену их более мобильными, оперативными формами реакции и оценки актуальных событий повседневной действительности – авторскими колонками. В роли колумниста сегодня может выступать не только журналист как официальный представитель СМИ или компетентный эксперт, но и интернет-блогер. Трансляция личного мнения автора в лаконичной, зачастую метафорической форме в текстах достаточно краткого по сравнению с классическими жанрами объема в совокупности с многочисленными комментариями читателей сегодня и есть отражение общественного мнения, а зачастую и попытка / способ его формировать, что является основной функцией собственно публицистического произведения.

6. Словарь социолингвистических терминов. – М., 2006. – 312 с.
7. Штайнмайер, Ф.-В. Преодолевая разделение / Ф.-В. Штайнмайер // Deutschland. Помнить и чтить память: спецвыпуск. – 2014. – С. 4–5.

Сяргей Берднік
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

СТРУКТУРАВАННЕ І ФОРМА ПАДАЧЫ ГАЗЕТНАГА МАТЭРЫЯЛУ

Кожны газетны артыкул складаецца, як правіла, з трох частак: загалоўка, ліда і тэкставага корпусу. Акрамя гэтых частак яшчэ можа прысутнічаць падзагаловак. Падзагаловак і лід уваходзяць у так званы загалоўкавы комплекс. Іх задача – абазначыць тэму журналісцкага матэрыялу.

Загаловак – гэта назва артыкула, ён павінен мець строгую адпаведнасць тэксту і складаць з ім адзінае цэлае. Следаванне гэтаму правілу робіць загаловак унікальным, адпаведным і змястоўным. Фармулёўкі вартасных загалоўкаў арыгінальныя, як правіла, ясныя і празрыстыя.

Дастаткова ўважліва прааналізаваць нават адзін з нумароў перыядычнага выдання, каб вызначыць стаўленне рэдакцыі да такога важнага кампанента медыятэксту. Так, газета «Звязда» – адзін з тых нямногіх друкаваных прадуктаў на сучаснай медыяпрасторы, які, на наш погляд, уважліва і творча ставіцца да стварэння загалоўкаў і ў цэлым загалоўкавых комплексаў. Рэдакцыя размаўляе з аўдыторыяй адпаведнай для СМІ мовай, імкнецца зацікавіць чытача і выкарыстоўвае дзеля гэтага сумленныя, адкрытыя і агульнапрынятыя ў прафесіі прыёмы. Пры гэтым газета трымаецца пазнавальнага стылю падачы сваіх матэрыялаў. Рэдакцыя газеты эфектыўна выкарыстоўвае друкаваную прастору, змяшчае змястоўныя і напоўненыя загалоўкі як намінатыўнага, так і прэдыкатыўнага плана, згенераваныя ў рознай стылістыцы. Стылістычная палітра як набор інструментаў, які выкарыстоўвае газета дзеля падачы сваіх матэрыялаў, гаворыць пра разнапланавасць, гнуткасць і імкненне выдання адпавядаць чаканням аўдыторыі.

У сучасных СМІ «велізарнае значэнне набывае правільнае структураванне і форма падачы навіны, што дазволіць дамагчыся адэкватнасці інфармавання аўдыторыі» [1, с. 669]. Таму менавіта загалоўкавыя комплексы, у якія ўваходзяць шапкі, рубрыкі, загалоўкі, надзагалоўкі (як правіла, іх прыдумвае рэдактар, афармляючы паласу), падзагалоўкі і ліды дапамагаюць успрымаць тэкст рэцыпіенту.

Па агульных назіраннях многія журналісты, нават якія маюць пэўны вопыт, блытаюць падзагаловак з лідам. Між тым падзагаловак і лід – гэта розныя складовыя часткі загалоўкавага комплексу. Адрозніць іх можна так: падзагаловак звычайна падтрымлівае толькі загаловак (канкрэтызуе яго змест), лід раскрывае асноўную тэму / ідэю журналісцкага матэрыялу. І яшчэ адрозненні: падзагаловак звычайна складаецца з аднаго сказа (як правіла, да дзесяці слоў), лід можа складацца з некалькіх сказаў, або аднаго, але доўгага, з перыядамі. Для прыкладу адзначым некалькі падзагалоўкаў з газеты «Звязда»: *Развівацца за кошт экспарту* (загаловак) – *Нашы ялавічына і «малочка» едуць у Кітай* (падзагаловак); *«Каб не толькі грошы, але і штосьці для душы»* (загаловак) – *Якую працу прапаноўвалі, а якую шукалі на кірмашы вакансій у сталіцы* (падзагаловак); *Рэалізаваць усе дамоўленасці* (загаловак) – *Наша краіна гатова стварыць неабходныя ўмовы для рэалізацыі сумес-*

ных з Катарам буйных інвестыцыйных праектаў (падзагаловак); *Невядомых становіцца менш* (загаловак) – *Сёлета спецыялісты ваеннага камісарыята Міншчыны ўстанавілі звыш 200 імёнаў салдат Вялікай Айчыннай вайны, якія лічыліся зніклымі без вестак* (падзагаловак); *Кухмайстары ў пагонах* (загаловак) – *У ваенна-паветраных сілах і войсках супрацьпаветранай абароны выбралі лепшых кухараў* (падзагаловак).

Не ўсе матэрыялы, але пераважная большасць з іх суправаджаюцца ў газеце пасля загалоўка падзагалоўкам. Прааналізаваўшы структуру загалоўкавых комплексаў артыкулаў, можна зрабіць пэўныя высновы:

– загаловак не дае пэўнага ўяўлення пра змест артыкула, а толькі прыблізна прадвызначае яго тэматыку;

– загаловак лаканічны і можа ўтрымліваць канататыўны элемент;

– у якасці загалоўка можа выступаць трансфармаванае ўстойлівае словаспалучэнне;

– падзагаловак больш дакладна скіроўвае на тэму, ідэю, змест артыкула;

– у плане колькасці лексічных адзінак падзагалоўкі амаль у два разы пераўзыходзяць загалоўкі, паколькі першыя канкрэтызуюць, удакладняюць апошнія;

– у падзагалоўку адсутнічае вобразнасць, сказ выказвае адну дакладную скіраваную думку.

Наступны элемент артыкула – лід (ад *англ*. lead – уводная частка). Гэта першы абзац тэксту, як правіла, выдзелены тлустым шрыфтам. У некаторых выпадках яго яшчэ называюць уводкай. Калі задача загалоўка і падзагалоўка – прыцягнуць чытача, прымусіць яго звярнуць увагу на артыкул, то задача ліда – чытача ўтрымаць, прапанаваць яму настолькі цікавую інфармацыю, каб ён працягнуў чытанне артыкула. Існуе шмат разнавіднасцей лідаў і іх класіфікацый. А.В. Калеснічэнка адзначае: «Пры ўсёй шматстайнасці варыянтаў напісання ліды падзяляюцца перш за ўсё на прамыя (*англ*. direct) і зацяжныя (*англ*. delayed). У прамым лідзе паведамляюцца найважнейшыя аспекты падзеі. Гэты тып уводзінаў звычайна выкарыстоўваюць пры напісанні навінавых нататак. Большасць лідаў у штодзённых газетах прамыя. Іх перавага – магчымасць адразу ж выкласці сутнасць навіны. Нават калі чытач абмяжуецца прачытаннем ліда і не стане паглыбляцца ў тэкст артыкула, ён усё роўна будзе інфармаваны пра падзею. Зацяжныя ліды перадаюць атмасферу гісторыі, пра якую будзе расказана ў артыкуле. Гэтая разнавіднасць выкарыстоўваецца ў такіх жанрах, як спецыяльны рэпартаж, ньюс-фічэ і фічэ. Як правіла, зацяжныя ліды сустракаюцца

ў штотыднёвых выданнях, якія, у адрозненне ад штодзённых газет, у большай меры чытаюцца, чым праглядаюцца. Да таго ж штотыднёвікі факусуюць сваю ўвагу не на навінах, бо тут яны не ў стане канкураваць са штодзённымі газетамі і тым больш з электроннымі СМІ, а на значэнні падзеі альбо яе пабочных аспектах. У гэтых выпадках зацяжныя ліды дазваляюць чытачам падрыхтавацца да ўспрымання артыкула, успомніць і яшчэ раз перажыць ужо вядомую падзею» [2, с. 99]. Якія ж папрабаванні выпрацаваныя ў сучаснай журналістыцы да ліда? Лід заўсёды ўяўляе сабою адзін абзац. Аптымальны памер ліда – 30-40 слоў або 250–350 знакаў. Ліды аб'ёмам звыш 500 знакаў лічацца перагружанымі і патрабуюць скарачэння. Скарачаюць лід, пераносячы частку выкладзенай у ім інфармацыі ў асноўны тэкст артыкула. Акрамя таго, паменшыць лід можна за кошт выкрэслівання прыметнікаў і прыслоўяў. Першы, «сыры» яго варыянт рэкамендуецца напісаць ужо ў пачатку працы над матэрыялам. Гэта дапаможа журналісту сканцэнтраваць увагу, зразумець глыбей ідэю свайго артыкула. Потым, пасля завяршэння працы над матэрыялам, трэба выправіць лід або перапісаць яго нанава. Лід дазваляе ахапіць увесь тэкст хутка, адным позіркам. Яго галоўная мэта – не толькі прыцягнуць увагу чытача, але і патлумачыць, пераказаць яму кароткі змест артыкула. Не трэба баяцца таго, што анатацыя перакажа тэкст настолькі поўна, што яго не захочуць чытаць. Змястоўны лід толькі заахвоціць чытача да далейшага прачытання. Для гэтага кожны сказ у лідзе павінен несці максімальную сэнсавую нагрузку, надаваць дадатковую каштоўнасць артыкулу. Тэкст уводкі выкладаецца ад трэцяй асобы, вельмі рэдка – ад другой і ніколі ад першай. Як правіла, у ім адсутнічаюць пабочныя словы.

Калі артыкулы маюць падзагалоўкі і ліды, гэта дае магчымасць чытачу хутка пазнаёміцца з асноўным зместам матэрыялаў, сарыентавацца ў выбары інфармацыі ў час прачытання нумара. Падзагалоўкі і ліды журналісты выкарыстоўваюць, на жаль, не заўсёды, хоць з імі матэрыял становіцца захапляльным з самага пачатку і з самага пачатку зразумела – чытаць яго ці не. Нават можна сказаць, што разгорнутая інфармацыя, карэспандэнцыя, артыкул без падзагалоўка і ліда – гэта недарэчнасць для сучасных СМІ, бо бывае, што трэба дайсці да сярэдзіны артыкула, каб зразумець, што за тэма і пра што размова. Таму ўсё больш у нашых цэнтральных СМІ выкарыстоўваюць загаловачны комплекс у трыадзінстве: загаловак, падзагаловак, лід. І гэтая тэндэнцыя зразумелая: тут не толькі пытанне густу і якасці, але і канкурэнцыі. Чытач аддае перавагу той прэсе, дзе матэрыялы пададзены зручна і з

густам. Менавіта з гэтай мэтай і выбудоўваецца інфармацыйны матэрыял у сучасных СМІ: спачатку галоўнае – адказы на ўсе шэсць (хто? што? калі? дзе? чаму? як?) ці, як мінімум, на чатыры пытанні журналістыкі, а потым – другараднае (дэталі, тлумачэнні, каментарыі, перадгісторыя). Такі прынцып пабудовы называюць «перавернутай пірамідай». І гэта правільна: чытач, які праглядае загалоўкі, падзагалоўкі і ліды, павінен адразу зразумець, што за матэрыял перад ім і якая яго асноўная тэма. Пры гэтым, як адзначаюць некаторыя сучасныя даследчыкі, на долю загалоўка/падзагалоўка і ліда павінна прыходзіцца прыкладна 70 % агульнага сэнсу інфармацыі і толькі 30 % – на ўсю астатнюю частку публікацыі незалежна ад агульнай колькасці радкоў [2].

Літаратура

1. Жуков, А. С. О соотношении понятий «лид» и «хэдлайн» в новостных материалах традиционных и интернет-СМИ / А. С. Жуков // Молодой ученый. – 2013. – № 4. – С. 669–671.
2. Колесниченко, А. В.. Практическая журналистика: учеб. пособие / А. В. Колесниченко. – М. : Изд-во Моск. ун-та, 2010. – 192 с.

Анна Биюмена
Минский государственный лингвистический университет

МЕТАФОРА В БЕЛОРУССКОЙ РАЙОННОЙ ПРЕССЕ

Язык средств массовой коммуникации характеризует социальная оценочность [2], или идеологическая модальность [1], т. е. определенный мировоззренческий оттенок, который передается при помощи разнообразных языковых средств. Одним из наиболее востребованных в текстах СМИ лингвистических способов выражения оценки является метафора. Как отмечает Т. Г. Добросклонская, метафоры в публицистическом тексте не только делают его более экспрессивным, но и «содержат имплицитно выраженную оценку, передавая отношение автора к сообщаемому» [1, с. 138]. Мы рассмотрели метафорические модели, к которым регулярно обращаются журналисты белорусских районных газет, издающихся в различных регионах нашей страны, при создании текстов, освещающих уборочную кампанию. Результаты исследования показывают, что круг этих моделей довольно ограничен.

Наиболее частотной моделью является **спортивная метафора**, уподобляющая процесс уборки урожая спортивным соревнованиям, в которых есть лидеры и отстающие, спортсмены придерживаются определенного темпа, стартуют и приходят к финишу: ***На старце*** *вялікага*

жніва (Поставский Край. 05.08.2017); *Молодежь* ***в лидерах*** (Кричевская жизнь. 16.08.2017); *Канечне, буду старацца* ***не адставаць*** *ад сваіх старэйшых калег па ўбраных плошчах і намалочаных тонах* (Кліч Радзімы. 07.08.2017); *У такіх умовах збожжа хутка выспявае, а, значыць,* ***тэмп*** *уборкі* ***павінен паскарацца*** (Калінкавіцкія навіны. 15.08.2017); *Добра вядома, што ўборка і пасляўборачная апрацоўка зерня – гэта* ***фінішныя*** *аперацыі вырошчвання зерневых культур* (Калінкавіцкія навіны. 15.08.2017); *Сімвалічна, што высокую* ***планку*** *для Віцебскай вобласці – 100 тысяч тон зерня – хлебаробы Аршаншчыны* ***пераадольваюць*** *першымі ўжо чацвёрты год запар* (Аршанская газета. 22.08.2017).

Некоторые метафоры в материале исследования могут быть отнесены одновременно к спортивной и военной моделям: *А ўвогуле, нашы* ***перамогі*** *– гэта заслуга ўсяго калектыву; Самую аптымальную* ***тактыку*** *жніва ўмее падабраць агранамічная служба* (Лунінецкія навіны. 10.08.2017).

Военные метафоры в «чистом» виде также составляют значительную группу выявленных метафор. Одной из самых популярных среди них является штамп советской эпохи *битва за урожай*: *Сярод васьмі механізатараў, якія сёлета будуць весці* ***бітву за ўраджай****, першы год у дадзенай гаспадарцы працуе Андрэй Корабаў* (Кліч Радзімы. 07.08.2017). Также журналисты районных газет часто представляют количество зерна, которое предстоит убрать, при помощи словосочетания *фронт работ*, а опытных комбайнеров называют *ветеранами*: *Як адзначыў першы намеснiгк дырэктара гаспадаркі Мікалай Вярэніч,* ***фронт работы*** *на сёлетняе жніво ў іх аб'ёмны* (Кобрынскі веснік. 27.07.2016); *Як і брат Віктар, Алег Мікалаевіч –* ***ветэран*** *уборачнай кампаніі* (Калінкавіцкія навіны. 15.08.2017).

В текстах, посвященных уборке урожая, практически во всех районных газетах регулярно встречаются **природные метафоры** *золото* / *золотой* и *экватор*. Лексема *экватор* используется авторами материалов о работниках и хозяйствах, убравших половину урожая: *В КСУП «Агро-Солы» Сморгонского района уборочная уверенно* ***шагнула за экватор*** (Светлы шлях. 15.08.2017); *Уборочная страда в районе,* ***перевалив экватор****, приближается к завершению* (Кричевская жизнь. 16.08.2017); *Уборка збожжа ў гаспадарках Калінкавіцкага раёна* ***набліжаецца да экватара*** (Калінкавіцкія навіны. 15.08.2017). Что касается метафоры *золото* / *золотой*, ее популярность в газетных текстах об уборочной кампании можно объяснить тем, что в данном контексте одновременно реализуются два основания метафорического переноса: по цвету («золотые» колосья) и по ценности (хлеб – одно из ключевых понятий белорус-

ской логосферы [3]): *«**Залаты** дождж» першага ўраджаю* (Кобрынскі веснік. 23.07.2016); ***Золотое** зерно сплошным потоком льется в кузов* (Кричевская жизнь. 16.08.2017). В некоторых случаях реализуется только второе основание переноса, связанное с ценностью урожая, как, например, в заголовке статьи «***Чорнае золата»** «Лунінскага»* (Лунінецкія навіны. 19.07.2017), посвященной уборке рапса.

Многие районные медиа описывают уборку зерна с помощью механистических метафор, использование которых позволяет представить жатву как механизм, который имеет свой «ход» и может набирать обороты: *Жніво паволі **набірае абароты**. І няхай у працэс іншым разам уносіць свае карэктывы надвор'е, **спыніць** яго **рух** яно не ў сілах* (Кобрынскі веснік. 27.07.2016); *Вопытны механізатар ужо заняў перадавую пазіцыю ў нарыхтоўцы кармоў і, як заўважыў, **змяншаць абароты** не збіраецца* (Кобрынскі веснік. 27.07.2016).

Еще одной частотной метафорической моделью в материалах рубрики «Жатва» является **пространственная метафора**, связанная с расположением объектов в пространстве. В текстах анализируемой тематики в подавляющем большинстве случаев используются два типа пространственных метафор: «верх – это хорошо» и «передняя часть – это хорошо». Очевидно, что обе модели употребляются для выражения позитивной оценки. Первый тип пространственной метафоры обычно представлен лексемой *высокий,* которая обычно соединяется с существительными *результаты, намолоты, показатели,* однако встречается и в сочетаниях с другими субстантивными лексемами: *Они уже отмечались за **высокие результаты** работы на уровне района и области* (Кричевская жизнь. 16.08.2017); *Посетив Сморгонскую ЦРБ, представители профсоюза дали **высокую оценку** увиденному* (Светлы шлях. 18.08.2017); *Жанчыны, апранутыя ў беларускія нацыянальныя касцюмы, спявалі жніўныя песні, віталі словамі ўдзячнасці кіраўніцтва гаспадаркі, камбайнераў, вадзіцеляў і механізатараў, якія задзейнічаны на жніве, жадалі ім плённай працы і **высокіх намалотаў*** (Кліч Радзімы. 09.08.2017); *Але гэта зусім не значыць, што яны не імкнуцца да больш **высокіх паказчыкаў*** (Калінкавіцкія навіны. 03.08.2017).

Пространственная метафора «передняя часть – это хорошо» выражается, в первую очередь, ключевыми словами публицистики советского времени *передовик, передовой: Добрыя прагнозы на статус **«перадавіка»** і ў камбайнера Аляксандра Заноўскага* (Кобрынскі веснік. 27.07.2016); ***Передовики** уборочной были награждены памятными подарками* (Светлы шлях. 15.08.2017); *Назіраючы за напружанай працай*

хлебаробаў, чакаем зручнага моманту, калі можна будзе сфатаграфаваць проста ***перадавы*** *экіпаж* (Калінкавіцкія навіны. 03.08.2017).

Таким образом, использование журналистами районной прессы метафор в статьях об уборке урожая позволяет им не только более образно и выразительно описать ход жатвы, но и донести до читателя свою оценку представленных событий и ситуаций. Как видно из приведенных примеров, среди частотных в районных газетах метафор практически не представлены живые, авторские. Подавляющее большинство проанализированного материала – это стертые, популярные еще в советское время метафоры, превратившиеся в штампы и не свидетельствующие о высоком мастерстве журналистов, но близкие и хорошо знакомые аудитории «районок». На наш взгляд, основными функциями подобных метафор выступают воздействующая (передавая оценку событий, метафора влияет на восприятие ситуации адресатом) и фатическая, т. е. функция установления контакта с аудиторией (читатель испытывает положительные эмоции, увидев в газете статьи на знакомые темы с предсказуемым языковым оформлением), в то время как функция сообщения (передачи ими информации) сводится к минимуму.

Литература

1. Добросклонская, Т. Г. Вопросы изучения медиатекстов : Опыт исследования современной английской медиаречи / Т. Г. Добросклонская – Изд. 4-е. – М. : КРАСАНД, 2013. – 288 с.
2. Іўчанкаў, В. І. Дыскурс беларускіх СМІ. Арганізацыя публіцыстычнага тэксту : аўтарэф. дыс. … д-ра філал. навук :10.01.10, 10.02.01 / В. І. Іўчанкаў ; Бел. дзярж. ун-т. – Мінск, 2003. – 41 с.
3. Самусевич, В. М. Беларускія СМІ ў лагасферы нацыянальнай культуры : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.01.10 / В. М. Самусевіч ; Бел. дзярж. ун-т. – Мінск, 2003. – 21 с.

Анастасия Бочарова, Александра Петкау
Уральский федеральный университет им. первого Президента России Б. Н. Ельцина (Россия)

ДИСКУРСИВНЫЕ ПРАКТИКИ КОНСТРУИРОВАНИЯ ЦЕННОСТЕЙ В УНИВЕРСИТЕТСКОМ СМИ (на примере газеты «Уральский федеральный») *

В когнитивной парадигме современных исследований является значимым анализ дискурсивных практик, которые представляют собой производство и потребление текста в совокупности [2, с. 120–122]. Для

них важна детерминированность «социальными условиями, в том числе и структурами бессознательного» [4, с. 77]. Лингвистический анализ взаимосвязи данных процессов эксплицирует языковые «картинки жизни» [5, с. 428], компонентами которых являются существующие в обществе убеждения и установки.

СМИ являются тем объектом исследования, который, с одной стороны, отражает взгляды и настроения общества, а с другой стороны, участвует в моделировании языковой картины мира человека: одна из главных задач СМИ – «управлять сознанием и поведением людей» [1, с. 33].

Рассмотрим некоторые практики конструирования ценностей в корпоративной газете «Уральский федеральный» (далее – «УФ»), которая была зарегистрирована как СМИ в 2012 году, периодичность выхода – 1 раз в неделю. Издание выпускается в печатном и электронном формате (отдельный файл, публикуемый в социальных сетях). Основная масса материалов – информационные жанры, которые представлены в таких рубриках, как «УрФУ за неделю», «Уникум», «Управляя качеством», «Планета УрФУ», «Учись учиться», «На волне», «Улицы УрФУ». Материалом для исследования послужили 37 печатных выпусков газеты за 2016–2017 год. Общий объем проанализированного материала составил 700 текстов разных жанров.

Современное языковое существование характеризуется вымыванием слов высокого стиля, которое отчасти можно объяснить как реакцию отторжения пафосного языка советской эпохи. Язык корпоративных СМИ, наоборот, отражает другую тенденцию: текстовый каркас преимущественно сплетен из «хороших» новостей с мелиоративной лексикой.

Основной ценностный посыл нацелен на создание образа команды: важно, чтобы студенты и преподаватели ассоциировали себя с успешной деятельностью вуза: *Сборная УрФУ* ***успешно выступила*** *в лыжных гонках* («УФ», № 8); *УрФУ* ***сохраняет лучшие традиции*** *высшей школы и обеспечивает университетское студенческое и научное сообщество российскими и зарубежными базами данных в течение многих лет* («УФ», № 10), *Электронный научный архив Уральского федерального университета* ***признан лучшим*** *в России* («УФ», № 6). Задача журналиста – не просто рассказать о событиях, которые связаны с номинацией университета, но и закрепить в модели мира адресата представления о статусе учебного учреждения и вызвать эмоции одобрения, гордости за причастность к нему: ***Яркий университет – для ярких студентов*** («УФ», № 31), *Когда* ***университет твоё вдохновение*** («УФ», № 33), *«Уральский федеральный* ***открывает перед студентами новые горизонты****. Остается только воспользоваться возможностями»* («УФ», № 37).

Ценность занятия наукой передается с помощью абстрактных сентенций, соединенных на синтагматической оси на субъективном основании, требующем дальнейшей интерпретации, которая дается читателю в готовом виде: ***Наука*** – ***это не страшно, а очень увлекательно*** («УФ», № 4), ***Наука*** *и технологии в проекте «Сириуса» – это* ***наша ниша****, и мы крайне заинтересованы в том, чтобы* ***вовремя выявлять*** *этих* ***талантливых детей****…* («УФ», № 18), *Ведь* ***наука интересна*** *тогда,* ***когда есть возможность*** *не только в «учебнике прочить», но и* ***самому «попробовать»*** («УФ», № 45).

В текстах моделируется образ адресата с помощью регулятивных установок поведения, в частности, постулируется ценность инициативы: ***Лучшие студенты*** *года* ***«прокачивают»*** *на мастер-классах свой имидж и* ***навыки коммуникации, знание иностранных языков, спортивные и творческие возможности*** («УФ», № 42), *Сама* ***идея Аллеи славы и закладки звезд*** *первокурсников, выпускников и партнеров* ***принадлежит учащимся*** *УрФУ* («УФ», № 38).

Подведем итоги нашим наблюдениям. Апелляция к ценностям – одно из основополагающих действий в стиле корпоративного университетского СМИ. В целом, формирование положительного образа Уральского федерального университета само по себе становится ценностью, предполагающей «позитивное мировосприятие участников общения» [3, с. 28] и формирование микрососообщества, в котором есть определенные правила и идеалы. Мелиоративная лексика выступает в качестве индикатора коммуникативных намерений.

* Работа выполнена при финансовой поддержке РФФИ, грант № 15-04-00239/17-ОГОН «Национальные базовые ценности и их отражение в коммуникативном пространстве провинциального города: традиции и динамика»

Литература

1. Дзялошинский, И. М. Культура, журналистика, толерантность (о роли СМИ в формировании в российском обществе атмосферы толерантности и мультикультурализма) / И. М. Дзялошинский // Роль СМИ в достижении социальной толерантности и общественного согласия: материалы междунар. конф. / под ред. Л. М. Макушина. – Екатеринбург, 2002. – С. 15–38.
2. Йоргенсен, М. В. Дискурс-анализ. Теория и метод / М. В. Йоргенсен, Л. Д. Филипс ; пер. с англ. А. А. Киселевой. – 2-е изд., испр. – Харьков : Гуманитарный центр, 2008. – 352 с.
3. Марьянчик, В. А. Аксиологичность и оценочность медиа-политического текста / В. А. Марьянчик. – М. : URSS, 2013. – 272 с.

4. Чепкина, Э. В. Журналистский дискурс : анализ практик / Э. В. Чепкина, Л. В. Енина // Известия Уральского гос. ун-та. Сер. 1. Проблемы образования, науки и культуры. – 2011. – № 2 (89). – С. 76–85.
5. Шведова, Н. Ю. Русский язык : избранные работы. – М. : Языки славянской культуры, 2005.– 639 с.

Ольга Десюкевич
Белорусский государственный университет

ДИАЛОГИЧЕСКАЯ МЕТАФОРА В МЕДИАТЕКСТЕ

Метафоры, отличающиеся в медиатекстах высокой частотностью, рассматриваются нами как особая дискурсивная практика, поскольку являются частью взаимосвязанных языковых стратегий порождения и восприятия текстов публицистического стиля. В когнитивной науке метафора понимается как универсальный познавательный механизм, который состоит во взаимодействии двух концептов, представляющем собой осмысление одного из них (сферы-мишени) в терминах другого (сферы-источника), в результате которого первый структурируется по аналогии со вторым, при этом часть метафорически осмысленного понятия оказывается профилированной, коммуникативно «высвеченной», по определению Дж. Лакоффа, а другие сферы его содержания оказываются скрытыми, что позволяет использовать метафору как средство формирования мнения и отчасти объясняет высокую частотность этого явления в публицистическом стиле. Дескрипторная теория метафоры А. Н. Баранова, являющаяся развитием и расширением когнитивной теории, позволяет определить, насколько устойчивыми в определенном типе дискурса являются множественные отображения в денотате метафоры (сфере-мишени) ее сигнификата (сферы-источника), сформулировать на основании выявленных закономерностей предположения относительно осмысления определенных концептов в общественном сознании.

Диалогическая метафора как таковая не становилась предметом анализа, хотя была выделена А. Н. Барановым при изучении сочетаемости метафор. Подчеркивая необходимость в анализе диалогических метафор учитывать связь теории метафоры с агрументативными стратегиями, ученый замечает, что «прагматический контекст спора, дискуссии существенно меняет обычные правила взаимодействия метафорических проекций» [1, с. 70]. Мы рассмотрим, как в диалогическом взаимодействии сохраняется/видоизменяется исходная метафора, какая из сфер метафорической проекции и в каком направлении чаще подвергается переосмыслению и какие признаки при этом профилируются.

Для анализа нами выбран текст Светланы Калинкиной «Только спокойствие!» (Народная воля. 22.04.2016), построенный на продуктивной метафоре *государство – машина*, и субтексты комментариев читателей. Последние вступают в своеобразный диалог с текстом-стимулом, совмещая по отношению к нему функции ответной реплики и метатекста, а также взаимного общения комментаторов. В тексте статьи совмещается несколько метафорических моделей: болезни (*страну не лихорадит; Украина соскочила с российской газовой трубы*), войны (*можно вспомнить отвлекающий маневр – проведение деноминации*), сочетаемой с метафорой движения (*Чего мы ждем от своих министров? Чего от них хотим, если их главная задача – не высовываться?*); собственно метафора движения с маркером *с места на место* профилирует идею ложного движения, его имитации (*Что сделали мы? Передвигали с места на место старые советские идеи, кадры, станки и боялись перемен*). Перечисленные метафоры являются фоновыми для фигурной развернутой метафоры, в которой сигнификативные концепты *машины*, *двигателя* и *топлива* проецируются на денотативные концепты *государство*, *деятельность чиновника* и его *амбиции*: *Амбиции – это важная штука, способная вывести человека из зоны комфорта в режим работы на результат. В топку этого двигателя можно бросать деньги, можно здоровые амбиции. Астрономических зарплат наше государство предложить не может, амбиции не поощряет и даже запрещает, за счет чего тогда двигаться вперед? Получается, что у белорусской государственной машины двигатель вообще не работает: нет топлива. Куда же мы на такой машине доедем*? Автором на базе общей идеи развития как поступательного движения вперед «высвечивается» прагматическая составляющая концепта – сомнительность успехов белорусского государства прежде всего в области управления экономикой, неясность его будущего.

Отметим, что 24 % субтекстов (17 из 70) содержали в себе заданную автором метафору либо в первоначальном (в этом случае комментаторы были вполне согласны с автором статьи), либо в трансформированном виде, интерпретация комментаторов при этом находилась в сложных взаимоотношениях с интенцией автора статьи (от детализации при общем согласии до выхода за пределы заявленной темы в случае овеществления метафоры). Метафорические субтексты в части случаев поддерживали фоновую метафору движения, детализируя ее за счет некоторых дополнительных слотов фрейма (*уверенно двигаться вперед по этой болотистой тропинке, которая должна была вывести на хорошую дорогу*), но чаще переосмысливали сигнификативные концепты, вводя вместо заданной *машины – вагон*, *телегу*, *корабль*, *каток,* причем

как поддерживая авторскую концептуализацию имитации движения (*Надо зашторить окна и раскачивать вагон. Будем делать вид, что едем вперед*), так и вступая с нею в спор, прагматически подчеркивая отсутствие движения (*Никакой госмашины уже давно нет. Есть финал как у «Антилопы-Гну» из «Золотого теленка», где все пассажиры барахтаются среди запчастей, а шофер-дурак все еще держится за руль и пытается рулить. Приехали!; Светлана ошибается: не просто нет бензина и даже не двигатель отсутствует, в РБ отсутствует сама государственная машина, вместо нее телега, у которой сдохла лошадь*) и, следовательно, отсутствие будущего (*Так уже и двигателя давно нету и под шумок кто-то колеса упер… так и стоит этот остов бывшего автомобиля на периферии мира и вот-вот свалится с обрыва в бездну под названием gameover*); в одном случае возникла сигнификативная проекция на животное (*Топлива может и нет, зато много зубов и кусается эта машина все сильнее*), с помощью которой профилируется идея агрессивности денотата.

Меньшим разнообразием отмечены переосмысления денотата метафоры, которые осложняются разнонаправленными проекциями (*Топливо – это мозги, если их нету, то никуда этот корабль не доплывет; Мозги – это двигатель! А топливо – это зарплата! Нет ни того ни другого. Да и… кузов весь дырявый от ржавчины; Двигатель – это не мозги, а начинка мозгов – совокупность культурных, общих и профессиональных знаний, позволяющих быстро находить правильные решения*…). Отметим также случаи овеществления метафоры, приводящие к ее полному разрушению, – речь идет о субтекстах, авторы которых пишут о машинах чиновников, государственных служб, в этих случаях комментаторы выходят за рамки заданной текстом-стимулом темы, нарушая продуктивное диалогическое взаимодействие.

Метафорическая проекция сферы-источника (машины, двигателя, топлива) на сферу-мишень (государство, деятельность чиновника, амбиции) в субтекстах осложнилась за счет детализации и расширения сферы-источника, что свидетельствует и превалирующем сигнификативном разнообразии в диалогической метафоре, которое позволило существенно видоизменить авторскую концептуализацию денотата, переосмыслив профилированный в терминах движения признак неясного будущего за счет проекций на ограничительные концепты.

Литература

1. Баранов, А. Н. Дескрипторная теория метафоры / А. Н. Баранов. – М. : Языки славянской культуры, 2014. – 632 с.

Аляксандр Дуброўскі
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

РЭДАКТАРСКІ АНАЛІЗ ВУЧЭБНАЙ ЛІТАРАТУРЫ: ДАКЛАДНАСЦЬ МАЎЛЕННЯ

Пры выкладзе методыкі рэдагавання вучэбнай літаратуры ёсць сэнс больш актыўна, чым гэта адбываецца ў наш час, карыстацца паняццямі культуры маўлення, у прыватнасці паняццем камунікатыўных якасцей маўлення. У падручніку «Редакторская подготовка изданий» аўтары пры разглядзе патрабаванняў да мовы і стылю вучэбнага твора выкарыстоўваюць, на жаль, недастаткова канкрэтныя фармулёўкі: «… мова вучэбнага выдання павінна быць бездакорнай з пункту гледжання правільнага словаўжывання» [2, с. 179]. Паспрачацца з гэтым нельга, але размова атрымалася б значна больш змястоўнай, калі б выкарыстоўвалася, напрыклад, паняцце *дакладнасць маўлення*. Звернемся да яго.

«Дакладнасць – гэта такая камунікатыўная якасць маўлення, якая прадугледжвае адпаведнасць яго сэнсавага боку… рэчаіснасці і праяўляецца ва ўменні знаходзіць адэкватнае слоўнае выражэнне паняцця» [1, с. 130]. Прынцыповым з'яўляецца адрозненне прадметнай і паняццевай дакладнасці. Калі б рэдактар звяртаў увагу толькі на «правільнасць словаўжывання», то выпадкі парушэння прадметнай дакладнасці маглі б застацца прапушчанымі (бо парушэння моўных норм у такім разе можа і не адбывацца). Пры гэтым змест тэксту аднолькава пакутуе ад парушэнняў як паняццевай, так і прадметнай дакладнасці. Прадэманструем гэта на прыкладах.

У адным цікавым, змястоўным і карысным вучэбным дапаможніку знаходзім наступнае сцверджанне: *В круг тех текстов, которые читают и поют в* ***христианском*** *богослужении, входят почти все тексты Нового Завета (исключая «Откровение Иоанна Богослова» – Апокалипсис)…* Адразу можна сфармуляваць пытанне пра выкарыстанне двукосся ў гэтым сказе, але гаворка зараз не пра гэта. Гаворка пра тое, што названая кніга не выкарыстоўваецца толькі ў *праваслаўным* набажэнстве (*хрысціянскі* і *праваслаўны* – не сінонімы). Прычым на іншай старонцы гэтага дапаможніка аналагічная думка сфармулявана правільна, а гэта азначае, што аўтар валодаў праўдзівай інфармацыяй, але ў прыведзеным сказе аказалася парушанай менавіта дакладнасць маўлення.

Надзвычай паказальныя прыклады падобных парушэнняў мы знайшлі ў адным вучэбным дапаможніку па стылістыцы і культуры беларускага маўлення, прычым у раздзеле менавіта пра дакладнасць

маўлення – вось так бывае! Прачытаем наступны сказ: *Руская лексема* ***язык*** *мае больш шырокае значэнне, чым беларуская: яна адпавядае беларускім* ***язык*** *і* ***мова***. З фразай пра рускую лексему згадзіцца ніяк нельга, бо гаворка тут можа ісці толькі пра **дзве** рускія лексемы: амонімы – асобныя лексемы, а не алалексы. Сказ павінен быць поўнасцю перабудаваны: у дапаможніку па лінгвістычнай дысцыпліне такая недакладнасць можа толькі здзіўляць. На наступнай старонцы ў тым жа раздзеле чытаем: *...стылістычна нейтральныя словы свабодна спалучаюцца толькі з нейтральнымі*. Неадпаведнасць гэтай фразы рэчаіснасці відавочная: стылістычна нейтральныя словы свабодна спалучаюцца са словамі любой стылістычнай афарбоўкі.

Рэдактарскія недагляды сустракаюцца і ў падручніках па… рэдагаванні. Наступныя прыклады з аднаго такога падручніка.

Утратился интерес к одам, надписям, эпистолам и другим жанрам поэзии классицизма и усиливается интерес к лирике – интимной, сентиментальной, романтической. Адразу дзве праблемы ў адным сказе. Па-першае, аўтар (падручніка па філалагічнай дысцыпліне) неяк спецыфічна разумее тэрмін *лірыка*, бо названыя «жанры паэзіі класіцызму» – менавіта лірыка. Па-другое, *інтымная*, *сентыментальная* і *рамантычная* – паняцці сэнсава неаднародныя (*інтымная* – тэматычная характарыстыка, *сентыментальная* і *рамантычная* – характарыстыка паводле мастацкага метаду). Аналагічны недахоп у наступным прыкладзе: *В 70-е гг. наблюдается рост числа изданий материалистического, атеистического и политического содержания*. Неаднароднасць паняццяў відавочная.

На той жа старонцы: *Существовавшие тогда журналы имели умеренно либеральный характер либо проправительственное, иногда реакционное направление. Однако постепенно издательское дело снова наращивает темпы выпуска литературы.* Слова *однако*, ужытае без усялякай патрэбы, надае тэксту камізм – настолькі парушанымі аказваюцца лагічныя сувязі.

Недарэчнасць і недакладнасць словаўжывання, грувасткасць выражэння думкі адзначаем у наступным прыкладзе: *С точки зрения редактирования, интерес представляет факт разработки методики изложения информации* ***за счет*** *характеристики* ***композиции подачи*** *материала*. Тут звяртаюць на сябе ўвагу не толькі вылучаныя словы, але і нанізванне словаформ у родным склоне і яўна лішняя коска.

У адным вучэбным выданні для студэнтаў-журналістаў мы знайшлі шэраг прыкладаў парушэння дакладнасці маўлення, прычым

у спалучэнні з парушэннем і іншых яго камунікатыўных якасцей. Амаль немагчыма зразумець сэнс наступнай фразы: *Очерк интегрируется и с искусством, т. е. с той ее частью, которая связана с поэтикой*. Займеннік *ее* не суадносіцца ні з якім назоўнікам у сказе, але і пры замене на *его* сітуацыя не палепшыцца, бо што азначае «сувязь мастацтва з паэтыкай» – застаецца тайнай.

Аўтар згаданага выдання ў адным з яго раздзелаў класіфікуе нарысы. Пры гэтым ён падзяляе іх на: *художественно-изобразительные*, *художественно-публицистические*, *исследовательские*. Павінна збянтэжыць пералічэнне тут «мастацка-публіцыстычных нарысаў» побач з нейкімі іншымі, бо нарыс як такі – жанр менавіта мастацка-публіцыстычны. Але гэта толькі пачатак праблемы. Далей аўтар да «мастацка-выяўленчых» нарысаў адносіць падарожныя нарысы, эсэ і замалёўкі, хаця эсэ і замалёўкі – такія ж самастойныя жанры, як нарыс, таму не могуць быць яго разнавіднасцямі (можна было б напісаць *нарыс-эсэ* ці *эсэ-нарыс*, *нарыс-замалёўка*). Але апафеоз (а па сутнасці – сэнсавы тупік) чакае чытача ў трэцяй з прыведзеных груп, і гэта варта працытаваць: «*Исследовательские* очерки. <…> К этой разновидности относятся *“проблемные”*, *“исследовательские”* (!) и *“публицистические”* (!) *очерки*». Прычым тут нават курсіў аўтарскі.

Як адзначаецца ў методыцы рэдагавання вучэбнай літаратуры, «асаблівае значэнне мае праца рэдактара над тэрмінамі і паняццямі» [2, с. 179]. А ў прыведзеным прыкладзе ўвесь тэрміналагічна-паняццевы рад дэманструе поўную адсутнасць логікі ў гіпера-гіпанімічных адносінах.

У той же кнізе мы знаходзім «*характерологические характеристики* героев», «*определенный* прием отображения действительности, позволяющий отойти от *определенной* заданности маршрута», «*занимаемую* журналистом *роль*» и г. д.

Варта адзначыць, што ў дадзеным выданні чытач не знойдзе прозвішча рэдактара – ці не з той прычыны, што яго не было? І гэта лішні раз дэманструе значэнне рэдактарскай працы, тым больш у падрыхтоўцы вучэбных выданняў, у якіх дакладнасць і лагічнасць маўлення, зразумеласць тэксту – патрабаванні, якія немагчыма ні адмяніць, ні нейкім чынам спрасціць.

Літаратура

1. Плещенко, Т. П. Основы стилистики и культуры речи : учеб. пособие для студентов вузов / Т. П. Плещенко, Н. В. Федотова, Р. Г. Чечет; под ред. П. П. Шубы. – Минск : ТетраСистемс, 1999. – 240 с.
2. Редакторская подготовка изданий : учебник / под ред. С. Г. Антоновой. – М. : Логос, 2004. – 496 с.

Пятро Жаўняровіч
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

РЭДАКТАРСКІ АНАЛІЗ БАЛАДЫ З ГАЗЕТЫ «ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Прапануючы свой твор для друкавання, кожны аўтар павінен разумець, што ён выносіць сваё «дзіця» і на суд канкрэтнага чытача, і на шырокае кола агляду, аб'ём якога вар'іруецца ў залежнасці ад накладу выдання (для газеты «Літаратура і мастацтва» гэта больш за паўтары тысячы). Твор становіцца літаратурным фактам, пачынае жыць сваім жыццём у прасторы пэўнага прамежку часу, знаходзіць сабе новых прыхільнікаў або, наадварот, апанентаў. Творца павінен добра разумець гэта. А калі ён *сапраўдны* паэт, то павінен ведаць і словы М. Багдановіча, што «Трэба з сталі каваць, гартаваць гібкі верш, // Абрабіць яго трэба з цярпеннем. // Як ударыш ты ім, – ён, як звон, зазвініць, // Брызнуць іскры з халодных каменняў» [1, с.126]. Абавязкова звяртаецца ўвага на чытацкі адрас: «Літаратура і мастацтва» – «газета творчай інтэлігенцыі Беларусі», значыць, яе чытачы добра знаёмыя з літаратурай, у прыватнасці з паэзіяй (і баладай як яе жанрам).

Найперш адзначым, што рэдактарскі аналіз паэтычнага твора зводзіцца ў асноўным да яго крытыкі, г. зн. да выяўлення разнастайных хібаў (калі яны ёсць), і да прапаноў аўтару па ўдасканаленні верша. На дадзеным этапе праца рэдактара антыцыпіруе рэакцыю чытача, які не бачыць гэтай рэдактарска-аўтарскай кухні, а толькі надрукаваны ў канчатковым варыянце верш. У гэтым праца рэдактара адрозніваецца ад працы крытыка, які аналізуе творы, з якімі чытач ужо знаёмы па публікацыях. На думку А. Дуброўскага, мінімальныя патрабаванні да добрага верша – «тэхнічная бездакорнасць (у першую чаргу – адпаведнасць структуры тэксту законам абранай сістэмы вершаскладання), адсутнасць маўленчай неахайнасці, празрыстасць формы» [2, с. 195]. Далей даследчык адзначае, што «крытэрыі шэдэўральнасці больш складаныя і вынікаюць з сэнсавыразных магчымасцей лірычнай паэзіі» [Тамсама].

Сярод паэтычных твораў, якія сёння друкуюцца ў літаратурна-мастацкіх выданнях, балада з'яўляецца рэдкай госцяй. Найперш гэта тлумачыцца тым, што балада як «драматычна напружаны, сюжэтны ліра-эпічны верш» [8, с. 417] патрабуе ад аўтара асаблівага творчага падыходу, выкліканага неабходнасцю стварэння сюжэта і выбару для вобразаў адпаведных мастацкіх сродкаў. Таму называнне прапанаванага паэтычнага твора баладай – адказны крок кожнага аўтара.

Засяродзімся на рэдактарскім аналізе «Балады пра каханне», апублікаванай у № 7 газеты «Літаратура і мастацтва» за 2017 г. (гл. малюнак). Ужо сама назва твора дае кірунак думцы чытача, прымушае яго адпаведна падысці да прачытання, выявіць тое новае, што здолеў сказаць аўтар пасля тысячагадовага існавання тэмы кахання ў сусветнай паэзіі.

Балада пра каханне

1
Трапляюща між кніг з былога рэчы.
Вось хустачка твая – ...нібыта ў варажбе...
Успомніў парк з рачулкай хуткацечнай,
І любую, каханую – цябе.

Цудоўная, зямная і святая,
З крыніц душы ўзыходзіць вобраз твой.
Здаецца, зноў на крылах узлятаю,
Лунаю ў вышыні над хугам, над травой.

2
...Хаваўся гай у велічным тумане,
Схіляла сонца галаву ніжэй.
Цябе чакаў на першае спатканне –
Дзяўчыны я не бачыў прыгажэй

...З'явіўшыся, як казачная фея,
Прынесла ты узнёсласць і спакой.
Праз сад ішлі, раптоўна чырванелі,
Ледзь-ледзь рукі краналіўшыся рукой.

І голас мой тактоўна і ласкава.
Тваё шаптаў прыгожае імя.
Я ўпершыню сказаў табе: «Кахаю»,
Адказ пачуў: «Цябе кахаю я».

3
Імглістая, нас лашчыла сцяжынка,
Дуб заручальны цёпла шапацеў.
А чэрвеньская ноч ў сваіх абдымках
Вітала дружны салаўіны спеў.

...Ды раптам месяц адышоў за хмары.
І вецер-волат наляцеў на тын.
Ад навальніцы, ад яе ўдараў,
Прытулак даў нам цёплы панскі млын.

4
Стагоддзі, што прайшлі і адступілі
Напомнілі прыладамі ўздоўж сцен...
Пяшчотна цемру свечка сутыніла,
Святлом упаўшы ля тваіх кален.

Агеньчык чысты – матылёк-гарэза
Спрачаўся з полымем, што ў печы загулю.
Натомленая, свечка дагарэла,
Другая ўвесь пакой напоўніла святлом.

5
Каханне наша абуджала веру,
Натхненне абуджалася ў цішы,
Радкі прасіліся і леглі на паперу,
Чысцюткія, як свет тваёй душы.

Дажджыкі нібы марылі загрэцца,
Цяклі па шкле, як слёзы па шчаках.
Сказала: «Ты пасухай маё сэрца,
Як птушачка яно ў тваіх руках».

Хвіліны беглі, мы задзьмулі свечы,
Чаканне падступіў салодкі сон.
Імкнуліся ў вусны да сустрэчы.
Ды ўварваўся незвычайны гром!

6
...Дзвюх чыстых душ жаданае памкненне
Знаходзіць і стварае вечны шлях.
Усяго жыцця змнагога прадаўжэнне
У бясконцых, нібы бег планет, вяках.

7
Маланкі маляваліштось на сценах.
Ты цалавала мякка вусны мне.
Адны ў Сусвеце! Вось яно імгненне!
Непараўнальна дарагі санэт!

І дождж іграў сімфонію прызнанняў
І хваляваў бяссонную раку.
Ты адчувала ўсе мае жаданні –
Як скрыпка адгукалася смычку.

Не заціхала сваха-навальніца,
З высокіх стрэх ліла вада ракой.
Ні пачакаць стыхіі, ні спыніцца.
Яна між намі, небам і зямлёй!

8
Ды толькі сціхла ў коміне разгульным.
Ты да пляча схілілася бліжэй.
Свячы агеньчык – добры і утульны
На тваім твары соладка дрыжэў...

9
Суровы лёс прымусіў да расстання,
Нічога нас пра гэта не спытаў.
І у мяне адно цяпер жаданне,
Каб лёд разлукі некалі растаў.

Між голых дрэў лютуе завіруха,
Кладзецца белым снегам сівізна.
У садзе маім пуста, дзіка, глуха,
А ў бедным сэрцы толькі ты адна.

Нас раздзяляюць межы і прасторы,
Але жыву з адзінай марай я:
З табой прайсці праз радасць і праз гора,
Мая Радзіма і каханая мая.

Кампазіцыйна аўтар падзяляе баладу на дзевяць частак, якія маюць розную колькасць строф: 2 – 3 – 2 – 2 – 3 – 1 – 3 – 1 – 3. У сувязі з сюжэтнасцю твора рэдактар можа ўмоўна даць назвы гэтым часткам («Успамін», «Спатканне», «Навальніца», «Млын», «Заляцанні», «Дзве душы», «Каханне», «Шчасце», «Расстанне»), падумаць над прычынамі таго, чаму ў аўтара, напрыклад, у 6-й і 8-й частках толькі па адной страфе (відаць, яны вельмі важныя для раскрыцця аўтарскай задумы). Часткі становяцца своеасаблівымі вузламі аповеду, рухаюць рэдактарскую (потым – чытацкую) думку за аўтарскай і даюць магчымасць зразумець задуму: першае юнацкае каханне не знікае з памяці ды застаецца з чалавекам на ўсё жыццё. «Вузлы аповеду можна лічыць вылучанымі правамерна, калі кожны з іх абавязкова выклікае з'яўленне за сабой наступнага і ў тэксце не ўзнікае незапоўненых сэнсавых лакун, г. зн. часавыя сувязі паміж вузламі аповеду павінны суправаджацца прычынна-выніковымі, і гэтыя сувязі рэдактар павінен дакладна адсочваць» [9, с. 550]. Праверым захаванне гэтага патрабавання ў баладзе і зробім адпаведныя каментарыі.

З першых радкоў дасведчаны рэдактар «зловіць» знаёмы рытм. Ну так, гэткім рытмам (пераважна шаспістопным ямбам) напісана паэма

Янкі Купалы «Яна і я»: *На крыжавых пуцінах з ёй сустрэўся – // Куды ісці, не ведала яна, // І я не ведаў – ў полі я ці ў лесе, // І мне ляжала сцежка не адна* [6, с. 370]. Абранне рытму класічнага твора вымагае дадатковых творчых высілкаў, бо, як выказаўся У. Караткевіч, «рытмам, узятым напракат у іншых паэтаў, рэдка можна выказаць сваё, тое, што ідзе з глыбіні душы, таму ўсякі паэт павінен быць наватарам» [5, с. 232]. Якое ж «наватарства» выявіў аўтар у гэтым творы?

Першая страфа – завязка сюжэта: лірычны герой знаходзіць між кніг хустачку (аднак параўнанне *...нібыта ў варажбе...* незразумелае, энтрапічнае: якім чынам можна атаясняць хустачку з варажбой і калі яна падчас варажбы выкарыстоўваецца або з'яўляецца?). У памяці рэдактар фіксуе таксама месца дзеяння (*парк*), якое найперш усплывае ў памяці лірычнага героя. Другая страфа першай часткі апісвае і каханую, і перажыванні лірычнага героя. Увага засяроджваецца на апошнім радку, у якім парушана логіка выказвання пры спалучэнні аднародных членаў: *лунаць* можна *над лугам, над лесам* або над *кустамі, над травой*. Здольнасць задаваць пытанні дапамагае рэдактару, паводле А. Мільчына, «папярэдзіць пытанні чытача і абавяжа прасіць аўтара адказаць на іх, калі ён чамусьці не здолеў гэта зрабіць» [7, с. 86] у творы.

Другая частка «Балады...» – сустрэча закаханых. Ва ўспаміне выяўляецца, што месца сустрэчы – *гай*, а не *парк*, які згадваецца ў першай частцы. Акрамя таго, граматычна няправільна змешаны вышэйшая ступень параўнання прыслоўя і прыметніка (трэба – *прыгажэйшай*), а такая праўка разбурае страфу. Далей у частцы з'яўляецца ўжо і *сад*, таму чытачу будзе незразумела, дзе ж адбываюцца асноўныя падзеі ў баладзе?

У трэцяй частцы рэдактар сочыць за разгортваннем сюжэта і аналізуе мастацкія сродкі выражэння. Спрэчнымі ўяўляюцца і абранне эпітэта *заручальны* ў адносінах да дуба – своеасаблівага цара між дрэў, і вітанне *ноччу салаўінага спеву* (звычайна якраз *салаўіны спеў* вітае *ноч*). Аднак гэта могуць быць, на думку аўтара, «прыдзіркі рэдактара». Здарылася, як піша аўтар, нечаканае: навальніца прымусіла схавацца ў млыне.

Апісанне, якое выкарыстоўваецца для чацвёртага вузла аповеду, выклікае новыя пытанні. Дзеяслоў *напомніць* у першым двухрадкоўі кіруе вінавальным (*пра каго-што*, *каго-што*) і месным (*аб кім-чым*) склонамі залежных кампанентаў [1, с. 141], а не творным (*стагоддзі... напомнілі прыладамі*), які выкарыстаў аўтар (менавіта *прылады* напомнілі мінулы час), таму патрабуецца дапрацоўка гэтых радкоў. Аднак і дзеянне ў страфе прэзентавана фактычна, сэнсава і граматычна недасканала. Гэта быў млын-музей або закінуты млын? Калі апош-

няе, то адкуль узялася свечка? Чаму святло свечкі ўпала *ля тваіх кален* (правільна *калень* або *каленяў*, а словаформа *кален* не адносіцца да чалавечага арганізма)? Адкуль на млыне печ? Куды падзелася святло ад печы, калі другая свечка асвятліла *ўвесь пакой*?

Для пятай часткі з трох строф уласцівы лірычны настрой – маладыя людзі сам-насам у паўасветленым старадаўнім памяшканні. *Радкі праселіся і леглі на паперу, // Чысцюткія, як свет тваёй душы*, – сцвярджае аўтар. Адкуль у маладога чалавека папера і асадка (вузел аповеду пра гэта адсутнічае)? Закаханы просіць дзяўчыну пачакаць, пакуль ён што-кольвек створыць? Чаму ў параўнанні выкарыстаны слова *свет*, а не *святло* душы (міжмоўная аманімія)? Далей аўтар набліжаецца да кульмінацыі: *Хвіліны беглі, мы задзьмулі свечы...* Чаму *свечы* (раней жа сказана, што была толькі адна)? Радок *Ды уварваўся незвычайны гром!* рыхтуе чытача да нечага страшэннага (*гром* усё ж не асацыюецца са шчаслівым здарэннем)? Магчыма, эпітэт *незвычайны* сведчыць пра адваротнае?

Шостая аднастрофавая частка павінна была б апісваць кульмінацыю кахання, але аўтар падае філасофскае разважанне, пазбаўленае сэнсавай напоўненасці: *памкненне душ... знаходзіць і стварае вечны шлях*. «Гэта як?» – павінен быў задаць пытанне рэдактар.

Аднак сапраўдная кульмінацыя твора – у сёмай частцы (*Адны ў Сусвеце. Вось яно імгненне! // Непараўнальна дарагі санэт*). Гэтыя два радкі патрабуюць моўнай праўкі, нават без аўтарскага ўмяшальніцтва: не вылучаны коскай зваротак *імгненне*, *санет* пішацца праз *е* (слова і рыфмавалася б больш арганічна: *мне – санет*).

Восьмая частка балады таксама мае адну страфу. Здавалася, гэта павінна зноў падмацоўвацца філасофскімі разважаннямі (як у шостай частцы). Аўтар жа ўключае апавядальны (*Ды толькі сціхла ў коміне разгульным. // Ты да пляча схілілася бліжэй*) і апісальны (*Свячы агеньчык – добры і утульны // На тваім твары соладка дрыжэў*) фрагменты. У рэдактара ўзнікае пытанне: калі была запалена свечка, бо ў пятай частцы сказана: *Хвіліны беглі. Мы задзьмулі свечы*?..

Апошняя, дзявятая, частка канстатуе наяўнасць суровага лёсу, які *прымусіў да расстання*, адзіноту лірычнага героя у сучаснасці (*У садзе маім пуста, дзіка, глуха*) і немагчымасць забыць першае каханне. Апошнія радкі балады павінны западаць у душу чытача, аднак тут гэтага не адбываецца: яны прымушаюць задумацца над іншым: калі *кладзецца белым снегам сівізна*, то мара *з табой прайсці праз радасць і праз гора* выглядае недарэчнай і крыху смешнай. А наконт фразы, што *ты* – гэта *мая Радзіма і каханая мая*, і гаварыць не варта.

Рэдактарскі аналіз «Балады пра каханне» сведчыць: калі ўзнікае столькі пытанняў, на якія або няма адказу ў творы, або адказ ведае толькі аўтар (ён, паводле М. Бахціна, «не толькі бачыць і ведае ўсё тое, што бачыць і ведае кожны герой паасобку і ўсе героі разам, але і больш за іх» [3, с. 14]), патрабуецца грунтоўная дапрацоўка твора. Пры добрых намерах аўтар не здолеў якасна рэалізаваць задуму, бо часам узнікае адчуванне не творчасці, а звычайнага ўмення падбору рыфмаў. У баладзе парушаны прычынна-выніковыя сувязі паміж вузламі аповеду, на пачатку твора не сканцэнтравана ўвага на галоўным месцы падзей (гэта ўсё ж *млын*, а не *парк* ці *гай*), дапушчаны фактычныя, сэнсавыя і моўныя хібы. Зразумела, такі твор нельга было друкаваць без грунтоўнай аўтарскай дапрацоўкі. Пазабяганне перад аўтарам, імкненне захаваць добрыя адносіны выклікае зніжэнне якасці літаратурнай прадукцыі, якая публікуецца ў сучаснай прэсе, адштурхоўвае чытача ад газеты і часта прыводзіць да зніжэння яе накладу. Гэта для рэдактара мусіць быць аксіёмай.

Літаратура

1. Арашонкава, Г. У. Кіраванне ў беларускай і рускай імовах : слоўнік-даведнік / Г. У. Арашонкава, В. П. Лемцюгова ; пад рэд. М. В. Бірылы, А. І. Падлужнага. – Мінск : Вышэйшая школа, 1991. – 303 с.
2. Багдановіч, М. Поўны зб. тв. : у 3 т. Т. 1 : вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды / Максім Багдановіч. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – 752 с.
3. Бахтин, М. М. Эстетика словесного творчества / М. М. Бахтин. – М. : Искусство, 1986. – 444 с.
4. Дуброўскі, А. Метадалагічныя асновы рэдагавання вершаванага тэксту : крытэрыі мастацкасці паэтычнага твора / А. Дуброўскі // Журналістыка-2013: стан, праблемы і перспектывы : матэрыялы 15-й Міжнар. навук.-практ. канф., 5–6 сн. 2013 г., Мінск / рэдкал. : С. В. Дубовік (адк. рэд.) [і інш.]. – Вып. 14. – Мінск : БДУ, 2013. – С. 193–195.
5. Караткевіч, У. С. Зб. тв. : у 25 т. Т. 14 : публіцыстыка, эсэ-рэцэнзіі, эсэ-лісты, матэрыялы для газеты «Боевая вахта», суаўтарства, інтэрв'ю, літаратуразнаўства : 1946–1983 / Уладзімір Караткевіч ; падрыхт. тэкстаў і камент. Пятра Жаўняровіча ; рэд. тома Віктар Іўчанкаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2016. – 510 с.
6. Купала, Я. Вершы і паэмы / Янка Купала ; маст. М. Басалыга. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1982. – 431 с.
7. Мильчин, А. Э. Методика редактирования текста / А. Э. Мильчин. – Изд. 3-е, перераб. и доп. – М. : Логос, 2005. – 524 с.
8. Рагойша, В. П. Паэтычны слоўнік / Вячаслаў Рагойша. – 3-е выд., дапрац. і дапоўн. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 576 с.

9. Стилистика и литературное редактирование : учебник / под ред. проф. В. И. Максимова. – 3-е изд., перераб. и доп. – М. : Гардарики, 2007. – 653 с.

Сяргей Зелянко
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ ФЕНОМЕН ГАЗЕТЫ БЕЛАРУСАЎ ЛАТВІІ «ПРАМЕНЬ»

Па звестках на студзень 2014 г. у Латвіі жыве 74 205 беларусаў [гл. 4]. Суайчыннікі ў Латвіі займаюцца бізнесам, грамадскай, культурнай і адукацыйнай дзейнасцю: працуюць Саюз беларусаў Латвіі, Асацыяцыя прадпрымальнікаў-беларусаў «Беларускі шлях», дзейнічае аб'яднанне мастакоў-беларусаў Балтыі «Маю гонар», функцыянуюць грамадскія аб'яднанні – «Прамень», «Уздым», «Сузор'е», «Спадчына», «Мара», «Вясёлка», «Крыніца», «Лянок», «Сябры», «Вербніца», «Пралеска», «Злата» і інш. У Рызе працуе школа імя Янкі Купалы. На Латвійскім радыё 4 выходзяць перадачы, прысвечаныя дзейнасці нашых суайчыннікаў. Аднак адным з самых адметных праектаў беларусаў у Латвіі з'яўляецца заснаванне друкаванага СМІ.

Больш за 20 гадоў выходзіць у свет газета беларусаў Латвіі «Прамень», адно з нешматлікіх беларускіх перыядычных выданняў, што выпускаецца па-за межамі Беларусь. За значны ўнёсак у развіццё беларускага друку ў замежжы, умацаванне беларуска-латвійскіх сувязей рэдакцыя газеты 14 кастрычніка 2009 г. пастановай Савета Міністраў Беларусі была ўзнагароджана Ганаровай граматай.

27 снежня 1994 г. пабачыў свет першы нумар выдання, у якім рэдакцыйная калегія змясціла зварот «Да беларусаў Латвіі», дзе адзначалася: «Паважаныя суайчыннікі! Сёння вы трымаеце ў руках і здзіўлена разглядаеце першы нумар газеты «Прамень», надрукаваны на нашай роднай беларускай мове. <...> Нават у далечыні ад сваёй Радзімы, праз блізкую па напрамку і адлегласці газету вы нараўне са сваімі сародзічамі прымеце ўдзел у агульнай справе адраджэння беларускіх святыняў – мовы, культуры, гісторыі, развіцця на гэтай аснове добрых і цесных узаемаадносін паміж беларускім і латышскім народамі» [2, с. 1]. Рэдкалегія ставіла перад сабой і сваёй аўдыторыяй нялёгкую задачу. Задачу гэту працягвае выконваць і сёння, таму вельмі дзіўным выглядае факт адсутнасці звестак пра газету ў бібліяграфіях «Belarusian publishing in the West» [гл. 5], «Беларускі і беларусаведны друк на Захадзе» [гл. 1].

Як сведчаць вынікі кантэнт-аналізу, у тэматычным напаўненні выдання дамінуе культурны складнік. Каля 70 % артыкулаў прысвечана пытанням мастацтва, мовы, адукацыі, гістарычнай спадчыны Беларусі. Прывядзем некалькі назваў рубрык, што замацаваліся ў выданні: «Гісторыя Бацькаўшчыны», «Нашы знакамітыя землякі», «Беларуская старасветчына», «Спадчына нашых дзядоў», «Беларускія народныя абрады». Гэта ж назіраем і ў загаловачных комплесах матэрыялаў выдання: «Прафесіі даўніны», «600 гадоў на Беларусі», «Ён быў ваяводам, старастам, вялікім канцлерам», «Беларуская зорка ў небе Чылі», «Беларускія формы прозвішчаў і іх перадача на іншыя мовы», «Аб Айчыне нашай васільковай – Беларусі», «Імем Чэрскага названы горад, краж, гара, даліна...».

Падобная тэндэнцыя да фарміравання кантэнту друкаванага выдання прасочваецца, як сцвярджаюць навукоўцы, у большасці газет і часопісаў, інфармацыйных лісткоў і бюлетэняў, што выдаваліся нашымі суайчыннікамі за межамі Бацькаўшчыны, паколькі «перыядычныя выданні непасрэдна ўздзейнічалі на працэсы нацыянальнага самавызначэння беларусаў у прымаючым грамадстве, спрыялі абуджэнню нацыянальнай самасвядомасці дыяспары, зберажэнню нацыянальнай ідэнтычнасці. Інфармацыя са старонак газет і часопісаў дапамагала фарміраваць этнічнае самаадчуванне беларускай супольнасці замежжа, яе этнічную асаблівасць» [3, с. 239]. Родная мова, агульная культурная прыналежнасць мацуюць грамадства, асабліва гэта тычыца нацыянальных суполак ва ўмовах чужога маўленчага асяроддзя.

На старонках выдання публікаваліся матэрыялы амаль усіх журналісцкіх жанраў: інфармацыйных (нататкі, замалёўкі, інтэрв'ю, справаздачы, рэпартажы), аналітычных (карэспандэнцыі, артыкулы, рэцэнзіі, агляды), мастацка-публіцыстычных (нарысы, фельетоны). Гэты факт сведчыць пра вельмі сур'ёзнае стаўленне рэдакцыйнай калегіі газеты да разнастайвання жанравай палітры выдання для пашырэння цікавасных кругаглядаў і задавальнення розных густавых пераваг кожнага прадстаўніка чытацкай аўдыторыі.

Жыццё ў іншай краіне вымагае ад суайчыннікаў і абавязковай інтэграцыі ў грамадства, якое прыняло іх у сваёй нацыйнальна-культурнай прасторы. Прафесійную інфармацыйную дапамогу ў гэтым беларусам Латвіі аказвае газета «Прамень». На старонках выдання беларусы Латвіі знаходзяць навіны пра афіцыйныя ўзаемаадносіны дзвюх краін-суседак, артыкулы пра жыццё беларусаў у Латвіі, пра яе культуру і гісторыю, пра важкі ўнёсак у яе гісторыка-культурную скарбонку

найлепшых прадстаўнікоў беларускай дыяспары. Наступныя загалоўкі публіцыстычных матэрыялаў, якія былі апублікаваны ў газеце «Прамень» за больш як дваццацігадовы перыяд яе працы, пацвярджаюць выказаную думку: «Сувязь латышскіх і беларускіх пісьменнікаў», «Рыжскі трыумф віцебскіх мастакоў», «Латышскія выданні пра беларусаў», «У Рызе адбыўся вечар беларускай паэзіі», «Праблемам беларусаў – дзяржаўнае вырашэнне», «Гісторыя газеты – гэта гісторыя беларускай дыяспары ў Латвіі», «Беларуская восень прыйшла ў Елгаву», «А хто там ідзе? – Беларусы Латвіі», «Лікаванне праваслаўных Латвіі», «За адукацыяй на этнічную Радзіму», «Знаёмства з мастацтвам Латвіі», «Дыпламатычнаму ведамству Беларусі ў Даўгаўпілсе – 10 гадоў», «Супрацоўніцтва з Урадам Латвіі», «Беларуская асвета ў Латвіі», «Беларусы ў Латгаліі: гісторыя і лічбы». Як сведчаць прыведзеныя прыклады, і ў значнай частцы журналісцкіх тэкстаў, у першую чаргу накіраваных на аператыўнае інфармаванне беларускай суполкі ў Латвійскай Рэспубліцы пра падзеі ў краіне іх пражывання ці ў суседніх дзяржавах (асабліва гэта тычыцца рэпартажаў і аналітычных артыкулаў), прэвалюе моцны гісторыка-культурны тэматычны складнік, абумоўлены нацыянальнымі цікавасцямі чытацкай аўдыторыі газеты «Прамень».

Пры гэтым, як дэманструюць вынікі кантэнт-аналізу, паступова газета «Прамень» з вузкафарматнага выдання ператварылася ў грамадска-палітычную газету з адпаведным тэматычным і жанравым напаўненнем. Апошні тэзіс, відавочна, тлумачыцца тым фактам, што не пераставалі нашы суайчыннікі ў Латвіі ўважліва сачыць і за афіцыйнымі навінамі з Бацькаўшчыны, у чым зноў жа ім дапамагаў «Прамень». На старонках газеты друкаваліся матэрыялы, якія асвятлялі ўнутраную і знешнюю палітыку Беларусі. Адзначым, што пры гэтым рэдкалегія не абмяжоўвалася выключна звесткамі пра ўзаемадзеянне кіраўніцтва Беларусі і Латвіі, тэматычнае поле падобных медыятэкстаў было і застаецца значна шырэйшым. Пацвердзім сказанае прыкладамі – назвамі публіцыстычных артыкулаў: «9 верасня выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь», «Заява Міністэрства замежных спраўваў Рэспублікі Беларусь», «Беларусь за 10 гадоў: Дасягненні і перспектывы», «Беларусь і далей будзе жыць сваім розумам і паступаць па сваіх законах», «За адзінства нацыі! За дабрабыт! За росквіт Беларусі!», «Беларускі міністр у Рызе», «Паездка беларускага віцэ-прэм'ера ў Вентспілс», «Сустрэча з Прэм'ер-міністрам Рэспублікі Беларусь», «Грамадзяне Літвы хочуць добрых адносінаў з Беларуссю», «Жыццё беларусаў у Латвіі і іншых замежных краінах» і інш.

Пэўныя тэматычныя лакуны пра падзеі ў свеце на сваіх старонках, як гэта і прынята, газета «Прамень», кіруючыся патрэбамі чытацкай аўдыторыі ў аператыўным і палітэматычным інфармаванні, запаўняе дайджэстамі матэрыялаў, якія падрыхтаваны супрацоўнікамі інфармацыйных агенцтваў ІТАР-ТАСС, БелТА, БелаПАН. Гэта цалкам апраўданы падыход, паколькі ўтрыманне ўласных ці спецыяльных карэспандэнтаў для лакальнага выдання, якім з'яўляецца газета «Прамень», уяўляецца эканамічна немэтазгодным.

Неабходна падкрэсліць, што кантэнт-аналіз дазволіў выявіць на старонках газеты шэраг артыкулаў, якія былі напісаны беларускімі вучонымі – Г. Тычко і П. Сцяцко, а таксама вядомымі журналістамі – М. Шавыркіным, С. Панізнікам, І. Плескачэўскай. Гэта яшчэ раз сведчыць пра ўдумлівы падыход рэдкалегіі да жанравага і тэматычнага напаўнення газеты.

Колькасць палос газеты «Прамень» вар'іравалася ад 4 да 10. Большасць нумароў у першае дзесяцігоддзе функцыянавання выдання (перыяд з 1994 па 2004 г.) мела 4 паласы.

Навуковую цікавасць уяўляе мастацка-тэхнічнае афармленне газеты. Першыя 10 гадоў выданне выходзіла ў чорна-белым фармаце, толькі асобныя выпускі мелі аднакаляровыя плашкі, заліўкі, назвы рубрык і загалоўкаў на першай і апошняй палосах выдання. Пачынаючы з № 1/2011 газета з'яўляецца ўжо цалкам каляровай. Пераход з чорна-белага на каляровы друк можна патлумачыць некалькімі фактарамі: жаданнем дагадзіць чытацкай аўдыторыі, спробамі яе ўтрымання і пашырэння; імкненнем да ўзмацнення візуалізацыйных магчымасцяў публікацый; наяўнасцю канкурэнцыі з боку латвійскх друкаваных СМІ.

Як паказваюць вынікі праведзенага аналізу, тыраж газеты беларусаў Латвіі на працягу 22 гадоў яе выхаду ў свет вагаўся ад 1000 да 5000 асобнікаў. Працяглы перыяд (з 1995 па 2001 г.) газета выходзіла даволі вялікім для падобнага віду выданняў тыражом у 3000 экзэмпляраў. З 2002 па 2005 г. тыраж газеты складаў 2000 экзэмпляраў. На сёння газета выходзіць тыражом у 1000 асобнікаў. Зніжэнне тыражнасці газеты можна патлумачыць фактарамі, якія ўплываюць на выдавецкую дзейнасць і працу рэдакцый СМІ па ўсім свеце: глабальнае развіццё інфармацыйных тэхналогій; некантралюемае пашэрэнне аб'ёмаў інфармацыі, якую чытачам прыходзіцца самастойна фільтраваць і абмяжоўваць; жаданне аўдыторыі атрымліваць інфармацыю праз электронныя медыя. Таму працэс зніжэння тыражу газеты можна лічыць натуральным. Аднак выпуск 1000 асобнікаў выдання на аўдыторыю ў 60 000 спажыўцоў беларускай дыяспары ў Латвіі ўяўляецца мэтазгодным.

Для пашырэння аўдыторыі, прыцягнення да выдання новых чытачоў рэдакцыйнай калегіі газеты беларусаў Латвіі «Прамень» можна рэкамендаваць стварыць анлайнавую версію выдання, не абмяжоўваючыся размяшчэннем у адпаведным раздзеле сайта Саюза беларусаў Латвіі PDF-файла з вёрсткай чарговага нумара. Гэта можа быць як асобная платформа, так і старонка на сайце Саюза беларусаў Латвіі, дзе матэрыялы самой газеты будуць толькі часткай кантэнту, які можа быць пашыраны за кошт допісаў чытачоў, публікацыі відэа- і аўдыяфайлаў і г. д. Такая платформа ў перспектыве можа развіцца ў паўнавартасны анлайнавы сродак масавай інфармацыі, прыносіць камерцыйны прыбытак за кошт платнага кантэнту, размяшчэння рэкламных блокаў і паведамленняў.

Літаратура

1. Беларускі і беларусаведны друк на Захадзе / склад. Зора і Вітаўт Кіпелі. – Нью-Йорк : Беларускі інстытут навукі і мастацтва, 2003. – 582 с.
2. Да беларусаў Латвіі // Прамень : газета беларусаў Латвіі. – 1994. – 24 снеж. – С. 1.
3. Коваль, В. У. Беларускамоўныя перыядычныя выданні дыяспары – важныя гістарычныя крыніцы / В. У. Коваль // Кніжная культура Беларусі : матэрыялы XII міжнар. кнігазнаўчых чытанняў, Мінск, 7-8 крас. 2016 г. / Нац. бібліятэка Беларусі ; [складальнікі: Т. А. Сапега, А. А. Суша]. – Мінск : НББ, 2016. – С. 239–242.
4. Олесава, І. Газета «Прамень» – летапіс беларускай дыяспары Латвіі / І. Олесава // Саюз беларусаў Латвіі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://belorus.lv/?p=939. – Дата доступу : 18.09.2016.
5. Kipel, V. Belarusian publishing in the West / V. Kipel, Z. Kipel. – New York : Belarusian Institute of Arts and Sciences ; Warsaw : Polish Academy of Sciences, Institute of Slavic Studies, 2006. – 841 p.

Віктар Іўчанкаў
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

ПРАГМАТЫЧНЫ І КАГНІТЫЎНЫ АСПЕКТЫ ВЫВУЧЭННЯ МЕДЫЯТЭКСТУ ЯК ДЫСКУРСУ

Мэтавае прызначэнне перыядычнага выдання – паведаміць, праінфармаваць і паўздзейнічаць, паўплываць на чытача. Для выканання адпаведных функцый медыятэкст мае комплексны арсенал спосабаў і прыёмаў, накіраваных на дасягненне значанага ўплыву рэпрадуцэнта на рэцыпіента. Такім чынам пастулюецца заканамерная цікавасць да функцыянавання вербальных знакаў у маўленні, што на сёння з’яўляецца

прадметам прагматыкі. У канцы 30-х гадоў XX стагоддзя Ч. Морыс, разглядаючы навакольны свет як суму знакаў, выдзеліў з семіётыкі семантыку, якая вывучала адносіны знакаў да аб'ектаў, сінтактыку – галіну навуковага інтарэсу пра міжзнакавыя адносіны і прагматыку, якая даследуе адносіны да вербальных знакаў, тэксту іх вытворцаў і стваральнікаў. Фарміраванне прагматыкі як галіны лінгвістычных даследаванняў пачынаецца з другой паловы мінулага стагоддзя пад уплывам ідэй Ч. Пірса, логіка-філасофскіх тэорый маўленчых актаў Дж. Осціна, Дж. Сёрля, З. Вандлера, прагматычнай тэорыі значэння П. Грайса, тэорый рэферэнцыі Л. Лінскага, П. Стросана.

Паводле тэорыі маўленчых актаў у якасці асноўных адзінак чалавечай камунікацыі выступаюць не асобныя словы, сказы, а шматпланавыя па сваёй пабудове і вытворчасці пэўныя маўленчыя дзеянні (лакуцыі), якія выступаюць у якасці носьбітаў вызначаных пэўнымі ўмовамі камунікатыўных заданняў (ілакуцый) і накіраваны на дасягненне камунікатыўна-ўплывовага эфекту (перлакуцый). Роля выведзеных паводле гэтай тэорыі пастулатаў у дыскурсным аналізе даволі вялікая. Дж. Сёрль дадае яшчэ адзін план – прапазіцыянальныя акты, якія падзяляюцца на акты рэферэнцыі (адносіны да свету) і акты прэдыкацыі (выказванні пра свет). Асноўная ўвага распрацоўшчыкаў тэорыі маўленчых актаў прыпадае на апісанне структуры ілакутыўных актаў і іх класіфікацыі. Генералізуецца класіфікацыя, прапанаваная Дж. Сёрлем: асертывы (рэпрэзентатывы), задача якіх паведаміць пра становішча спраў і падаць мяркуемую ісцінасную ацэнку; дырэктывы як пабуджэнне адрасатаў да пэўных дзеянняў; камісівы як паведамленне пра ўзятыя на сябе пэўныя абавязацельствы; экспрэсівы як выражэнне пэўнай псіхічнай пазіцыі ў адносінах да канкрэтнай сітуацыі; дэкларатывы, задача якіх паказаць на ўстанаўленне новага становішча спраў [2].

Адрозніваюцца прамыя (першасна перфарматыўныя) і непрамыя (пабочныя) маўленчыя акты. Прадметам апісання становяцца моўныя сродкі, у якіх выражаюцца ілакутыўныя мэты і функцыі, а таксама ўмовы камунікацыі. Аналізуецца паспяховая (удалая) рэалізацыя адпаведных ілакутыўных актаў (правілы прапазіцыйнага зместу). Дж. Сёрлем і Д. Вандэрвекенам распрацоўваецца ілакутыўная логіка [1]. Набыткі вучоных спрыяюць пранікненню кагнітыўных маўленчых тэорый у практыку дыскурснага аналізу.

Такім чынам, семантычна арыентаваны і прагматычна арыентаваны напрамкі ў сучаснай тэорыі маўленчых актаў цесна змыкаюцца з дыскурсным аналізам. Даследаванне структуры маўленчых актаў прад-

прымаецца з пазіцый генератыўнай семантыкі Джэралда М. Сейдака, мадыфікацыі ў рэчышчы таксаноміі маўленчых актаў і іх трактоўка шырока вывучаюцца ў працах Д. Вундэрліха, Т. Балмера, В. Брэненштуля, Д. Вандэрвекена, Д. Версурэна, М. Бірвіша, Ж. Факанье, Ф. Рэканаты, Ф. Кіфера, В. Мотча, З. Вендлера, А. Вежбіцкай, Г. Пачапцова, Ю. Апрэсяна, М. Нікіціна і інш. Кола праблем, якія ўваходзяць у рэчышча тэорыі маўленчых актаў, паказвае, наколькі моцны ўплыў яна мае на развіццё камунікатыўнай лінгвістыкі, дыскурснага аналізу, канверсацыйнага аналізу (асабліва на станаўленне нямецкай школы – аналізу размовы). На сёння тэорыя маўленчых актаў уключаецца ў лінгвістычную прагматыку. Гэта дало грунт для ўключэння метадалогіі і дэфінітыўнага апарату апошняй у дыскурсны аналіз і кагнітыўную лінгвістыку.

Згадаем, што асноваўкладальнікі дыскурснага аналізу пачыналі з даследавання тэкстаў праз прызму структуралізму (асемантычны дыстрыбуцыяналізм З. Харыса), трансфармацыйнай граматыкі, фармальна-лінгвістычнай логікі (кагерэнцыя і кагезія І. Гальперына). Дыскурсны аналіз на пачатку свайго станаўлення супадае з па-структуралісцку арыентаванай граматыкай тэксту і нараджаецца ў лінгвістыцы тэксту. Не падлягае сумненню, што ў сваім сучасным праяўленні ён складваецца на базе функцыянальна-лінгвістычных плыняў, на што натуральным чынам паўплывалі вучэнне пра камунікатыўна-прагматычныя мадэлі мовы і ідэі кагнітыўнай навукі. З гэтага часу ўвага даследчыкаў трывала праглядаецца ў аналізе дынамічнага характару дыскурсу не як статычнай камунікатыўнай з'явы, а як дынамічнага працэсу канструявання маўленчай рэчаіснасці рэпрадуцэнтам / журналістам і працэсаў інтэрпрэтацыі рэцыпіентам / «чалавекам успрымальным» (Д. Браўн і Д. Юл, Т. А. ван Дэйк). У полі пераважнай даследчай цікавасці апынуліся пытанні ўліку пры аналізе прагматычных фактараў і кантэксту дыскурсу (рэферэнцыі, імплікатуры, прэсупазіцыі), кантэксту сацыякультурнай сітуацыі, ролі топіка і тэмы, інфармацыйнай рэляцыі (тэматычнае – рэматычнае), кагезіі і кагерэнцыі, канвенцыянальных ведаў (фрэймы, скрыпты, сцэнарыі, схемы, ментальныя мадэлі і інш.).

Прагматычная суаднесенасць медыятэксту з дыскурсам яўна выражаецца ў псіхалінгвістычнай сутнасці ўспрымання апошняга і яго экстралінгвістычным характарам. Гэта паспрыяла вызначэнню тэндэнцыі развіцця мовазнаўства – ад устанаўлення правілаў фармальнай граматыкі, якая апісвае ўнутраную, іманентную структуру мовы, да выяўлення агульных стратэгій вытворчасці і разумення дыскурсу, да па-

будовы тэорыі карыстання мовай на дзейнасным грунце. У цэнтры ўвагі аказваецца не толькі мова ў непарыўным адзінстве формы і субстанцыі, але і адзінства мовы і чалавека – дзейснага ў рэальным свеце, які пазнае і думае, кантактуе з сабе падобнымі.

Статычная лінгвістыка ў пазнанні мовы ішла раней ад моўных фактаў, тады калі дзейнасная (дынамічная) лінгвістыка (перш-наперш у выглядзе прагматыкі) ідзе ад чалавека, яго камунікатыўных мэтаў, ад камунікатыўных сітуацый, у якіх галоўным суб'ектам ён з'яўляецца, выступае ў якасці або ініцыятара, маўленчага лідара, або ў пацыенснай ролі. Тады даследчык мае прастору для новага погляду на змест моўнага факта. Такім чынам, дынамічны пачатак закладзены, хутчэй за ўсё, не ў гатовым тэкставым прадукце, арганізаваным па законах маўлення, а ў актах інтэрпрэтацыі тэксту яго чытачом або даследчыкам. Ідучы ад тэксту, даследчык спрабуе рэканструяваць тую (таксама дынамічную) прадметную і кагнітыўна-камунікатыўную сітуацыю, у якой мог узнікнуць той ці іншы публіцыстычны твор.

Дыскурсны аналіз арыентуецца на ўстаноўкі дзейнаснай парадыгмы. Мова ў ёй і анталагічна, і эпістэмічна ўключаецца ў чалавечую дзейнасць, у якой з'яўляецца адным з найважнейшых яе інструментаў і найкаштоўнейшым прадуктам.

Літаратура

1. Searle, J. R. Foundations of illocutionari logic / J. R. Searle, D. Vanderveken. – Cambrige : Universiti Press, 1969. – 240 p.
2. Searle, J. Speech Acts / J. Searle. – Cambrige : Universiti Press, 1969. – 256 p.

Владимир Каленич
Винницкий государственный педагогический университет им. М. Коцюбинского (Украина)

ИНТЕРТЕКСТУАЛЬНЫЕ ПРИЕМЫ В ГАЗЕТНЫХ ТЕКСТАХ

В процессе создания текстов журналисты, публицисты прибегают к поиску эффективных экспрессивных средств, которые не только бы интересовали читателя, но и активизировали его познавательный потенциал, привлекали к совместному творческому осмыслению бытия. Одним из таких приемов является использование в журналистских произведениях фрагментов текстов, известных выражений, символов и т. д., которые создают определенные имплицитные контексты, кодируя информацию.

Межтекстовые взаимодействия неоднократно привлекали внимание исследователей лингвистики текста, литературоведов, культурологов, журналистиковедов. Вопросы связей текста с другими текстами исследовали М. Бахтин, Ю. Кристева, Р. Барт, Ж. Женетт, Р. Якобсон, И. Арнольд, Ю. Лотман, В. Ивченков, С. Зеленко, А. Супрун, Н. Фатеева, Н. Зражевская, Т. Иванюха, Т. Космеда, Е. Рябинина, М. Титаренко и др. Интертекстуальность в журналистике, по сравнению с литературой, достаточно новая научная проблема, которая вызывает исследовательский интерес и является актуальной.

С. Зеленко констатирует: «Адным з эфектыўных і да апошняга часу найбольш распаўсюджаных эмацыянальна-вобразных сродкаў пабудовы публіцыстычнага тэксту была яго татальная інтэртэкстуалізацыя: увядзенне ў аўтарскі твор «чужога» тэксту або яго часткі, экспліцытная або імпліцытная спасылка на твор іншага аўтара, згадванне шырока вядомых чытацкай аўдыторыі (прэцэдэнтных) імёнаў, гістарычных дат і сітуацый, выкарыстанне табуіраваных, абсцэнных, жаргонных і іншых лексем абмежаванага ўжытку» [2, с. 35].

Цель статьи – выяснить особенности выражения интертекстуальности и ее роль в современных медиатекстах (на материале газетных публикаций информационно-аналитического еженедельника «Зеркало недели» за 2016 г.).

Согласно общеизвестному определению Р. Барта, каждый текст «является интертекстом: другие тексты присутствуют в нем на различных уровнях в более или менее узнаваемых формах: тексты предшествующей культуры и тексты окружающей культуры. Каждый текст представляет собой новую ткань, сотканную из старых цитат. Обрывки культурных кодов, формул, ритмических структур, фрагменты социальных идиом и т. д. – все они поглощены текстом и перемешаны в нем, поскольку всегда до текста и вокруг него существует язык» [1, с. 512].

Специфическую текстообразующую роль играют интертекстуальные приемы в современном медиадискурсе. Привлечение интертекстов в журналистских произведениях активизирует читательское восприятие и способствует конденсации авторской мысли. Основными интертекстуальными средствами в медиатекстах являются цитаты, реминисценции и аллюзии, которые являются удачными приемами миграции известных сюжетов, событий, лиц, выражений в контексте журналистских материалов.

Цитация является проявлением интертекстуальности – использование в тексте отрывка другого текста, выражения для иллюстрации, аргументации, подтверждения определенного мнения с соблюдением

особенностей чужого высказывания (афоризмы, пословицы, крылатые слова и т. д.). В газете «Зеркало недели» это достаточно продуктивный интертекстуальный прием: *«В мире нет ничего более постоянного, чем непостоянство», – писал Джонатан Свифт* (№ 30. – С. 3); «*Теплое слово и кошке приятно», – говорит пословица. Хорошему сотруднику – также* (№ 45. – С. 13); *Пункт первый человеческого познания мира не изменился со времен Сократа: я знаю, что ничего не знаю* (№ 50. – С. 4).

Сфокусировать внимание на определенном объекте или аспекте бытия помогают трансформированные выражения, которые всегда имеют коннотативное значение, выражая определенную оценку и отношение к фактам. Например, такие оригинальные заголовки отличаются эмоциональностью и экспрессией, являясь своеобразным информационным кодом к публикации: *Сначала было НАБУ* (№ 38–39. – С. 1) – ср.: В начале было Слово (Библия); *Я злюсь – значит существую* (№ 47. – С. 13) – ср.: Я мыслю – значит я существую (Декарт); *Через тернии – к «Горизонту»* (№ 2. – С. 12) – ср.: Через тернии к звездам (латинское выражение). Эти трансформации служат для конкретизации смысла цитаты и приспособлению ее к новому контексту, к его основной идее.

Механизм действия всех интертекстуальных приемов одинаков: эксплицитный фрагмент или понятие в тексте и имплицитно связанные с ними ассоциации. Как автономные смысловые единицы они актуализируют важную для читателя информацию, апеллируя к его памяти, интеллекту, культуре, жизненному опыту.

Аллюзии как приемы художественно-публицистической выразительности создают ассоциации за счет намека на достаточно известные исторические или литературные факты, события, фразы, персонажей других текстов в расчете на эрудицию читателя: *Тем не менее величественный фольклорный украинский* ***воз****, который обычно «****и поныне там****», с угрожающим треском и скрипом таки двинулся с места* (№ 34. – С. 11); *На бюджетном «****Титанике****» и медики, и пациенты* (№ 40. – С. 13). Намек реализуется преимущественно при помощи слов или фраз, значение которых ассоциируется с определенным событием или лицом: *При слове «****депрессия****» применимо к стране часто на автомате возникает еще и слово «****Великая****», и вспоминают США 1930-х* (№ 34. – С. 11); *Налоговая реформа: по стопам античного* ***Сизифа*** (№ 27. – С. 6).

Аллюзия также может функционировать как средство создания качественных характеристик путем переноса черт мифологических, исторических, литературных персонажей на те, о которых говорится в медиатексте: *Если сформулировать коротко, то застройщик был объявлен* ***Юпитером****, а народ –* ***быком*** (№ 16. – С. 4) – ср.: Что позволено Юпи-

теру, не позволено быку (латинское выражение); *Наивно думать, что некий отчаянный* ***Робин Гуд*** *вдруг каким-то чудом попадет в святая святых и «изменит систему» изнутри* (№ 16. – С. 12).

Реминисценции предусматривают введение в определенный текст фрагментов, которые напоминают адресату события, факты, героев, стилистические приемы, мотивы другого текста, что может проявляться в сходстве. Так, в статье «Замысловатая неопределенность нового миропорядка» В. Горбулин апеллирует к антиутопии О. Хаксли «О, дивный новый мир!», написанной в начале 30-х годов прошлого века, в которой писатель попытался представить мир будущего как продолжение тех тенденций, свидетелем которых он был, во времена «глубокой политической перестройки всего европейского (и мирового) социума и миропорядка» (№ 30. – С. 1). Автор проводит параллель с современным миром, в котором проявления «гибридных войн» порождают формирование нового «гибридного мира». Эпиграф, цитаты О. Хаксли в тексте способствуют более рельефному отображению настоящего через призму взглядов писателя.

Реминисценции несут в себе основную и дополнительную оценочную информацию. Реализуясь в новом тексте, такие средства, с одной стороны, сохраняют свой первоначальный смысл, а с другой – создают новое контекстуальное смысловое поле. Журналистика, широко используя реминисцентные образы, «наполняет их новым понятийным смыслом, использует имеющийся в них семантический потенциал для развития интеллектуального сюжета или прагматической концепции» [3, с. 277].

Категория интертекстуальности для текстов массовой информации является их онтологическим конструктом, который отражает специфику медиатекстов на содержательном, структурном и знаковом уровнях. Цитаты, аллюзии, реминисценции создают эмоционально убедительный социокоммуникативный эффект, благодаря обращению к вечным образам метко, экономно и точно определяют ситуацию. Различные приемы интертекстуальности содержательно обогащают основную текстовую информацию, служат для иллюстрации, аргументации, подтверждения определенной мысли, создают ассоциативные связи с уже известными текстами, подчеркивают авторскую позицию, расширяют кругозор читателя, стимулируют к размышлениям, апеллируя к историческим, литературным, культурологическим знаниям адресата.

Литература

1. Барт, Р. Избранные труды. Семиотика. Поэтика / Р. Барт. – М. : Прогресс, 1978. – 616 с.

2. Зелянко, С. В. Інтэртэкст у публіцыстычным маўленні / С. В. Зелянко ; навук. рэд. В. І. Іўчанкаў. – Мінск : БДУ, 2012. – 195 с.
3. Михайлин, І. Л. Основи журналістики : підручник / І. Л. Михайлин. – 5-те вид., перероб. та доп. – Київ : Центр учбової літератури, 2011. – 496 с.

Юлія Лук'янюк
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

ЭКСПРЭСІЎНАСЦЬ ЯК АДНА З ЛІНГВАСТЫЛІСТЫЧНЫХ АСАБЛІВАСЦЯЎ КАМУНІКАЦЫІ Ў САЦЫЯЛЬНАЙ СЕТЦЫ FACEBOOK

Інтэрнэт-камунікацыя – адна з адносна новых сфер бытавання мовы, якія вельмі хутка развіваюцца. «Пачаткам станаўлення сусветнай камп'ютарнай сеткі інтэрнэт прынята лічыць 1986 г., калі Нацыянальны навуковы фонд стварыў навуковую камп'ютарную сетку і аб'яднаў яе з ARPANET. З тых часоў яе папулярнасць пастаянна расце, са сродку перадачы электронных пасланняў інтэрнэт ператварыўся сёння ў месца для сустрэч, напоўненае людзьмі і ідэямі, стаў кіберпрасторай, светам камунікацыі, інфармацыі і ўцех, у якім не існуе паняцця "адлегласць"» [1].

Экспрэсіўнасць – гэта ўласцівасць лексічнай адзінкі, а таксама адзінак іншых узроўняў мовы; экспрэсіўнае лексічнае значэнне (змест, семантыка) – сістэмнае значэнне лексічнай адзінкі; экспрэсіўная лексічная адзінка, экспрэсіўнае слова, экспрэсіўная намінацыя, экспрэсіў – лексема і лексіка-семантычны варыянт (ЛСВ) лексемы; экспрэсіўная адзінка мовы, экспрэсіў – адзінка любога ўзроўню; экспрэсіўны лексічны фонд (корпус) мовы – частка лексічнага фонду, лексічная падсістэма; экспрэсіўны фонд (корпус) мовы – сукупнасць рознаўзроўневых адзінак, якія валодаюць уласцівасцю экспрэсіўнасці як элементы моўнай сістэмы; экспрэсіўная функцыя (функцыі), экспрэсіўны эфект (В. Тэлія) – прагматычная функцыя (функцыі) экспрэсіўнай лексічнай адзінкі і іншых экспрэсіўных адзінак мовы. Экспрэсіўнасць у інтэрнэт-камунікацыі валодае як вербальнай, так і невербальнай формай.

Разгледзім некалькі найбольш частотных сродкаў экспрэсіўнасці ва ўмовах зносін у сацыяльнай сетцы амаль на ўсіх моўных узроўнях.

Фанетыка-графічныя сродкі.

1) Паўтарэнне літар пры пісьме ў эмацыянальна значных словах. Такая з'ява назіраецца як сярод галосных, так і сярод зычных, паасобку і разам, са злучком ці без яго. Такія прыклады ў першую чаргу сігналізуюць

аб моцным эмацыйным уздыме таго, хто піша, яго жаданні выказацца і быць пачутым. Як правіла, карыстальнікі «расцягваюць» словы пры пісьме, калі яны нечым вельмі ўзрадаваны, раззлаваны ці проста ўзбуджаны: «Это ЛЮБОВЬ!!! ВОСХИЩАЮСЬ!!!! Дааа.... Оооо!!!!!»; «Оууу) я зайзрошчууууу) ты пачнеш ужо чытаць «Інтэрнат»)»; «Это если вода в кране хорошая (не редкость, но дааааалеко не везде)»; «На кого из знаменитостей ты похож? Если бы ты был животным, то каким? Кем ты был в прошлой жизни? Сколько дерьма в твоей голове? Ну Денис, нуууууу!!!»; «Эээ, неее, так я магу ж і расказаць)))».

Нярэдка такая манера пісьма служыць для прыцягнення ўвагі, калі суразмоўца праяўляе мала актыўнасці, ці для наладжвання кантакту пасля доўгага маўчання. Ствараецца ўражанне, быццам такім чынам карыстальнікі спрабуюць «дакрычацца» да суразмоўцы, імітуючы пры пісьме вуснае маўленне.

2) Выкарыстанне эратываў – слоў ці выразаў, якія спецыяльна скажаюцца носьбітам мовы, які валодае літаратурнай нормай. Лінгвіст Г. Гусейнаў прапанаваў для такіх напісанняў тэрмін «эратыў» [2]. Самыя цікавыя прыклады – парушэнне правілаў напісання ненаціскных галосных у корані слоў, аглушэнне зычных у слабай пазіцыі ці азванчэнне глухіх зычных на канцы слова і г. д.: *Не то слово, королевша; ой ну вот ні надатут*!; *а ты ціпа неадукаваная неанціліхентка*? ⟩⟩; *на фкус і цвет таварышэй. нэт*; *мо мне норм тое, што табе не*.

3) Фанетычная кампрэсія – г. зн. рэалізацыя прынцыпу моўнай эканоміі, уласцівай гутарковаму маўленню: *ваще* (*вообще*), *сопссно* (*собственно*), *чё* (*чего*), *какнить* (*как-нибудь*), *ся* (*себя*), *ачочо*? *естьссыль*?

Лексіка-фразеалагічныя сродкі.

1) Выкарыстанне акронімаў. Тут мы назіраем узаемадзеянне лексікі і словаўтварэння: узнікаючы ў выніку словаўтваральных працэсаў, вытворныя пачынаюць «жыць уласным жыццём», ператвараючыся ў самастойныя лексемы. Папулярнасць скарачэнняў тлумачыцца тым, што яны эканомяць час (значна прасцей і хутчэй напісаць *спс*, чым *спасибо*), што з'яўляецца важным ва ўмовах жывых інтэрактыўных зносін. Прычым акронімы могуць утварацца як ад рускіх слоў (*ща – сейчас*, *лю – люблю*, *мими – мила*, *милы*, *тож – тоже*, *норм– нормально*, *нра – нравится*, *хз – не ведаю*, *не ўпэўнены*), так і шляхам запазычання англійскіх акронімаў (*upd(update) – зменена*, *абноўлена*, *лол – lol* (*laughingoutloud*), *рофл – rofl* (*rollingonthefloorlaughing*) – 'смяяцца ці катацца па падлозе ад смеху', *втф – wtf* (*whatthefuck*) – 'якога чорта', *омг – omg* (*ohmygod*) – 'божа мой', *імхо – imho* (*inmyhumbleopinion*) – 'я лічу').

2) Экспрэсіўна афарбаваная лексіка, гэта значыць словы, якія змяшчаюць у сваім лексічным значэнні адмоўную або станоўчую эмацыянальную ацэнку прадмета гаворкі. У інтэрнэт-асяроддзі часцей за ўсё ў такіх выпадках выкарыстоўваецца маладзёжны ці камп'ютарны слэнг. Параўнаем: словы са станоўчай канатацыяй: *клёвый*, *чумавы*, *кайф*, *руліць*, *абалдзець*, *выразна*, *афігець*; з адмоўнай ацэнкай рознай ступені: *ня айс*, *печалька*, *адстой*, *лажа*, *боян*, *хрень*, *бздура*, *фіговы*, *галімы*.

3) Фразеалагічныя адзінкі. Адным з самых распаўсюджаных спосабаў выражэння адносінаў таго, хто гаворыць, да чаго-небудзь з'яўляюцца фразеалагізмы – устойлівыя, лексічна непадзельныя словазлучэнні, якія надаюць масленню яркасць і вобразнасць. У інтэрнэт-зносінах фразеалагізмы разглядаюцца ў рамках такой з'явы, як мемы. Упершыню паняцце «мем» было ўжыта англійскім прафесарам Р. Докінз у кнізе «Эгаістычны ген», у якой аўтарка апісвае новы падыход да эвалюцыі жывых арганізмаў. Р. Докінз уводзіць гэтае паняцце як адзінку перадачы сацыякультурнай спадчыны або адзінку імітацыі (ад *грэч*. μίμημα – «мімем») [3].

Сінтаксічныя сродкі.

1) Парцэляцыя – расчляненне, драбненне выказвання, падача інфармацыі часткамі, што сведчыць аб эмацыянальнасці, вялікім хваляванні: «Ці не. Ты прыкінь. Яны мяне пракінуў. Я ў шоку проста»; «Да уж. Магла б і паехаць. гультайка»; «Слоў няма. Адны эмоцыі. Вельмі прыемна!!»

2) Выкарыстанне эліптычнай канструкцыі – сінтаксічнай фігуры, сутнасць якой у тым, што адзін з кампанентаў выказвання ў гаворцы не згадваецца, «апускаецца» з мэтай надання тэксту большай выразнасці, дынамічнасці; з дапамогай эліпсісу перадаецца хуткая змена падзей, дзеянняў, напружаны псіхалагічны стан аўтара: «Я яму такая навошта ты гаворыш усё гэта, а ён узяў і кінуў трубку, так і не размаўлялі з ім учора».

3) Выкарыстанне паўтораў: «ну прама страта страт»; «крыўдна, вельмі крыўдна».

Такім чынам, для сучаснага носьбіта мовы выражэнне эмоцый – надзвычай актуальная патрэба, абавязковая ў зносінах. Карыстальнікі сацыяльных сетак звяртаюцца да фанетычных, графічных, лексічных, марфалагічных, сінтаксічных і іншых сродкаў выражэння эмоцый. Самым распаўсюджаным спосабам іх выражэння ў сацыяльнай сетцы Facebook з'яўляецца графічны, накіраваны на зрокавае ўспрыманне інфармацыі, прыём, заснаваны на ўспрыманні знешніх, графічных сігналаў.

Літаратура

1. Акопов, Г. Л. Глобальные проблемы и опасности сетевой политики / Г. Л. Акопов [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://problem.politnet.ru/oglavlen.html. – Дата доступа : 10.09.2017.
2. Гусейнов, Г. «Берлога веблога». Введение в эрратическую семантику / Г. Гусейнов // «Говорим по-русски» [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.speakrus.ru/gg/microprosa_erratica-1.htm. – Дата доступа : 10.09.2017.
3. Докинз, Р. Эгоистичный ген / Р. Докинз [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://loveread.ec/view_global.php?id=45988. – Дата доступа : 02.09.2017.

Інеса Навасельцава
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт

ПРЭЦЭДЭНТНЫ ФЕНОМЕН ЯК СРОДАК АКТУАЛІЗАЦЫІ ГАЗЕТНЫХ ЗАГАЛОЎКАЎ

Інтэртэкстуальнасць, прэцэдэнтнасць, моўная гульня – адметныя рысы сённяшніх газетных тэкстаў. Стылістычна важкую пазіцыю ў структуры публікацыі займае загаловак – індэксальны знак, што служыць рэпрэзентантам тэксту і належыць да тых яго кампазіцыйных элементаў, якія адразу павінны прыцягваць увагу чытача. Таму ў сучасным загалоўку найбольш значнай з'яўляецца прагматычная функцыя. Мовазнаўца В. Іўчанкаў зазначае, што «ўцягненне чытача ў публічны дыялог, атрактыўнасць газетнай мовы адбіваецца на ўсёй структуры газетнага тэксту і на сінтаксічных структурах яго пабудовы. Сэнс гэтых змен наглядаецца ва ўзмацненні інфармацыйнай накіраванасці загалоўкаў… У цэлым заўважаецца тэндэнцыя да афармлення загалоўкаў сучасных газет прэдыкатыўнымі канструкцыямі, у адрозненне ад дамінавання намінатыўнага афармлення іх у мове СМІ савецкага часу» [1, с. 127]. Стварыць лёгкі для ўспрымання і адначасова інтрыгавальны, трапны, сэнсава ёмісты загаловак – адна са складаных задач журналіста. Ужыванне ў публіцыстычным дыскурсе прэцэдэнтных феноменаў – адзін з метадалагічных прыёмаў стварэння тэксту. Асноўнай умовай выкарыстання тэкстаў, якія маркіруюць прэцэдэнтнасць, з'яўляецца «ўсвядомленасць адрасантам факта адсылкі да пэўнага тэксту і знаёмства адрасата з першатэкстам, яго здольнасць расшыфраваць адсылку да гэтага тэксту» [2, с. 32].

Асаблівую значнасць, экспрэсіўную акцэнтуацыю набывае выкарыстанне прэцэдэнтных феноменаў у якасці загалоўка. Ёмісты ў семантычным плане прэцэдэнтны загаловак адсылае чытача да першаснага

тэксту (шэрагу тэкстаў) ці сітуацыі, шмат у чым прадвызначае сістэму каштоўнасных крытэрыяў і ацэнак рэчаіснасці, рэалізуе прагматычную функцыю. Часцей за ўсё прэцэдэнтныя феномены з класічных і маскультурных тэкстаў выкарыстоўваюцца СМІ ў мадыфікаваным выглядзе. Трансфармуючы кампанентны склад прэцэдэнтаў, журналіст робіць акцэнт на інфармацыі, што змешчана менавіта ў «новым» кампаненце з аказіянальнай аўтарскай канатацыяй. Найбольш частотнымі з'яўляюцца прыёмы змены лексічных кампанентаў і сінтаксічнай структуры прэцэдэнтнага выказвання. Ужыванне ў загалоўках трансфармаваных прэцэдэнтных феноменаў ілюструюць наступныя прыклады з беларускіх газет за 2015–2017 гады.

Са «Звязды»: «*Ці* ***ўсе дарогі вядуць*** *да храма?*», «***Усе дарогі вядуць у****... Мір*» (загаловак – перыфраз выразу «Усе дарогі вядуць у Рым»), «*Рамантыка невысокіх дамоў.* ***Быць ці не быць****?*» (другая частка – цытата з маналога Гамлета з аднайменнай п'есы Шэкспіра), «***Мытня дае дабро****, але не ўсім і не заўсёды*» (першая частка загалоўка – цытата з кінафільма савецкіх часоў «Белае сонца пустыні»), «***Як кахаць****, дык каралеву, як выпісваць, то «Звязду»!*» (адсылка да прыказкі пра апраўданне рызыкі дзеля дасягнення мэтаў *Полюбить – так королеву, проиграть – так миллион*, якая стала папулярнай пасля выхаду фільма «Масква слязам не верыць»); з «ЛіМа»: «*Ён бачыў* ***сны аб Беларусі****...*» (цытата з верша Я. Купалы «*...О так! Я пралетар!..*» у публікацыі пра спектакль «Браніслаў. Сцэны з жыцця ды сноў»), «***55 адценняў*** *ізумруднага*» (пра ізумруднае вяселле; адсылка да назвы амерыканскага фільма «50 адценняў шэрага»), «*Палёты наяве, ці Рэха сноў*» (адсылка да назвы савецкага фільма «Палёты ў сне і наяве»), «*Доўгая «кругасветка» дадому*» (пра кругасветнае падарожжа мінчука Ромы Свечнікава і яго кнігу «Рома едзе») і «*Доўгая дарога да кнігі*» (пра выхад доўгачаканага двухтомніка твораў Уладзіміра Дубоўкі) – адсылка да назвы кнігі В. Быкава «Доўгая дарога дадому»; з газеты «Культура»: «***Пачэсны пасад між****... музеямі*» (цытата з верша Я. Купалы «Маладая Беларусь»); «***Напачатку было слова. І слова было*** *"дэфенестрацыя"*» (цытата з Новага Запавету); «*Поўнач на далоні*» (адсылка да твора І. Шамякіна «Сэрца на далоні»; занатоўка пра кінафестываль «Паўночнае ззянне»); «*Прыходзь да яго лячыцца...*» (калька-пераклад радка з верша К. Чукоўскага «Доктар Айбаліт»); «*Што ў ВНУ табе тваёй?*» (згадка на верш А. Пушкіна «Что в имени тебе моем?»).

Часта загалоўкам абіраецца цытата з твораў беларускіх паэтаў: «*Над прадоннем былінных азёр...*» (з верша Я. Янішчыц), «*У родным краі*

ёсць крыніца жывой вады…» (верш М. Багдановіча) – «ЛіМ»; «*І сонца – ніякае сонца, а крыга...*» (верш М. Танка), «*Пачынаецца ўсё з любові*» (верш Я. Янішчыц) – «Звязда».

Падзагалоўкі найчасцей выкарыстоўваюцца ў «Звяздзе» і дапамагаюць актуалізаваць і семантычна ідэнтыфікаваць пададзеную ў загалоўку інфармацыю: «***Ах, падмануць мяне няцяжка****... Росквіт махлярства як адваротны бок нашай... законапаслухмянасці?*» (калька-цытата з верша А. Пушкіна «Прызнанне»); «*Калі* ***сніцца трава каля дома****... Прэзідэнт сустрэўся з касманаўтам, што нарадзіўся на Міншчыне*» (калька-цытата з песні ВІА «Зямляне»).

Прадуктыўная з'ява ў СМІ – выкарыстанне ў загалоўках парэмій і фразеалагізмаў, як у традыцыйнай форме, так і зменены, што дазваляе журналістам рэалізаваць інфармацыйны, ацэначны, эмацыянальна-экспрэсіўны складнікі паведамлення. Прыклады з газеты «Звязда»: «*НА ЎСЕ СТО!*» (пра стагадовы юбілей «Звязды»); «*Пры поўным парадзе*» (пра пакупкі, звязаныя з падрыхтоўкай дзяцей да школы); «*Маленькаму караблю – вялікае плаванне?*» (пра развіццё малога бізнесу ў краіне); «*Калі агурок усяму галава*» (пра Свята агурка ў Шклоўскім раёне); «*Крывавы месяц. Лёс на кані не аб'едзеш?*», «*Век пражыць – не пальцам пераківаць*», «*Сем разоў перачытаць – адзін надрукаваць*»; з «ЛіМа»: «*Калі сезон год корміць*» (рэпартаж з галоўнага клубнічнага рынку краіны), «*Вывесці на чыстую ваду*» (выкарыстаны ў якасці загалоўка фразеалагізм удала абыгрывае праблемную тэму чысціні звычайнай пітной вады), «*Маэстра папрасіў –* ***зоркі сышліся***» (занатоўка пра выступленне ў Мінску зоркі сусветнай опернай сцэны Хіблы Герзмавы на адкрыцці фестывалю «Уладзімір Співакоў запрашае»); з «Культуры»: «*Сам сабе кантроль* ***па гамбургскім рахунку****...*» (пра беларуску, якая вучыцца на аддзяленні кінематаграфіі ў Гамбургскай вышэйшай школе мастацтваў); «***Самі з вусамі****. Альбо* ***з барадой****?*» (пра ўсталяванне ў Заслаўі недарэчнага з пункту погляду гістарычных фактаў і мастацкага густу трохметровага помніка князю Ізяславу).

Пераключэнне на беларускую мову ў рускамоўным выданні «БелГазета» матывуецца жаданнем аўтараў працытаваць нацыянальна «нагружаныя» паняцці, згадаць сацыяльна і культурна значныя словы, выразы, сітуацыі, падкрэсліць каларыт пэўных рэалій: «*Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі*» (пра візіты Прэзідэнта Беларусі ў Егіпет і Судан), «*Хавайся ў вышыванку!*» (пра Топ-5 культурных трэндаў года), «*Мой дзядзька правіл беззаганных…*» (пра адшуканы беларускі пераклад Алеся Дуда-

ра рамана «Яўген Анегін»). Кодавае пераключэнне з'яўляецца адным з эфектыўных моўных сродкаў рэалізацыі інфармацыйнай, прагматычнай і экспрэсіўнай функцый публіцыстычнага стылю.

Творчы і трапны зварот да прэцэдэнтных феноменаў пры стварэнні загалоўка дае магчымасць зрабіць паведамленне найбольш цікавым і прыцягальным, дазваляе наладзіць унутрытэкставыя сувязі паміж медыятэкстам і прэтэкстам, дыялог паміж журналістам і чытачом, спрыяе актывізацыі ўздзеяння на свядомасць і падсвядомасць чытацкай аўдыторыі. Камунікацыйныя стратэгіі журналістаў розняцца ў залежнасці ад таго, да якога пласта прэцэдэнтнасці яны апелююць. У тэкстах СМІ Беларусі пераважае, на жаль, выкарыстанне калькаваных прыкладаў рускага культурнага кантэксту прэцэдэнтнасці, таму што большая частка грамадства на ўзроўні культурных алюзій сёння знаходзіцца пад уплывам рускага культурнага поля. Уключэнне ў структуру медыятэксту беларускіх цытат, рэмінісцэнцый і алюзій дазваляе стварыць пэўны культурна-гістарычны кантэкст, дапамагае чытачу зразумець сутнасць рэаліі, пра якую распавядаецца ў публікацыі, асэнсаваць падтэкст.

Літаратура

1. Іўчанкаў, В. І. Беларускія СМІ ў сітуацыі білінгвізму: рэтраспектыва і тэндэнцыі развіцця медыямаўлення / В. І. Іўчанкаў // Гісторыя журналістыкі: урокі мінулага і практыка сучасных СМІ : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., 19-20 крас. 2013 г., Мінск / пад агул. рэд. канд. філал. навук дац. П. Л. Дарашчонка. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2013. – С. 124–130.
2. Слышкин, Г. Г. От текста к символу: лингвокультурные концепты прецедентных текстов в сознании и дискурсе / Г. Г. Слышкин. – М. : Academia, 2000. – 128 с.

Ольга Полякова
Ростовский государственный университет путей сообщения (Россия)

СТИЛИСТИЧЕСКОЕ ИСПОЛЬЗОВАНИЕ ФРАЗЕОЛОГИЗМОВ В ПУБЛИЦИСТИЧЕСКИХ ТЕКСТАХ (на примере рекламы и PR-текстов)

Фразеологизмы по целому ряду признаков отличаются от обычных словосочетаний, но являются при этом одним из самых выразительных речевых средств. Они разнообразны по семантике, происхождению, стилистической окраске, чрезвычайно экспрессивны, а образность

толкования делает их незаменимым средством языковой игры автора с адресатом речи. Вследствие этого публицисты постоянно обращаются к фразеологизмам.

В качестве общих функций фразеологизмов можно отметить следующие:

1) *усиление экспрессивной окраски речи.* Речь, насыщенная фразеологизмами, интересна, выразительна, будь она книжная или разговорная;

2) *оживление повествования, создание иронии, пародийной окраски.* Особенно важно разнообразить фразеологизмами речь, воспринимаемую на слух (в том числе официальную, если это допускает регламент выступления), чтобы периодически возвращать внимание уставших слушателей. Хороший каламбур, основанный на фразеологизме, будь то крылатая фраза, интернет-мем, слоган популярной рекламы, заставит аудиторию взбодриться, ваша речь (как вариант – ваш рекламный текст) запомнится;

3) *речевая характеристика персонажей*. Речь, насыщенная фразеологизмами, может стать характерной чертой многих образов. Так, библеизмами часто насыщена речь священнослужителей, сектантов, верующих людей, фразеологизмами, образованными от арготизмов, – речь «сидельцев», карточных шулеров и т. д. Щеголять в процессе коммуникации знанием фразеологизмов может ученый-филолог или профессиональный оратор. Если фразеологизмы звучат естественно, мы охарактеризуем героя как весельчака или мудреца (в зависимости от экспрессивного оттенка устойчивых образных сочетаний слов). Если же они кажутся инородными элементами в речи персонажа, мы можем говорить, что он не тот, кем хочет казаться. Именно в этой функции фразеологизмы могут наиболее продуктивно реализовываться в рекламных и PR-текстах, формируя тот образ, которого ждет целевая аудитория, на который она откликнется, которому поверит [3]. Иными словами, фразеологизмы, наряду с другими речевыми особенностями и элементами, – это «знаки, которые сознательно используются для того, чтобы продемонстрировать собственную принадлежность к той или иной этнической или культурной группе» [2, с. 97].

Функции фразеологизмов, вступающих в лексические взаимоотношения друг с другом, совпадают с функциями их лексических соответствий (максимально точная передача смысла, создание градации и др.), причем неважно, в каком именно публицистическом тексте (газетном, телевизионном, радио- или интернет-тексте, публичной речи) они используются. Так, функции, выполняемые антонимичными фразеологизмами, те же, что и у лексических антонимов (передача контраста сопоставляемых понятий, демонстрация целостности явлений, сменяемости состояний или

ситуаций и т. д.), а фразеологизмы – омонимы и полисемы могут придавать речи экспрессию, выразительность; служить средством языковой игры с реципиентом, а также быть элементом речевой характеристики персонажа, как и соответствующие им лексические единицы.

Фразеологические единицы – очень благодатный материал для использования его в рекламных и PR-текстах. Связано это с их запоминаемостью, общеизвестностью, выразительностью, полифункциональностью. Основная цель публицистических текстов, к которым относятся рекламные и PR-тексты, – воздействие на широкую аудиторию, и фразеологизмы как нельзя лучше помогают ее достичь.

Огромный плюс для автора воздействующих текстов в том, что фразеологизмы чрезвычайно гибки и даже при грамотном видоизменении (а не случайном искажении!) сохраняют свою воспроизводимость. При этом измененные фразеологизмы ложатся в основу каламбуров, шуток, являются элементом игры с читателем, зрителем, слушателем, а любая информация, поданная в юмористическом ключе, усваивается и запоминается лучше. Речь, в меру насыщенная шутками, слушается легче, чем сухая официальная, а ирония и чувство юмора обычно работают на положительный имидж, поэтому фразеологизмы непременно стоит вводить в тексты публичных выступлений, если к этому располагает формат общения.

Однако следует помнить, что использование фразеологизмов должно быть естественно для оратора в обычной жизни. Если же, к примеру, кандидат в политики посещает занятия по риторике, где старательно запоминает теорию и пытается применить ее на практике, но от природы не умеет импровизировать, шутить, то добавление в его речь нехарактерных для него фразеологизмов только подчеркнет его риторическую несостоятельность.

Вводные слова и словосочетания выражают различные оттенки отношений автора высказывания к тому, что он говорит, тем самым передавая личностное отношение к произнесенному: «Вот и в «Журналисте» прочитал, что владелец крупнейшего американского инвестиционного фонда «Bershire Huthaway» Уоррен Баффет считает (*а он, как говорится, в этом деле «собаку съел»*) бизнес-модель интернет-СМИ с бесплатным контентом нежизнеспособной и впредь намерен инвестировать только в печатные издания» (В. Пангаев, редактор еженедельника «Город», г. Балашов); «*Как говорится*, интернет – интернетом, но тактильные ощущения (*надо сказать, весьма современные*) никто в нашем деле не отменял» (И. Ефремов, главный редактор редакционно-издательского государственного автономного учреждения «Газета «Владимирские ведомости»); «*Стало быть*, пользоваться ими не только можно, но и надлежит (*ведь мы живем в правовом государстве*)» (П. Демидов, в разные годы – сотрудник «Журналиста», спецкор газеты «Известия», в настоящее время – главный редактор журнала «Лампада»); «Сегодня в условиях капитализации экономики пресса оказалась под прессом экономической зависимости (*как тут удержаться от пресловутого каламбура!*)» (М. Ненашев, заведующий кафедрой журналистики и массовых коммуникаций Московского госуниверситета им. Ивана Федорова); «*В общем*, рынок печатной прессы на сегодняшний день однозначно является падающим» (Г. Кудий. Популярность интернета достигла предела: Выступление на заседании Альянса в поддержку института подписки на газеты и журналы 16.09.2013); «Ну и, *само собой*, лучше организовывать и проводить подписные кампании, а самой Почте России предпринять исчерпывающие меры по сокращению сроков доставки подписных изданий до потребителей» (Там же). Вводные конструкции – несомненный признак разговорного синтаксиса.

Одним из ярких средств выразительности являются эпитеты. Не обошли вниманием художественные определения и авторы статей в журнале «Журналист». Приведем примеры. «Журналист» никогда не снижал планку, это лучший друг не только для журналистов, но и для всех, кто любит и ценит *острую* и *точную* мысль» (В. Игнатенко, председатель Временной Комиссии Совета Федерации по вопросам совершенствования законодательства Российской Федерации о средствах массовой информации); «…этот первый вековой рубеж был лишь началом *долгой* и *успешной* жизни журнала» (Д. Гудков, депутат Государственной Думы РФ); «Секрет вашего успеха – в *достоверной* и *яркой* подаче материала, умении интересно освещать события в России и мире» (А. Горбенко, заместитель мэра Москвы в Правительстве Москвы по вопросам региональной безопасности и информационной политики); «Нельзя не вспомнить Константина Симонова, Илью Эренбурга, Михаила Кольцова и многих-многих других, чьи имена навеки останутся в *золотом* фонде отечественной журналистики и отечественной литературы» (Е. Е. Пиетиляйнен, главный редактор литературно-художественного и общественно-политического журнала «Север»). В данных примерах эпитеты межстилевые.

Такое образное средство, как метафора, призвано привлечь внимание читателя, пробудить его воображение, поэтому это излюбленный троп для авторов журнала «Журналист». Приведем примеры. «*Удача – дама ветреная*, но я желаю вашему изданию и каждому из вас в отдельности ее *настойчивого благоволения*» (С. Железняк, заместитель Председателя Государственной думы РФ); «Поддерживайте сохраняющееся *пространство мысли* – не изменяйте себе» (А. Пушков, депутат Государственной Думы РФ, председатель комитета ГД по международным делам); «И каждый день вы рядом, чтобы объединять, поднимать творческий дух, учить и учиться, поддерживать, дружить и быть одним из тех *китов*, на которых держится отечественная журналистика» (А. Теребунова, ИД «Околица», Краснодар); «Очень расхожий сегодня *паразит*, но до чего удобен: не *парься* в поисках утраченного времени (Марсель Пруст), вставь это самое *как бы* – и вся недолга» (П. Демидов, в разные годы – сотрудник «Журналиста», спецкор газеты «Известия», в настоящее время – главный редактор журнала «Лампада»); «Но в профессиональном органе, и так находившемся несколько в сторонке от *стремнины* идеологической *трескотни*, я нашел благодатный *закуток*, откуда меня трудно было вытащить на «громкоговорящую» трибуну»

(А. Щербаков, публицист, главный редактор интернет-журнала «Обыватель»); «Особенно любезен сердцу был придуманный мной «Клуб молодого журналиста», куда потянулись и юные редакционные *побеги*, и наиболее животворные *ростки* с журфаков» (Там же). Наряду с межстилевыми метафорами встретились как разговорные, так и книжные, что подтверждает наше предположение о смешении разностилевых языковых элементов как характерной черте современного дискурса СМИ.

Итак, вышеобозначенные стилистические особенности публицистического текста являются отражением социокультурных процессов в дискурсе средств массовой информации и призваны обозначить как состояние языка в отдельном стиле, так и тенденции развития языка в целом.

Литература

1. Бабосов, Е. М. Социология управления : учеб. пособие (для системы корпоративной учебы) / Е. М. Бабосов, В. П. Бабкин, А. К. Мамедов ; МПО ОАО «Газпром», Социологический фак-т МГУ им. М. В. Ломоносова. – М. : МАКС Пресс, 2012. – 310 с.
2. Бабосов, Е. М. Социология науки (учебное пособие для бакалавров) / Е. М. Бабосов, А. К. Мамедов ; Московский гос. ун-т им. М. В. Ломоносова, Социологический фак-т. – М. : МБА, 2011. – 216 с.
3. Бабосов, Е. М. Развитие неопарсонсианства на рубеже XX–XXI в. / Е. М. Бабосов, А. К. Мамедов, Н. А. Панич // Вестник Московского университета. Серия 18: Социология и политология. – 2015. – № 3. – С. 5–23.
4. Киричёк, П. Н. Гуманитарный дискурс: продолжение спора / П. Н. Киричёк // Научный вестник Кубанского государственного университета. Медиакоммуникация. – 2016. – № 2 (3). – С. 81–83.
5. Киричёк, П. Н. Духовная культура и массовая информация: феномен сиамских близнецов / П. Н. Киричёк // Вопросы культурологи. – 2010. – № 1. – С. 16–21.
6. Киричёк, П. Н. Массмедийный дискурс этнополитической коммуникации / П. Н. Киричёк // Коммуникология. – 2016. – Т. 4. № 1. – С. 29–41.
7. Шилина, С. А. Управленческий дискурс как технология коммуникации в системе отношений государства и общества : дис. … д-ра социол. наук / С. А. Шилина. – М., 2015. – 311 с.
8. Щербин, В. К. Постановка предельных проблем в различных отраслях знаний как показатель растущей строгости жизненного мира личности и общества / В. К. Щербин // Вестник Белорусского государственного университета. Сер. Социология. – 2017. – № 1. – С. 19–35.

РАЗДЗЕЛ VII

ЖУРНАЛІСТЫКА Ў КАНТЭКСЦЕ ПРАЦЭСАЎ ГІСТОРЫІ І СУЧАСНАСЦІ

Інга Воюш
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

МЕТАДЫЧНЫ АППАРАТ ВУЧЭБНАГА ВЫДАННЯ ПА ГІСТОРЫІ САЦЫЯЛЬНАЙ КАМУНІКАЦЫІ

Пытанні методыкі выкладання ў вышэйшай школе, асабліва па новых сучасных напрамках падрыхтоўкі, застаюцца актуальнымі. Гэта можна аднесці і да вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя сацыяльнай камунікацыі» для спецыяльнасці «Інфармацыя і камунікацыя».

Сярод метадычных асаблівасцяў дысцыпліны можна назваць наступныя: 1) дысцыпліна з'яўляецца адной з базавых і ўваходзіць у дзяржаўны кампанент навучальных планаў, 2) звязана з такімі профільнымі дысцыплінамі, як «Тэорыя камунікацыі», «Тэорыя і практыка сувязяў з грамадскасцю» і «Тэорыя і практыка рэкламы», 3) мае на мэце фарміраванне ў студэнтаў цэласнай карціны развіцця тэхналогій, сістэм сэнсаў і мадэляў сацыяльнай камунікацыі. Акрамя гэтага, вынікам навучання павінна стаць авалоданне студэнтамі шэрагам акадэмічных кампетэнцый – прымяняць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач, валодаць даследчымі навыкамі, міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем, мець развітыя лінгвістычныя навыкі (вусная і пісьмовая камунікацыя).

Пералічаныя акалічнасці патрабуюць уважлівай тэарэтычнай распрацоўкі курса і адпаведнага метадычнага забеспячэння. Для ўстаноў вышэйшай адукацыі найбольш мэтазгодна стварэнне падручнікаў, дапаможнікаў або вучэбна-метадычных комплексаў, якія мусяць утрымліваць эфектыўны метадычны апарат. Ён дасць магчымасць студэнтам адэкватна зразумець і трывала засвоіць матэрыял.

Традыцыйна структура метадычнага апарату звязваецца з этапамі засваення матэрыялу. Разгледзім яе на прыкладзе класіфікацыі

Т. Грыгор'евай [2]. Даследчыца ўключае ў яго тры кампаненты: карэктыўна-ўводны, базісна-тэматычны,аглядава-заключны.

Вядучым для карэктыўна-ўводнага кампанента з'яўляюцца прынцыпы значнасці для вывучаемай тэмы і трываласці ведаў. Ён можа складацца з вызначэння мэты і задач заняткаў, прапанавання гіпотэзы, пастаноўкі праблемнага пытання (прыкладу, практычнай задачы), аналізу / агляду актуальнай сітуацыі, пытанняў – па раней вывучаных тэмах, звязаных з актуальнай, на прыпамінанне, сістэматызацыю, на ўстанаўленне міжпрадметных сувязяў.

Для базісна-тэматычнага кампанента найважнейшы крытэрый – важнасць ведаў як для разумення актуальнай тэмы, так і для наступных, а таксама для вывучэння сумежных дысцыплін. Для яго мае значэнне даступны выклад тэксту параграфа, лагічнае структураванне матэрыялу ў межах параграфа, раздзела, главы, яго афармленне (пункты, маркірваныя спісы, шрыфтавое і каляровае выдзяленне, блокі, урэзкі), наяўнасць даведачнага апарату – спасылак на крыніцы, слоўнікі, біяграфічных звестак у манаграфічных тэмах, ілюстрацыйнага матэрыялу – схем, карт, табліц, графікаў, дыяграм, дадаткаў, алгарытмаў, памятак, вытрымак з гістарычных дакументаў, канкрэтных прыкладаў і іх аналізу, фотаздымкаў, малюнкаў, а таксама QR-кодаў, у электронным даведніку – спасылак на электронныя рэсурсы.

Аглядава-заключны кампанент прадугледжвае следаванне прынцыпам цэласнасці, структурнасці, іерархічнасці і дынамічнасці. Для аглядава-заключнага кампанента ўласцівы паслядоўныя пытанні: а) на веданне матэрыялу, б) на разуменне асноўных паняццяў, 3) на практычнае валоданне ведамі, г) на творчае прымяненне вывучанага. Задачы структуравання і іерархізацыі матэрыялу бярэ на сябе ўжо разгледжаны апарат арыенціроўкі – спецыяльныя знакі, якія паляпшаюць навігацыю па тэксце, указваюць на неабходнасць запамінання матэрыялу, абавязковасць / неабавязковасць выканання заданняў, узровень іх складанасці, адлюстраванне загалоўкаў главы (раздзела) на палях, а для электронных выданняў – унутраная пералінкоўка, аўтаматычны змест. Апошнімі традыцыйна размяшчаюцца заданні на абагульненне матэрыялу – дапоўніць звесткамі гатовую схему і пабудаваць уласную, запоўніць табліцу, стварыць кантрольны тэст, віктарыну, квест, красворд і іншае па тэме, аднавіць парадак выкладу думак, выканаць творчы праект.

Лагічным працягам аглядава-заключнага звычайна становіцца апарат кантролю – кантрольныя пытанні, тэсты, заданні для кіруемай са-

мастойнай работы, практычныя і творчыя заданні, кейсы, сітуацыі для аналізу або задачы, праекты, пералікі пытанняў да выніковай атэстацыі (экзамену / заліку).

У якасці дапаможнага (звычайна ў вучэбна-метадычным комплексе) можа выступаць інфармацыйны кампанент – праграма па дысцыпліне, тэматычнае планаванне, прыкладны пералік тэм практычных заняткаў / семінараў, тэматыка рэфератаў, электронныя прэзентацыі па тэмах, шкала ацэнкі вучэбных дасягненняў.

Зыходзячы з адзначанага, прааналізуем у табліцы, як ажыццёўлена метадычнае суправаджэнне ў вучэбных выданнях розных жанраў па асновах інфармацыйна-камунікацыйнай дзейнасці (раздзелах, прысвечаных гісторыі пытання) – В. Фурс «Гісторыя навук аб інфармацыі і камунікацыі» (вучэбны дапаможнік), С. Катліп «Паблік рылейшнз. Тэорыя і практыка» (падручнік), В. Каралько «Асновы паблік рылейшнз» (падручнік), Э. Галумаў «Асновы PR» (падручнік), В. Шпакоўскі «Гісторыя сувязяў з грамадскасцю» (электронны падручнік).

Метадычны апарат вучэбных выданняў

Аўтар(ы), выданне	Кампаненты метадычнага апарату			
	карэктыўна-ўводны	базісна-тэматычны	аглядава-заключны	апарат кантролю
Фурс (Беларусь), Гісторыя навук аб інфармацыі і камунікацыі [5]	уводзіны	тэкст параграфаў, даведачны апарат (гады жыцця першапраходцаў, выхаду кніг)	заключэнне	–
Катліп, Сенцер, Брум (ЗША), Паблік рылейшнз. Тэорыя і практыка [3]	эпіграфы да глаў, уводзіны да тэмы, мэты вывучэння тэмы	падзел на тэмы і падтэмы, апарат арыенціроўкі (дубляванне загалоўка главы на палях), даведачны апарат (спасылкі на крыніцы, біяграфічны матэрыял, спісы літаратуры і дадатковых крыніц), ілюстрацыі – зрокавыя (фотаздымкі, схемы, партрэты), тэкставыя (дакументы, цытаты, прыклады)	стужка часу	–

Каралько (Украіна) Асновы паблік рылейшнз [4]	уводзіны	тэкст параграфа,падзел на тэмы, апарат арыенціроўкі (на палях), ілюстрацыйны матэрыял (статыстычныя дадзеныя, табліцы)	–	–
Галумаў (Расія) Асновы PR [1]	уступнае слова	тэкст параграфа, падзел на тэмы, дыдактычна абумоўленая вёрстка, даведачны апарат (кароткія біяграфічныя звесткі, гістарычныя факты), ілюстрацыйны матэрыял (цытаты, фотаздымкі, рэпрадукцыі, малюнкі), апарат арыенціроўкі (выдзяленне шрыфтамі, колерам, даведкі на палях)	–	–
Шпакоўскі, Шпакоўская (Расія) Гісторыя сувязяў з грамадскасцю [6]	уводзіны	тэкст параграфа, даведачны апарат (пазначэнне гадоў жыцця дзеячаў, спасылкі на крыніцы, спіс літаратуры, рэкамендаваных перыядычных выданняў)	высновы па главах, заключэнне, рабочая праграма, тэмы і пытанні семінарскіх заняткаў	пытанні для самаатэставання, шкала ацэнкі вынікаў

У прыведзенай табліцы можна назіраць пераважную адсутнасць кантрольнага і аглядава-заключнага кампанентаў метадычнага апарату ў названых выданнях, а таксама згорнуты карэктыўна-ўводны кампанент і лаканічны базісна-тэматычны. Пры гэтым найлепш распрацаваны базісна-тэматычны блок у падручніку С. Катліпа, ён можа стаць узорам для іншых дапаможнікаў па дысцыплінах спецыяльнасці «Інфармацыя і камунікацыя».

Такім чынам, заўважым, што мадэляванне сучаснага падручніка па гісторыі сацыяльнай камунікацыі – гэта не толькі даходлівае данясенне да студэнтаў праграмнага матэрыялу, але і ўдумлівая арганізацыя метадычнага апарату.

Літаратура

1. Галумов, Э. Основы PR / Э. Галумов. – М. : Летопись XXI, 2004. – 408 с.
2. Григорьева, Т. Методический аппарат школьного учебника геометрии как средство систематизации знаний учащихся : автореф. дис. ... канд. пед. наук / Т. Григорьева ; ЯГПИ им. К. Д. Ушинского. – Ярославль, 1982 [Электронный

ресурс]. – Режим доступа : http://www.dissercat.com/content/metodicheskii-apparat-shkolnogo-uchebnika-geometrii-kak-sredstvo-sistematizatsii-znanii-ucha#ixzz4rmfiUcMH. – Дата доступа : 22.08.2017.
3. Катлип, С. Паблик рилейшенз. Теория и практика : учеб. пособие / С. Катлип, А. Сентер, Г. Брум ; пер. с англ. – М. : Вильямс, 2001. – С. 132–179.
4. Королько, В. Основы паблик рилейшнз / В. Королько. – М. : Рефл-бук ; Киев : Ваклер, 2000. – С. 46–87.
5. Фурс, В. История наук об информации и коммуникации : учеб. пособие / В. Фурс. – Минск : БГУ, 2001. – С. 66–124.
6. Шпаковский, В. История связей с общественностью : учеб. пособие / А. Шпаковский, С. Шпаковская. – Пенза : ПГУ, 2004. – 132 с.

Виктория Георгиевская
Киевский национальный университет им. Т. Шевченко (Украина)

ПАРТИЙНАЯ ПЕЧАТЬ КАК ФАКТОР АКТИВИЗАЦИИ НАЦИОНАЛЬНО-КУЛЬТУРНОГО ВОЗРОЖДЕНИЯ УКРАИНЫ НАЧАЛА XX ВЕКА

Партийная пресса в Украине имеет давние традиции – со времени распространения социалистических идей во второй половине XIX в., когда демократически нацеленная украинская молодежь искала пути политического будущего, пропагандировала новые идеи на страницах печати. Поколение передовых публицистов – М. Драгоманова, С. Подолинского, И. Франко, М. Павлика и др., которые стремились приспособить европейские ориентиры свободного развития народов и справедливого государственного устройства к национальным идеалам, – характеризовали как личностей, сочетающих завещания «украинской Библии» – «Кобзаря» Т. Шевченко и идеологические принципы «Капитала» К. Маркса. От создания Руско-украинской радикальной партии в Галиции (1890) и ее периодических органов как «рупоров» этой партии («Народ», «Хліборобъ») начинается развитие партийной прессы на украинских землях.

В начале XX в. национальная партийная жизнь активизировалась и на территории Восточной (Надднепрянской) Украины в пределах Российской империи, где создаются несколько партий: Революционная украинская партия (РУП), Украинская народная партия (УНП), Украинская демократическая партия (УДП), Украинская радикальная партия (УРП), Украинская социал-демократическая партия (УСДРП), программы и названия которых частично соприкасаются с теми идеалами, которые уже были фундаментально заложены в деятельности западноукраинских политических организаций и их изданий. Проукраинские идеи

изложены на страницах газет и журналов «Вільна Україна», «Слово», «Боротьба», «Шершень», «Дзвін» и др.

Немало национальных государственных и общественных деятелей конца XIX – начала XX в., в эпоху революционных трансформаций, были вовлечены в партийную деятельность, становились активными творцами партийной прессы (М. Грушевский, В. Винниченко, С. Петлюра, Д. Донцов, С. Ефремов, М. Михновский, А. Никовский и др.).

Потребность в партийной печати особо проявляется в периоды обостренных политических ситуаций, переворотов, назревания революционных ситуаций. Так, в Киеве с 1900 по 1917 г. заявили о своем существовании более 30 партийных изданий, преимущественно социалистического направления, отстаивая позиции таких партий, как УСДРП, Партия социалистов-революционеров, Украинская партия социалистов-революционеров, Украинская партия социалистов-федералистов и др. («Воля», «Нова громада», «Робітнича газета», «Народна воля», «Народнє слово»). Хронике и публицистике отводилась важная роль в донесении основных идей своих лидеров к массам. На страницах партийных газет не только поднимались актуальные вопросы «Что дальше?», но и обсуждались перспективные ответы: потребность отстаивать интересы «социально оскорбленного рабочего класса», бороться за «чистоту украинской идеи», нацеливать на создание национально-территориальной автономии – таковы были основные задачи.

Интересы национально-культурного возрождения отстаивали не только украинские партии, но и еврейские (Еврейская социалистическая партия, Бунд, Партия «Идиш фолкспартей», «Поалей Цион»), польские (Польское социалистическое объединение, Польский демократический центр), чешские (Чехословацкая социал-демократическая рабочая партия), румынские и другие политические объединения социалистического направления, девизом которых были слова «Пролетарии всех стран, соединяйтесь!». Идеи революционной перестройки и национального развития рассматривались на страницах польских и чешских изданий в Киеве («Sprawa Robotnicza», «Revoluce», «Svoboda», «Jedność Robotnicza»), румынских в Одессе («Depeşa», «Lupta», «Vestitorul»), еврейских изданий в Полтаве, Киеве, Одессе, Харькове («Еврей избиратель», «Еврейская рабочая хроника», «Еврейский социалист», «Унзер лебен», «Единение» и др.).

Возрождение многопартийной прессы, как свидетельствуют уроки прошлого, связано с переломными моментами в политической, духовной и общественной жизни страны. Второй волной после периода национально-освободительного движения 1917–1920 гг. стали процессы

легализации и обновления конца 80-х гг. XX в. Фундамент будущей независимости Украины создавался и обсуждался на страницах альтернативной, национально-демократической печати, способствующей пробуждению свободы слова. Народный Рух Украины, Украинская республиканская партия, Украинская национальная партия, Либеральная партия и др. на протяжении 1989–1991 гг. создали более 300 периодических изданий, большинство из которых способствовали пробуждению национального самосознания в период «перестройки» («Відродження», «Вибір», «Вільна земля», «Воля», «Голос громадянина», «За незалежність», «Наша віра», «Думка», «Наш Рух» и т. д.).

В Едином государственном реестре политических партий Украины в начале 2017 г. насчитывалось более 350 названий политических объединений, созданных за последние 25 лет, среди них – партии-однодневки и те, которые продолжают традиции своих предшественников; некоторые издают печатные СМИ, другие с целью информации и пропаганды используют мультимедийные средства. Лидерами в информационном партийном пространстве сегодня являются политические партии «Солидарность. Блок Петра Порошенко» (одноименная газета, сайт), Всеукраинское объединение «Батьківщина» (всеукраинское и региональные издания с ключевым словом «Батьківщина»), Всеукраинское объединение «Свобода» (радио, всеукраинская газета «Свобода» и региональные СМИ), Конгресс украинских националистов (газета «Нація і держава»), партия «Удар» Виталия Кличко (газета «Кличко мер») и др. Интенсивность регистрации новых печатных партийных СМИ, как и активизация политической и информационно-пропагандистской деятельности партийных медиа возрастает во время подготовки к выборам разного уровня.

Пётр Дарашчонак
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

ГАЗЕТА А. КІРКОРА І М. ЮМАТАВА «НОВОЕ ВРЕМЯ» (Санкт-Пецярбург, 1868–1871 гг.) АБ ПРАБЛЕМАХ І ПЕРСПЕКТЫВАХ КУЛЬТУРНА-НАЦЫЯНАЛЬНАГА РАЗВІЦЦЯ ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯГА КРАЮ

У пачатку 2018 года спаўняецца 200 гадоў з дня нараджэння Адама Кіркора – этнографа, археолага, гісторыка, грамадскага дзеяча, які ўвайшоў у гісторыю айчыннай журналістыкі як выдатны публіцыст і арганізатар выдавецкай справы, рэдактар альманахаў «Radegast» (1843),

«Pametniki Umuslowe» (1845–1846), «Teka Wilenska» (1857–1858), «Na dzis» (1872), «Teka Krakowska» (1884) газет «Kurjer Wilenski» (1860–1865), «Новое время» (1868–1871). Гісторыя і дзейнасць газеты «Новое время», заснаванай 150 гадоў таму, выклікае сёння асаблівую цікавасць, бо на яе старонках А. Кіркор паўстае ўжо сталым публіцыстам, які ахвярна працаваў на карысць Бацькаўшчыны, не зважаючы на крытыку і пагрозы апанентаў з розных палітычных лагераў, ігнаруючы нават магчымае фінансавае банкруцтва.

Як адзначае І. Запрудскі, у віленскі і варшаўскі перыяды выданні А. Кіркора ўжо «мелі рэгіянальны літоўска-беларускі характар, тэматычна былі звязаны з грамадскімі і культурнымі праблемамі мясцовага жыцця, абуджалі ў чытачоў пачуццё патрыятызму і ў пэўнай ступені накіроўвалі развіццё літаратуры ў краі. Пішучы па-польску і па-руску (па няпэўных звестках і па-беларуску), вучоны лічыў сябе ліцвінам, у адной з публікацый называў сябе "не прыроджаным палякам, а беларусам"» [1].

Каб максімальна адпавядаць статусу сталічнага выдання і не адставаць ад канкурэнтаў («Неделя», «Москва», «Всеобщая газета», «Деятельность» і інш.), А. Кіркор і М. Юматаў імкнуліся усебакова адлюстроўваць на старонках газеты «Новое время» не толькі ўнутранае жыццё Расійскай імперыі, але і падзеі ў Еўропе і свеце. Газета «Новое время» выходзіла ў Пецярбургу амаль пяць дзесяцігоддзяў (1868–1917) і менавіта літоўска-польскаму навукоўцу і літаратару А. Кіркору сумесна з М. Юматовым выпала пачэсная роля першапраходцаў у асвятленні вострых праблем заходніх расійскіх губерняў. Атрымаўшы 21 кастрычніка 1867 г. дазвол, выдаўцы пачалі выпускаць яе ў свет з 2 студзеня 1868 г. Выданне, якое мела праграму толькі палітычнай і літаратурнай газеты, выходзіла 5 разоў на тыдзень на чатырох старонках.

Асобныя расійскія аўтары нават сёння прытрымліваюцца думкі, что А. Кіркор заснаваў газету для падтрымкі палякаў, якія падвергліся розным ганенням пасля паўстання 1863–1864 гг. Вопытнага публіцыста, якім з'яўляўся А. Кіркор, зразумела, не магло не хваляваць тое складанае становішча, у якім апынулася Каралеўства Польскае ў другой палове XIX ст., але не менш яго турбавалі праблемы развіцця ўкраінскага і беларуска-літоўскага рэгіёнаў. Першы перадавы артыкул, прысвечаны праблеме абрусення насельніцтва Паўднёва-Заходняга краю, быў апублікаваны ў № 8 за 12 студзеня 1868 г.

Выхад газеты «Новое время» быў станоўча ўспрыняты перадавой інтэлігенцыяй у Вільні, якая лічыла шкодным далейшы працяг рэпрэсіўнага курсу віленскіх генерал-губернатараў – М. Мураўёва

і яго пераемніка генерала К. Фон Каўфмана. У карэспандэнцыі «Из Северозападного края» выказваліся спадзяванні на тое, што газета будзе падтрымліваць мясцовыя палітычныя эліты ў наладжванні супрацоўніцтва з расійскімі ўладамі: «Да настанет же **новое время** и да будет ваш орган посильным его поборником. Иная задача для нас немыслима» [7]. Аўтар публікацыі, безумоўна, з'яўляўся выразнікам той часткі грамадскасці Віленскага краю, якая марыла вывесці вялікі нацыянальны рэгіён са стану шматгадовай нестабільнасці, даць яму шанс развівацца культурна і маральна, вырашыць эканамічныя, канфесійныя, адукацыйныя і іншыя праблемы.

Лібералізацыю ўрадавага курсу ў дачыненні да польскай грамадскасці «Заходняга краю», якая пачалася ў другой палове 60-х гг., варожа ўспрынялі расійскія кансерватары. Як адзначаў А. Кіркор, у Віленскім павеце пры вяртанні былых уніятаў у праваслаўе «так званая клерыкальная партыя не заўсёды прытрымлівалася памяркоўнасці і той разважнай стрыманасці, якімі заўсёды вызначалася наша праваслаўнае духавенства у справах сумлення» [3]. А. Кіркор не аднойчы рабіў на старонках газеты экскурсы ў мінулае Беларусі, каб паказаць расійскаму чытачу ўсе складанасці рэлігійнага жыцця краю ў часы ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Газета не стаяла ў баку і ад вострых пытанняў міжнацыянальных адносін, паслядоўна адстойваючы раўнапраўе грамадзян Расійскай імперыі незалежна ад нацыянальнасці. Разглядаючы пытанне аб будучай гарадской рэформе, рэдактар у адным з перадавых артыкулаў прапанаваў даць роўныя правы пры вырашэнні грамадскіх спраў яўрэям у гарадах заходняй і паўднёвай Расіі, грэкам у Керчы, армянам і татарам у Астрахані, малдаванам у Бендэрах, якія дагэтуль падвяргаліся дыскрымінацыі ў параўнанні з праваслаўнымі хрысціянамі [4].

Дэмакратычныя выданні С.-Пецярбурга і Масквы аказвалі значны ўплыў на фарміраванне поглядаў часткі расійскай грамадскасці, якая па-рознаму ўспрымала праблемы так званага «абрусення» і рэфармавання адукацыі ў заходніх губернях. Думкі А. Кіркора аб шляхах развіцця народнай адукацыі ў Паўночна-Заходнім краі былі ў многім сугучнымі з публікацыяй аўтара, які выступіў пад псеўданімам «Виленский старожил» у № 18 «Московскіх ведомостей» за 1868 г. Распачатае М. Мураўёвым стварэнне рускіх школ не атрымала далейшага працягу і развіцця з-за адсутнасці разумення народнага духу і побыту беларускіх сялян, а галоўнае – «грубасць і амаральнасць многіх з настаўнікаў, папуста рэвізораў зрабілі тое, што колькасць народных школ значна паменшылася і тысячы выхаванцаў пакінулі школы» [5]. Увогуле

палітыку прымусу ў заходнім рэгіёне Расійскай імперыі рэдактар лічыў неэфектыўнай і памылковай. «Гістарычны вопыт паказвае, – адзначалася ў адным з рэдакцыйных артыкулаў, – што рэпрэсіўнымі сродкамі нельга знішчыць стваральнай працы стагоддзяў» [2, с. 65]. Дарэмнымі былі высілкі асобных дзеячаў, якія хацелі за 2-3 гады перамяніць веравызнанне і родную мову мільёнаў людзей.

А. Кіркор з горыччу пісаў на старонках газеты і аб няўдалых выніках «разбору шляхты». Былыя чыноўнікі каталіцкага веравызнання, арандатары, сагнаныя з зямлі, беззямельныя шляхцічы станавіліся «пралетарыямі» без будучыні, ім па рэлігійна-палітычных прычынах не знаходзілася адпаведнага месца ў рамках новых расійскіх парадкаў. Спадзеючыся на вырашэнне многіх нявырашаных рэлігійных і гаспадарчых праблем, А. Кіркор нават вітаў на старонках газеты прызначэнне генерал-ад'ютанта А. Л. Патапава на пасаду віленскага генерал-губернатара [6].

Але кардынальныя рашэнні ўрада у дачыненні да Паўночна-Заходняга краю так і не былі прыняты. А. Кіркор, які спачуваў усяму прагрэсіўнаму, гуманнаму, талерантнасці рэлігій, адстойваў раўнапраўе ўсіх грамадзян незалежна ад паходжання, прызнаваў за жанчынамі і ніжэйшымі станамі ўсіх правоў, пратэставаў супраць невуцтва і самавольства, сваімі публікацыямі выклікаў толькі рост нездавальнення ў вышэйшых урадавых колах.

27 лістапада 1868 г. за «рэзкія і непрыстойныя» водгукі і меркаванні аб нездавальняючых метадах кіраўніцтва ў Царстве Польскім і заходніх губернях газеце А. Кіркора і М. Юматава была аб'яўлена першая перасцярога. 14 сакавіка 1869 г. за востры фельетон у № 46 – другая. Затым газету забаранілі для рознічнага продажу. Апошнім ударам па рэдакцыі стала трэцяя перасцярога і спыненне выхаду выдання на шэсць месяцаў. Гэта была ўжо фінансавая катастрофа. А. Кіркор выпусціў апошні № 27 у 1871 г. і прыступіў да ліквідацыі сваёй выдавецкай справы, за ім сталася банкруцтва і ад'езд з Расіі ў Кракаў, які тады ўваходзіў у склад Аўстра-Венгрыі.

Літаратура

1. Запрудскі, І. «Заваяваць сабе свабоду…». Адам Кіркор (1818–1886) / І. Запрудскі // Настаўніцкая газета. – 2002. – 7 вер.
2. Смалянчук, А. Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г. / А. Ф. Смалянчук. – СПб. : Неўскі прасцяг, 2004. – 406 с.
3. С.-Петербург, 29-го января [Передовая] // Новое время. – 1868. – № 21. – 30 янв.

4. С.-Петербург, 5-го февраля [Передовая] // Новое время. – 1868. – № 25. – 5 февр.
5. С.-Петербург, 5-го февраля [Передовая] // Новое время. – 1868. – № 26. – 6 февр.
6. С.-Петербург, 4-го марта [Передовая] // Новое время. – 1868. – № 46. – 5 марта.
7. С. С. Из Северозападного края / С. С. // Новое время. – 1868. – № 9. – 13 янв.

Дмитрий Дроздов
Белорусский государственный университет

СПЕЦИФИКА АДМИНИСТРАТИВНОГО МЕНЕДЖМЕНТА СМИ

Административный менеджмент как искусство и наука разработки и принятия управленческих решений, распределения заданий между исполнителями и контроля их исполнения является основной сферой деятельности аппарата управления – совокупности должностных лиц и органов, возглавляющих организацию. Общие черты и отличия, присущие материальному и духовному производству, определяют и особенности управленческой деятельности в медиабизнесе.

Прежде всего необходимо отметить, что работа менеджера средств массовой информации объединяет такие виды деятельности, как управленческая, редакторская и творческая. Кроме традиционных функций управления администрация СМИ во внешней среде несет ответственность и за его контент, поэтому редактирование как отдельных материалов, так и целых выпусков является безусловной обязанностью руководства. В подавляющем большинстве случаев администрацию представляют сделавшие профессиональную карьеру журналисты, работники смежных сфер духовного производства, которые сами продолжают выступать в качестве творческих личностей.

Поскольку любая редакция представляет собой творческий коллектив, то деятельность администрации СМИ объективно приобретает индивидуально-коллективный характер [1]. В модернизации творческой концепции, стратегическом и текущем планировании, других мероприятиях, направленных на оптимизацию функционирования медиа, принимает участие большинство сотрудников, поэтому мастерство менеджера заключается в умении сочетать собственную политику с совокупным мнением коллектива. Так как администрация СМИ руководит производственно-творческой деятельностью, то особое значение приобретает владение ею технологиями творческого менеджмента и менеджмента творчества.

В современных условиях постоянное внимание административных работников направлено на совершенствование структуры, состава и величины редакционного коллектива. Общий тренд здесь заключается в создании новых технологических, рыночных отделов, объединении, укрупнении существующих подразделений, а зачастую и в отказе от некоторых устаревших, не отвечающих вызовам времени отделов редакции. Все это ведет к уменьшению количества уровней в редакционной структуре, что способствует более эффективной внутриорганизационной коммуникации. В контексте создания медиахолдингов следует рассматривать переход к так называемой дивизионной структуре, когда администрации подразделений передается не только управление его коллективом, планирование деятельности, контроль результатов, но и большая автономия в выработке и реализации финансовой политики.

Администрация редакции – важнейшая структура, обеспечивающая устойчивое функционирование средства массовой информации, Она действует в соответствии с Конституцией (Основным Законом) Республики Беларусь, законом «О средствах массовой информации», другими законодательными актами и уставом редакции. Следует понимать различия между администрацией и менеджерами СМИ. В состав администрации могут не входить руководители некоторых, главным образом технических, подразделений нижнего уровня. С другой стороны, в состав администрации входят все сотрудники, обеспечивающие функционирование руководителей верхнего уровня управления.

Современные научные методы управления редакцией можно подразделить на несколько взаимосвязанных категорий [2]. Правовые методы управления базируются на национальных правовых актах, подзаконных ведомственных постановлениях, юридических документах для внутреннего пользования. Редакционная политика редакции (выработка и реализация планов работы, издание приказов, распоряжений, использование других форм управления) определяет политические методы руководства администрацией сотрудниками. К числу основных следует отнести экономические методы управления, которые включают в себя широкий спектр средств материального поощрения, в первую очередь денежного.

Достаточно специфической сферой являются психологические методы управления. Они представляют собой целую систему мероприятий, направленных на формирование и развитие трудового коллектива, моральное поощрение или наказание, психологическое влияние, отбор и обучение персонала, гуманизацию производственных и межличност-

ных отношений, профилактику и устранение конфликтов, формирование оптимальных малых групп (отделов и других подразделений, члены которых психологически хорошо совместимы).

Традиционно к административным методам работы относят и организационные: моделирование структуры редакции и работы коллектива, стратегическое и текущее планирование деятельности редакции, координация взаимодействия различных структурных подразделений и отдельных сотрудников, нормирование труда работников и учет его результатов, контроль и проверка исполнения. Использование всего комплекса методов административного управления позволяет достигнуть оптимальных результатов в деятельности редакции.

Оценивая роль административного менеджмента в системе современных технологий управления медиакомпанией, следует отметить, что наряду с эвристическим, инновационным и другими наиболее актуальными направлениями развития теории и практики управления школа административного менеджмента продолжает занимать центральное место в обеспечении эффективного функционирования системы массовой коммуникации.

Литература

1. Гуревич, С. Газета: вчера, сегодня, завтра : учеб. пособие / С. Гуревич. – М. : Аспект Пресс, 2004. – 288 с.
2. Понятие и виды методов управления // NewInspire [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://newinspire.ru/l/3/33/759-ponyatie-i-vidy-metodov-upravleniya.html. – Дата доступа : 01.09.2017.

Наталля Зубчонак
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

ГАЗЕТА «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» У КАНТЭКСЦЕ ПАДЗЕЙ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны пачалася перабудова дзейнасці друкаваных сродкаў масавай інфармацыі. Узніклі праблемы з выпускам і распаўсюджваннем газет і часопісаў. 24 чэрвеня 1944 г. у выніку бамбардзіроўкі Мінска была разбурана друкарня «Звезда», у якой друкавалася большасць рэспубліканскіх газет. На непрацяглы час іх выпуск быў пераведзены ў абласныя друкарні. Аднак даволі хуткае наступленне нямецкіх войскаў вымусіла спыніць выхад галоўных рэспубліканскіх газет «Звязда» і «Советская Белоруссия», а таксама іншых выданняў.

21 верасня 1941 г. ЦК КП(б)Б прыняў пастанову аб выхадзе газеты «Савецкая Беларусь» – органа ЦК і Мінскага абкама КП(б)Б. Першы нумар быў надрукаваны ў Арле 9 кастрычніка 1941 г. Праз некаторы час выданне было пераведзена ў Казань, а з 1942 г. газета стала друкавацца ў Маскве ў друкарні «Известия» [1, с. 272–273].

Па сутнасці, у перыяд Вялікай Айчыннай вайны «Савецкая Беларусь» замяніла «Звязду». Першы выпуск газеты меў двайную нумарацыю № 1 (7101 – чарговы нумар «Звязды»). Спачатку газета друкавалася на дзвюх палосах, пазней на чатырох. Перыядычнасць складала 1 раз на тыдзень. У 2-й палове 1942 г. колькасць нумароў павялічылася ў сярэднім да 10 разоў у месяц. Да 1943 г. газета выходзіла на беларускай мове.

Вакол выдання аб'ядналіся лепшыя літаратурныя і прафесійныя журналісцкія сілы. Творы класікаў беларускай літаратуры Я. Купалы і Я Коласа, а таксама А. Астрэйкі, М. Машары, К. Чорнага, П. Броўкі, А. Кучара, М. Танка, А. Бялевіча, П. Глебкі, К. Крапівы і многіх іншых складалі аснову публіцыстычнага зместу газеты. У цяжкі час вайны лепшыя прадстаўнікі нацыянальнай інтэлігенцыі змагаліся разам з усім народам, сваімі творамі ўмацоўвалі патрыятычны дух. У № 8 ад 11.01.1942 быў апублікаваны «Кліч да беларускага народа» Я. Купалы, у № 26 ад 05.03.1942 змешчаны зварот Я. Коласа «Да зброі, беларускі народ!».

З заклікам змагацца за Радзіму да грамадзян акупіраванай Беларусі са старонак газеты звярталіся кіраўнікі ўрада: сакратар ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнка (прамова «Беларускі народ у барацьбе з нямецкімі акупантамі», СБ, № 1 ад 16.01.1942), зварот «Да працоўных Беларусі» ад ЦК КП(б)Б, СНК, Прэзідыума ВС БССР (№ 32 ад 27.03.1942) і інш.

Першыя выпускі газеты нагадвалі лістоўкі. Іх змест складалі патрыятычныя вершы, лозунгі (кожны нумар адкрываўся лозунгам), кароткія апавяданні аб подзвігах партызан і падпольшчыкаў, фотарэпартажы, інфармацыйныя зводкі «Ад савецкага інфармбюро», карэспандэнцыі аб працы на заводах, прамовы членаў ЦК Сталіна, Варашылава. Матэрыялы друкаваліся ў рубрыках «Баявыя весткі», «Тэлеграмы з-за граніцы», «Баявыя эпізоды», «Наступленне Чырвонай Арміі», «У тыле ворага», «Дзейнасць партызан Беларусі», «Па Савецкаму Саюзу» і інш.

Паступова змест газеты станавіўся больш разнастайным, рэдакцыя выкарыстоўвала новыя жанры, метады і формы публіцыстычнага ўздзеяння, якія сведчылі аб нарастанні ўсенароднай барацьбы. У некалькіх выпусках за студзень 1942 г. была надрукавана інфармацыя пра радыёмітынг прадстаўнікоў беларускага народа, які адбыўся 18

студзеня 1942 г., а таксама зварот да Сталіна ад імя беларускага народа (№ 10 ад 20.01.1942).

З'яўляючыся па сутнасці адзінай афіцыйнай крыніцай інфармацыі на тэрыторыі Беларусі аб ходзе ваенных дзеянняў, газета адлюстроўвала агульны грамадскі настрой. Выпускі першых месяцаў складаліся ў асноўным з матэрыялаў інфармацыйна-заклікавага зместу. Адчуванне разгубленасці, страху і нават няўпэўненасці перадавалася праз радкі, нягледзячы на вялікую колькасць патрыятычнай інфармацыі. Адчуванне безвыходнасці падмацоўвалася публікацыямі, фотаздымкамі аб звер-ствах фашыстаў сярод мірнага насельніцтва.

Першая вялікая перамога Савецкай арміі ў бітве пад Масквой умацавала надзею на перамогу. Пералом адбыўся і ў змесце «Савецкай Беларусі»: з'явіліся новыя рубрыкі («Дапамога насельніцтву вызваленых раёнаў», «Беларусы на фронце», «На франтах Айчыннай вайны», «Вызваленчы дух пашыраецца»). Газета павялічыла аб'ём да чатырох палос, пачала змяшчаць фотаздымкі. З'явіліся публікацыі аб панічных настроях салдат, разлажэнні нямецкай арміі (СБ, № 21 ад 16.02.1942), што, безумоўна, садзейнічала ўмацаванню баявога духу арміі і насельніцтва акупіраванай Беларусі.

Асаблівай увагі ў дадзеным кантэксце заслугоўваюць рубрыкі аб героях Вялікай Айчыннай вайны. Менавіта са старонак «Савецкая Беларусі» народ упершыню даведаўся пра подзвігі Льва Даватара, Мікалая Гастэлы, Фёдара Паўлоўскага, Жэні Палтаўскай, Сашы Тышкевіча (№ 20–21 ад 16.02.1942) і многіх іншых нашых землякоў. Веру ў перамогу над фашызмам зламаць ужо было немагчыма. З кожным новым выпускам газета паведамляла, як да барацьбы з ворагам далучаюцца новыя сілы і ў гэтым магутным патрыятычным змаганні за будучыню народ ажывае, наладжвае побыт, верыць у хуткае вызваленне. Набываў вялізныя маштабы партызанскі рух, часцей гучаў заклік «Беларусы! Узнімайцеся на ўсенародную партызанскую барацьбу!» (№ 38 ад 17.04.1942). У № 43 ад 04.05.1942 было надрукавана адкрытае пісьмо партызан Калінінскага фронту І. В. Сталіну.

Свой уклад у справу перамогі рабілі вучоныя Беларусі, пісьменнікі і паэты, мастакі: у № 29 ад 14.03.1942 газета змясціла інфармацыю аб сесіі Акадэміі навук БССР у Казані, у № 32 ад 27.03.1942 выйшлі матэрыялы «Беларускія літаратары ў дні вайны», «Новыя творы беларускіх пісьменнікаў» і «Беларускія вучоныя за працай».

Знакавай падзеяй для беларусаў стаў выхад у эфір радыёстанцыі «Савецкая Беларусь» 30 сакавіка 1942 г. У гэты ж дзень газета змясціла

паведамленне пад назвай «Слухай, беларускі народ». Радыёстанцыя працавала ў Маскве і выходзіла ў эфір на беларускай мове на хвалі 41,5 м (СБ, № 33).

Насельніцтва акупіраванай Беларусі выступала супраць зямельнай рэформы. У шматлікіх публікацыях за 1942 г. раскрывалася сутнаць акупацыйнай палітыкі, калабаранцкага руху (артыкул «Пратэст беларускіх сялян супраць гітлераўскай "зямельнай рэформы"», № 40 ад 23.04.1942).

Міжнародны аддзел «Савецкай Беларусі» складаўся з паведамленняў аб нарастанні антыфашысцкай барацьбы ва ўсім свеце. У матэрыялах газеты расказвалася аб галодных бунтах у Германіі, разгроме італьянскай дывізіі югаслаўскімі партызанамі, бунтах сялян і салдат у Чэхаславакіі (СБ, № 33 ад 30.03.1942). У № 55 ад 16.06.1942 была змешчана інфармацыя аб падпісанні «Дамовы паміж СССР і Вялікабрытаніяй аб саюзе ў вайне супраць гітлераўскай Германіі і яе саўдзельнікаў у Еўропе і аб супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе пасля вайны». 26 чэрвеня 1942 г. народны камісар замежных спраў В. Молатаў наведаў Вашынгтон. На наступны дзень у газеце з'явілася інфармацыя аб выніках перамоў.

Такім чынам, к 1942 г. рэдакцыяй «Савецкай Беларусі» была сфарміравана канцэпцыя ваеннага выдання. Паступова палепшыўся дызайн: сталі выкарыстоўвацца новыя шрыфты, больш якаснымі былі ілюстрацыі, асобныя святочныя нумары друкаваліся ў колеры. Газета актыўна публікавала вершы, апавяданні, у якіх услаўляўся подзвіг народа, лісты салдат і партызан з заклікам змагацца да пераможнага канца.

З 22 лютага 1943 г. «Савецкая Беларусь» пачала друкавацца на беларускай і рускай мовах. Пасля вызвалення Мінска ў жніўні 1944 г. яна спыніла сваю дзейнасць. На рускай мове пачала выходзіць ізноў газета «Советская Белоруссия» і на беларускай – «Звязда».

Гістарычнае значэнне дзейнасці перыядычных выданняў у гады Вялікай Айчыннай вайны проста каласальнае, і пераацаніць яго немагчыма. Высокі ўзровень публіцыстычнага майстэрства, прафесіяналізму ў найскладанейшых умовах акупацыі, духоўнага крызісу дазволіў рэдакцыі «Савецкай Беларусі» выканаць вельмі значную працу па кансалідацыі грамадства, выхаванні патрыятычнай свядомасці насельніцтва краіны.

Літаратура

1. Марцелев, С. В. Печать Советской Белоруссии (исторический очерк) / С. В. Марцелев. – Минск : Беларусь, 1967. – 512 с.

Вераніка Канюта
Выдавецкі дом «Звязда»

ВЯЧАСЛАЎ НІКІФАРАЎ. АПОШНІЯ ДНІ ЖУРНАЛІСТА-ПАДПОЛЬШЧЫКА

Ноч на 26 верасня 1942 г. для мінскіх падпольшчыкаў выдалася надзвычай трывожнай. Пакуль адны з напружаннем чакалі апошніх звестак у пяты нумар падпольнай «Звязды», іх таварышы па падполлі траплялі ў рукі фашысцкіх катаў...

Не пашанцавала той ноччу і загадчыку аддзела прапаганды і агітацыі Мінскага гарадскога падпольнага камітэта, аднаму з адказных за выпуск падпольнай «Звязды» Вячаславу Нікіфараву. Менавіта ён павінен быў прынесці ў пяты нумар, які так і не ўбачыў свет, свежыя зводкі Саўінфармбюро. Толькі калегі не дачакаліся ні навін, ні яго самога і на наступны дзень. Неўзабаве яны даведаліся: той злоснай ноччу гітлераўцы схапілі 21 патрыёта. Сярод арыштаваных – і душа газеты, як называлі Нікіфарава падпольшчыкі. Далейшае існаванне рэдакцыі ў акупаваным Мінску было немагчымым.

Якімі былі апошнія дні адважнага змагара са свабоду і справядлівасць, дапамаглі ўзнавіць успаміны аднаго з падпольшчыкаў, знойдзеныя ў Нацыянальным архіве Беларусі. Георгію Сапуну, які пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны выкладаў фотажурналістыку ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, цудам удалося пазбегнуць расправы. У яго сакамерніка Вячаслава Нікіфарава быў трагічны лёс. Не лепшым чынам ён склаўся і ў іх таварышаў па фашысцкім засценку: І. Кавалёва, Д. Караткевіча, К. Хмялеўскага, М. Герасіменкі, М. Шугаева.

«Калі адчынілі дзверы і высадзілі нас з машыны, мы сапраўды апынуліся на ўжо знаёмым мне турэмным двары, – успамінаў Георгій Сапун. – Зноў пастроілі нас тварам да сцяны, пачалі абшукваць і праводзіць рэгістрацыю. Вобыск быў пільны і, здавалася, што можна было шукаць у нас ужо некалькі разоў абшукваемых дагэтуль? Але прагледзелі ўсё, што толькі можна было – адабралі нават падвязкі, агрызкі алоўкаў, шматкі паперы, дробку тытуню, у некаторых зрэзалі гузікі» [1].

Семярых іх памясцілі ў падвальную камеру пад нумарам 10. Камера была пустая: толькі каменная падлога і такія ж сцены. Шкло ў адзіным маленькім акне было выбіта. Адсюль – жудасны холад. Сцены і падлога настолькі астывалі, што сесці на апошнюю або нават падперціся да сцяны не ўяўлялася магчымым. Сітуацыю ўскладняла тое, што ўсе былі адзеты па-летняму. «Кавалёў, Караткевіч і Нікіфараў не мелі нават шкарпэтак, таму бацінкі былі абуты на босую нагу, – сведчыў сакамернік. – Калі

ўлічыць, што ўсе былі ўжо знясілены голадам і снежаньскімі маразамі 1942 года, то можна лёгка ўявіць, якая нас чакала перспектыва» [1].

Падпольшчыкі сустрэліся ў адной камеры пасля некалькіх месяцаў допытаў у гестапа. Ужо нават і не спадзяваліся ўбачыць кагосьці жывым. Таварышам хацелася пагаварыць, распытаць пра многае. Усе глядзелі адзін на аднаго і, напэўна, думалі: хто гэта той, з-за каго прывялі іх усіх сюды са звязанымі рукамі? Пакуль, згадваючы падрабязнасці таго жудаснага дня, яны рабілі першыя высновы, холад незаўважна скоўваў іх рухі. Каб хоць крыху сагрэцца, пачалі хадзіць па камеры. «Камера была малая, і ў цемры пры хаджэнні штурхалі адзін аднаго, – пісаў Георгій Сапун. – Праз гадзіну-паўтары ўсе стаміліся, а цяплей не станавілася. Стала ясна, што не хопіць сіл пратрымацца ўсю ноч на нагах. Вырашылі ўсёй групай размясціцца каля дзвярэй, прыціснуцца шчыльней і грэць адзін аднаго ўласнымі целамі. У гэты час, калі пачалі размяшчацца, раздалося лязганне калідорных рашэцістых дзвярэй і кагосьці падвялі да нашай камеры» [1].

Гэтымі «навічкамі» былі падпольшчыкі Івашчонак, Цвяткоў і Грышын – той самы, у чыім пакоі ў хаце Таццяны Якавенкі, што па Выдавецкай вуліцы, друкаваліся 2-гі і 3-ці нумар падпольнай «Звязды». Амаль апошнімі з гестапаўскага падвала іх траіх, а таксама яшчэ некалькі чалавек у крытай «душагубцы» везлі ў Трасцянец. Падпольшчыкі ўжо рыхтаваліся да смерці, але, прастаяўшы там доўгі час і памарозіўшы іх, машына павярнула назад, і ўсе яны апынуліся ў турме.

«Карыстаючыся прысутнасцю траіх ахоўнікаў, якія суправаджалі зняволеных, Хмялеўскі і Кавалёў заявілі, што ў камеры жудасны холад, – успамінаў падпольшчык. – Адзін з ахоўнікаў з польскім акцэнтам адказаў: “Час цяпер позні, начальства няма, а вас да раніцы чорт не возьме, а заўтра ўсё роўна ўсіх павесяць”» [1].

На досвітку з ахоўнікамі прыйшоў перакладчык – і падпольшчыкаў перавялі ў камеру нумар 13. Памерам яна была значна меншай. Выбітыя вокны былі залеплены кардонам і заткнуты бруднымі анучамі. Праўда, стаяў ложак, на якім ляжалі дзве вузенькія дошчачкі. І гэта на дзесяць зняволеных. «Карыстаючыся сваёй маленькай перамогай, мы пачалі патрабаваць, каб нам далі хаця б яшчэ некалькі дошак, – пісаў у сваіх успамінах Георгій Сапун. – Перакладчык адправіў ахоўнікаў паглядзець, дзе яшчэ ёсць дошкі і прынесці нам. Пры гэтым сказаў: “Хто іх ведае, можа, хтосьці і застанецца жывым?”» [1].

Першыя два дні знаходжання ў 13-й камеры падпольшчыкаў ніхто не турбаваў. А 10-11-й гадзіне раніцы яны звычайна атрымлівалі свой сутачны рацыён: па 80–100 грамаў хлеба, які выпякаўся з вотруб’я

гнілога бурака, і паўлітра баланды. Астатні час прысвячаўся ўспамінам і ўдакладненню, хто яшчэ арыштаваны, а хто мог уцалець і выратавацца ад лап гестапа. «Вечарам у Кавалёва саспеў план уцёкаў, – расказваў вязень. – Ён пераконваў усіх, што іншага выйсця няма. Калі нават нас усіх не расстраляюць або не перавешаюць, то праз месяц-два мы, напэўна, перадохнем з голаду. Ён лічыў, калі з дзесяці чалавек дзевяць загінуць, а адзін зможа ўцячы, то і тады варта бегчы» [1]. План Кавалёва падпольшчыкі не адобрылі.

Дзякуючы Георгію Сапуну, якому ўдалося выйсці на сувязь са сваёй жонкай, некаторым зняволеным сталі прыносіць перадачы. Хлопцы марылі аб дробцы тытуню, але перадаваць яго вязням катэгарычна забаранялася. Праўда, за асобую плату рабіліся выключэнні. Але якімі б сціплымі ні былі тыя перадачы, ахоўнікі сістэматычна абкрадалі зняволеных. Аднойчы Караткевічу перадалі запіску, у якой прасілі паведаміць, хто з ім сядзіць. Гэта была правакацыя.

«Гадзін у 11 дня назвалі Кавалёва і Нікіфарава і павялі, – успамінаў Георгій Паўлавіч. – Цэлы дзень прайшоў у напружаным чаканні іх вяртання. Кожны з нас ведаў, чым звычайна заканчваецца выклік на допыт у гестапа: страшнымі, бесчалавечнымі, зверскімі катаваннямі дзікіх і п'яных вандалаў і садыстаў. Прайшоў дзень, а яны ўсё не вярталіся. Некаторых яшчэ не пакідала надзея: можа, ноччу? Настала раніца, прайшоў дзень, зноў ноч, а Кавалёў з Нікіфаравым так і не з'явіліся. Усе былі ўпэўнены, што з імі пакончылі. Блізкая смерць вітала над усімі. Яе чакалі з поўным спакоем» [1].

У пачатку студзеня 1943 г. з камеры адзін за адным выбылі людзі. Двое (Нікіфараў і Кавалёў) былі выкліканы ў гестапа. Грышын – невядома куды. Трое захварэлі на тыф. Астатніх, у тым ліку аўтара гэтых каштоўных успамінаў, чакаў Асвенцым.

Літаратура

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 1346. – Воп. 1. – Спр. 65.

Ольга Касперович-Рынкевич
Белорусский государственный университет

ИННОВАЦИОННАЯ ПРОБЛЕМАТИКА В СОВРЕМЕННОМ МЕДИАПРОСТРАНСТВЕ

Положительное восприятие инноваций и понимание необходимости научных разработок невозможно без доступного и простого объяснения инновационного процесса. Для формирования лояльности общества к

14. Официальная страница «Sports.ru» в Instagram [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://www.instagram.com/sportsru. – Дата доступа : 20.07.2017.
15. Официальная страница «Sports.ru» в Twitter [Электронный ресурс]. – Режим доступа : https://twitter.com/sportsru. – Дата доступа : 20.07.2017.
16. Тузин, М. А. Особенности спортивной Интернет-журналистики (на примере новостных сайтов Рунета) / М. А. Тузин, В. О. Французов // NovaInfo.Ru. – 2015. – Т. 1. № 34. – С. 204–209.
17. Шершнёва, Ю. С. Жанры спортивной журналистики: современные тенденции / Ю. С. Шершнёва // Ученые записки Новгородского государственного университета имени Ярослава Мудрого. – 2016. – № 3 (7) [Электронный ресурс]. – Режим доступа : http://www.novsu.ru/file/1241679. – Дата доступа : 17.07.2017.

РАЗДЗЕЛ IX

МЕДЫЯКУЛЬТУРА І ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЯ КРЫТЫКА

Галіна Багданава
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

АСОБА МАСТАКА: ТРАДЫЦЫЙНЫЯ І НОВЫЯ СПОСАБЫ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ Ў СМІ

У гэтым годзе ў нашай краіне ўпершыню была прысуджана Нацыянальная прэмія па выяўленчым мастацтве. На жаль, СМІ даволі абыякава паставіліся да гэтай знакавай для нашай краіны падзеі. У Нацыянальным цэнтры сучаснага мастацтва за некалькі месяцаў да пасяджэння камісіі была наладжана вялікая выстава прэтэндэнтаў. І была нагода зрабіць інтэрв'ю з кожным, праілюстраваць публікацыі альбо тэлеперадачы цікавымі творамі. Але і пасля таго, як былі названыя лаўрэаты, у друку з'явілася толькі нязначная інфармацыя. Хаця большасць друкаваных выданняў маюць магчымасць рэпрэзэнтаваць творы ў колеры. Сярод лаўрэатаў былі знаныя асобы, пра якіх пісалі і пішуць шмат. Гэта народны мастак Беларусі Уладзімір Тоўсцік, старшыня Саюза беларускіх мастакоў Рыгор Сітніца. Былі тыя, гонар адкрыцця якіх належыць студэнтам і нядаўнім выпускнікам Інстытута журналістыкі (на старонках «Настаўніцкай газеты» нашыя студэнты ўпершыню прадстаўлялі Паліну Пірагову, Васіля Цімашова; у часопісах «Маладосць» [1], «Нёман» [2] – Алесю Скарабагатую). Але асобы Глеба Отчыка (атрымаў прэмію за роспісы ў храме ў Вішневе) і іншых, на жаль, мала вядомыя, хаця яркія творчыя асобы маглі б стаць арыенцірам для моладзі.

Сёння рэдка з'яўляюцца традыцыйныя і папулярныя некалькі дзесяцігоддзяў таму творчыя партрэты. Гэта жанр, што стаіць на мяжы літаратуры і літаратурна-мастацкай крытыкі, дазваляе вельмі вобразна прадставіць асобу героя. І пры жаданні ён можа быць мабільным. Нават у невялікім па аб'ёме матэрыяле вопытны арт-журналіст ці арт-крытык здольны даць чытачу ключ для разумення творчасці мастака. Але ў наш час аўтары часцей звяртаюцца да разгорнутых інтэрв'ю, эсэ.

Вопыт рубрыкі CATHEDRA на старонках часопіса «Маладосць», куды рыхтуюць матэрыялы студэнты пад кіраўніцтвам выкладчыкаў кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі, сведчыць, што ў невялікіх эсэ ў празаічнай ці вершаванай форме можна вельмі дакладна вербальна перадаць візуальную вобразнасць як сталых майстроў (адзін з выпускаў быў прысвечаны Уладзіміру Зінкевічу), так і мастакоў-пачаткоўцаў. Больш за тое, прасторавыя вобразы набываюць развіццё ў часе. Падобныя публікацыі вельмі карысныя як для творцаў (іх разумеюць!), так і для гледачоў-чытачоў (ім даецца ключ для разумення творчасці, ключ для разумення асобы мастака, таму што менавіта ў творах адлюстроўваецца душа аўтара).

Студэнты I і III курсаў факультэта журналістыкі напісалі невялікія, але вельмі яркія эсэ (кожны пра адзін-два творы) з выстаўкі Алесі Скарабагатай, якая экспанавалася ў канцы 2016 года. Гэта быў дыялог у вобразах, філасофскае спасціжэнне нашага часу і нашай прасторы. І вось у 2017-м менавіта Алеся Скарабагатая стала адным з лаўрэатаў Нацыянальнай прэміі па выяўленчым мастацтве (намінацыі «Дэбют», «Глядацкая сімпатыя»). Скажаце, супадзенне? Не, проста СМІ былі, ёсць і будуць чацвёртаю ўладай. Першымі заўважыць, зразумець і першымі расказаць пра таго, хто ёсць Асоба ў мастацтве, у літаратуры, культуры. Магчыма, тады маладыя людзі не страцяць нармальныя арыенціры ў жыцці, задумаюцца не пра імклівае сёння, а пра вечнасць, і ў побыце навучацца бачыць быццё, як гэта ўмеюць рабіць сапраўдныя мастакі.

Такім чынам, арт-журналіст можа адшукаць прыклады яркіх асобаў у мастацтве (на выстаўках, пленэрах, конкурсах), падрыхтавацца (інтэрнэт дае дастаткова інфармацыі) і зрабіць цікавае інтэрв'ю, у якое варта смела ўключаць свае ўражанні ад твораў (нагодаю можа стаць і адзін твор). Можна напісаць эсэ або серыю эсэ з выстаўкі пра аднаго ці некалькіх мастакоў (гэтая публікацыя можа быць сумеснаю). Усе выступленні ў СМІ на тэму выяўленчага мастацтва ёсць магчымасць цікава праілюстраваць. Падобныя публікацыі могуць скласціся ў рубрыкі.

Мы вялі гаворку пра прадстаўленне ў СМІ сучасных беларускіх мастакоў. Але эсэ ці падборка эсэ выдатна падыдуць і для рэпрэзентацыі нашых класікаў, мастакоў іншых краін. Інтэрв'ю можна замяніць знойдзенымі ў друку выказваннямі свайго героя.

Літаратура

1. Восень колеру снегу // Маладосць. – 2017. – № 2. – С. 93–104.
2. Мальчевская, Е. Характер вещей / Е. Мальчевская // Нёман. – 2012. – № 6. – С. 2.

Алесь Багданаў
Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў

АСАБЛІВАСЦІ РЭПРЭЗЕНТАЦЫІ ТВОРАЎ СУЧАСНАГА БЕЛАРУСКАГА МАНУМЕНТАЛЬНА-ДЭКАРАТЫЎНАГА МАСТАЦТВА Ў СМІ

Сёння мастакі манументальна-дэкаратыўнага мастацтва (МДМ) актыўна ўдзельнічаюць у фарміраванні вобразнай прасторы дзяржаўных устаноў, грамадскіх, прамысловых і культавых будынкаў не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Выкарыстоўваюцца сучасныя вобразныя падыходы, новыя матэрыялы, але гэта, на жаль, не заўсёды знаходзіць адпаведнае адлюстраванне ў СМІ. У 1950–1980-я гады МДМ было выдатным сродкам ідэалагічнай прапаганды. І СМІ вельмі актыўна рэпрэзэнтавалі творы М. Савіцкага, А. Кішчанкі, Г. Вашчанкі і інш. Сёння ж не менш значныя творы такіх яркіх асобаў, як У. Зінкевіч, Г. Отчык, І. Маланаў, Д. Чубукоў, Ю. Пеўнеў і інш., практычна не прадстаўлены на старонках газет, часопісаў, на тэлебачанні і нават у інтэрнэце (грандыёзныя мазаікі і вітражы ў новым будынку Савета Рэспублікі – і усяго адна публікацыя ў «Літаратуры і мастацтве»; далёка не пра ўсе творы ў інтэр'ерах Палаца Незалежнасці распавядаецца ў публікацыі на старонках «Звязды» і г. д.). Хаця большасць прац выканана ў сістэмах постмадэрнізму, посттрадыцыі, прадстаўленая візуальная інфармацыя вымагае дадатковых вербальных тлумачэнняў, супастаўлення з архітэктурным асяроддзем. Варта вылучыць некаторыя асаблівасці сучаснага беларускага МДМ, якія дапамогуць больш прафесійна рэпрэзентаваць творы ў СМІ.

– Калі ў XX ст. манументальна-дэкаратыўнае мастацтва, за рэдкім выключэннем (вітражы для Дома кіно (цяпер касцёл Сымона і Алены) Г. Вашчанкі), часцей за ўсё было падпарадкаванае дзяржаўнаму заказу, палітычным ідэям, у апошнія гады пры аздабленні дзяржаўных устаноў (новы будынак Савета Рэспублікі, Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь), грамадскіх, прамысловых будынкаў (школы, інтэр'еры інтэрната, галоўнага корпуса БДАМ, прамысловая зона ААТ «Керамін») і г. д.), вызначальную ролю адыгрывае аўтарская задума. Таму мэтазгодна пры рэпрэзэнтацыі твораў у СМІ выкарыстоўваць такія формы, як *інтэрв'ю з мастакамі*, *кароткія каментарыі да ілюстрацый*.

– Беларускія мастакі-манументалісты практычна цалкам адмовіліся ад ілюстрацыйнасці, стылістычных рэмінісцэнцый «суровага стылю», працуюць пераважна ў сістэме постмадэрнізму і посттрадыцыі,

шырока выкарыстоўваючы вобразы як сусветнай (роспіс «Лабірынты» А. Башкатавай на трансфарматарнай будцы ў дворыку БДАМ), так і нацыянальнай («Сакрум тэра. Зямля запаветная» – мазаікі з каменю ў інтэрнаце БДАМ) гісторыі і культуры, архетыповыя структуры традыцыйнага народнага мастацтва (мазаікі ў новым будынку Савета Рэспублікі). Таму нават пры выкарыстанні інфармацыйных жанраў, напрыклад рэпартажаў, мусяць быць *прафесійныя каментарыі*.

– Пры рэалізацыі творчых задум па-новаму выкарыстоўваюцца і традыцыйныя матэрыялы і тэхнікі (роспіс, мазаіка, вітраж і г. д.), і новыя для сучаснага МДМ, напрыклад камень. Арт-журналісты могуць *супастаўляць вобразнае гучанне з тэхналогіяй.*

– Новаю старонкай у сучасным беларускім манументальна-дэкаратыўным мастацтве стала аздабленне культавых будынкаў. *«Круглы стол»* на тэму аздаблення культавых будынкаў несумненна зацікавіў бы чытачоў. Напрыклад, аўтары і выканаўцы мазаік для Храма Усіх Святых выконваюць заказы і для Расіі. Аўтар роспісаў у Храме ў Вішневе Глеб Отчык стаў лаўрэатам Нацыянальнай прэміі па выяўленчым мастацтве.

Такім чынам, творы сучаснага МДМ могуць стаць нагодаю для яркіх выступленняў у СМІ, якія, несумненна, будуць запатрабаваныя ў чытачоў і гледачоў.

Аксана Бязлепкіна
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

ГОРВАТ ПРА ЛЮБОЎ: РЭЦЭНЗІІ НА КНІГУ А. ГОРВАТА «РАДЗІВА “ПРУДОК”»

Папулярнасць кнігі Андрэя Горвата (хацелася б прынцыпова адмовіцца ад пазначанага на вокладцы варыянта імя Андрусь) змусіла крытыкаў да таго, каб пастфактум паспрабаваць растлумачыць яе феномен. Нехта шукаў разгадку ўнутры тэксту (Ю. Алейчанка), нехта – у пазалітаратурных фактарах (Ц. Чарнякевіч).

Сама кніга Горвата і некаторыя заўвагі да яе глядзяцца сімвалічна ў кантэкце навуковага артыкула І. Шаўляковай-Барзенкі, надрукаванага раней за рэцэнзію Ц. Чарнякевіча і пазней за першае выданне кнігі А. Горвата: беларускай літаратуры (*літаратуры класічнага тыпу*) трэба шукаць новыя шляхі, каб пазбегнуць пагрозы *негатыўнай элітарнасці і этнаграфічнасці* [паводле 3, с. 103–105] (вылучэнні нашы. – *А. Б.*).

А. Горват, магчыма, выйграў са сваёй этнаграфічнасцю, бо яна ў яго – псеўдаэтнаграфічнасць. І гэтае «псеўда» заўважнае: Ц. Чарнякевіч

назваў гэта маскай, а Ю. Алейчанка шчодра яго цытавала, справядліва дадаўшы, што «няхай сабе і маска. Толькі, як ні дзіўна, і яна часам дапамагае зблізіцца» [1, с. 172]. «Маска Андрусіка» (Чарнякевіч) сапраўды глядзіцца трохі штучна для тых, хто памятае блог Анджэя Горвата на livejournal і эпапею з аднаўленнем палаца Горватаў у Нароўлі. Ад арыстакратычнасці да сялянства – адзін крок? Ці адзін маркетынгавы ход?

А. Горват уклаў кнігу з допісаў у фэйсбуку, пра што Ц. Чарнякевіч слушна заўважыў, што хоць аўтар, верагодна, меў на ўвазе ў будучыні выданне на паперы, у кнізе мала і невыразна прысутнічае анлайнавая гісторыя напісання з фідбэкамі на рэальных чытачоў. Верагодна, адсутнасць фідбэкаў лагічная, калі мэта анлайна не толькі напісанне кнігі. Псеўдатутэйшы вясковец стварыў для будучых чытачоў кнігі ілюзію далучанасці да працэсу яе напісання (інструментальна пераадолеў галоўную праблему беларускай літаратуры – камунікатыўны разрыў).

Крытык Ц. Чарнякевіч паспрабаваў растлумачыць поспех кнігі вялікай колькасцю мэтавых аўдыторый, гатовых аплаціць з уласнай кішэні трансляцыю прудкоўскага «радзіва» (сталічныя жыхары, якія з гарадской пыхай цікавяцца «іншым», правінцыйным у тым ліку; праваканцерватыўная аўдыторыя, якая задаволена канстатуе, што покліч крыві нарэшце дагрукаўся да моладзі), і значнасць фактараў, якія паўплывалі на ўздым цікаўнасці: мода на падарожжы і на хіпстарскі лад жыцця і светапогляд (крытык пасаромеўся назваць усё сваімі імёнамі, каб не быць папракнутым у рэтраградстве).

Калі Ц. Чарнякевіч шукаў разлік і збыткоўна фіксаваўся на фінансавым аспекце выдання, то Ю. Алейчанка, наадварот, славіла А. Горвата ў горшых традыцыях вучнёўскай крытыкі («Хочаце знайсці сябе на старонках, а можа, у нечым паспрачацца (унутрана ці адкрыта) з аўтарам – паслухайце эфіры імправізаванага “радзіва”» [1, с. 173]; «Якім светлым сумам працяты радкі…» [1, с. 172]; «галерэя абаяльных партрэтаў вясковых жыхароў…» [1, с. 173]. Калі Чарнякевіч сумняецца ў шчырасці Горвата, то за чыстую манету ўсё прымае Алейчанка і не стрымліваецца ў літаратуразнаўчым пафасе: «дасягнуць такой эмацыйнай напятасці, сэнсавай канцэнтрацыі ў радку – вельмі няпроста» [1, с. 172].

І тут варта зноў абаперціся на артыкул Шаўляковай. У класічнай літаратуры, якой нібыта варта пераадолець сваю класічнасць, здарыўся Горват з «маскай Андрусіка» і імітацыяй зваротнай сувязі. Як адрэагавалі на гэта пафесійныя чытачы?

Спробу па вялікім рахунку не залічылі: «Нядаўна я чуў рытарычнае пытаньне аднаго з аўтараў школьнага падручніка па беларускай

літаратуры, тычылася яно кнігі Горвата: «А што далей?» Хацелася б ведаць. Беларускі бэстсэлер, пры адсутнасьці індустрыі, выявіўся нязвыклым і непрадказальным. З увагі на зьмешчаныя ў кнізе апавяданьні (вельмі, дарэчы, някепскія) можна чакаць ад Горвата лінейнай, скажам так, прозы. Першы ягоны экспірыенс стаў плятынавым ня дзякуючы ёй, але хто ведае – Горват цяпер можа дазволіць сабе ўсё. Мне асабіста хочацца, каб ён зьмяніў маску». Такое заключэнне рэцэнзіі можна лічыць тоесным прызнанню крытыка ў сваім несур'ёзным стаўленні да першай кнігі пісьменніка і своеасаблівым сучасным парафразам даўняга меркавання «не напісаў раман – не пісьменнік».

І складана сказаць: гэта крытыкі цягнуць Горвата ў мінулае, ці Горват не здолеў вырвацца з поля прыцягнення класічнай літаратуры (у адрозненне ад некласічнай і постнекласічнай). Зрэшты, у кантэксце класічнай літаратуры поспеху Горвата могуць быць іншыя тлумачэнні, і тады разгадка папулярнасці не ў апазіцыі «сталіца/правінцыя», не ў паспяховым акце даўншыфтынгу і не ў «эмацыйнай напятасці» радка, а ў тым, што сучасная беларуская літаратура стамілася ад негатыву, прадукаванага папулярнымі ў сталічным асяродку пісьменнікамі: у адрозненне ад Станкевіча, Глобуса, Бахарэвіча ды іншых Горват – пра любоў.

Літаратура

1. Алейчанка, Ю. Стаць сваім для сябе [Рэцэнзія на кн. А. Горвата «Радзіва "Прудок"»] / Ю. Алейчанка // Полымя. – 2017. – № 5. – С. 171–173.
2. Чарнякевіч, Ц. Горват: археалёгія ў маскхалаце / Ц. Чарнякевіч // Будзьма беларусамі [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://budzma.by/news/horvat-arkhyealyohiya-w-maskkhalacye.html. – Дата доступу : 11.04.2017.
3. Шаўлякова-Барзенка, І. Беларуская літаратура ў інфармацыйным грамадстве: пагрозы як гарантыя перспектыў / І. Шаўлякова-Барзенка // Полымя. – 2017. – № 1. – С. 103–114.

Дарья Гиргель
Белорусский государственный университет

ПОНЯТИЕ «YOUMO» («ЮМОР») В ФИЛОСОФИИ ЛИНЬ ЮЙТАНА

Линь Юйтан (Lin Yutang 林語堂 1895–1976) – известный китайский писатель, переводчик, лингвист, публицист, философ и общественный деятель. В 1924 году в китайскоязычной прессе Линь Юйтан опубликовал два эссе, в которых призывал переводить зарубежную юмористи-

ческую литературу и пропагандировать юмор. Для перевода на китайский язык английского слова «humor» Линь Юйтан использовал способ транслитерации. Так, впервые в китайском языке появилось новое слово «youmo» (幽默).

Понятие «youmo» отличается от традиционно принятого в китайском языке понятия «huaji» (滑稽), значение которого – комический, уморительный, смехотворный. Линь Юйтан считал, что слова китайского языка, относящиеся к комическому, не могут передать сущности юмора в западном понимании этого слова.

В 1932 г. Линь Юйтан начал издавать журнал «Лунь юй» («Суждения и беседы»). Название для журнала было позаимствовано, не без иронии, у известного трактата Конфуция. Целью журнала было представление и продвижение юмора, юмористической литературы в китайской культуре и литературе. В литературных кругах выпуски «Лунь юй» сопровождались спорами о природе юмора. В среде китайских литераторов 1933 г. был назван «Годом юмора», Линь Юйтан – «Великим мастером юмора» (youmo dashi 幽默大師). Журнал «Лунь юй» просуществовал с некоторыми перерывами до 1949 года и стал совершенно новым явлением в китайской периодической печати, положив начало национальному феномену – выпуску юмористических периодических изданий.

Линь Юйтан считается ключевой фигурой в представлении западной концепции юмора в китайской культуре и литературе. Теоретические взгляды о природе юмора Линь Юйтан изложил в программном эссе «On Humor» («Lun youmo», 1934), главе «Юмор» в книге «Моя страна и мой народ» («My Country and My People», 1935), главе «On the sense of humor» в книге «The Importance of Living» («Искусство жить», 1937), во введение к книге Дж. Као «Chinese Wit and Humor» («Китайский юмор и остроумие», 1946). Концепция юмора Линь Юйтана складывалась под влиянием английского писателя Джорджа Мередита (1828–1909), который в 1877 г. изложил свои рассуждения о комическом в «Эссе о комедии и использовании духа комического».

Мередита интересует интеллектуально-духовная сфера человеческой натуры. Центральное понятие в его концепции – дух комического – особая художественная организация жизненного материала, связанная с интеллектуальным осмыслением действительности. Подлинный комический гений – это высшая форма интеллекта, поэтому «философ и комический поэт родственны в своем взгляде на жизнь» [2, с. 9]. «Комическое, – пишет Мередит, – это гений умного смеха» [Там же], и «тестом настоящей комедии является то, что она пробуждает думающий смех»

[Там же]. Мередит полагает, что «чувствительность к комическому есть шаг вперед в развитии цивилизации», и наличие или отсутствие в культуре «духа комического» [Там же] является своеобразным тестом на определение уровня ее развития. Только тогда культура может считаться развитой, когда в ней присутствует дух комического.

Если Мередит разграничивает «дух комического», сатиру и юмор, то в понимании Линь Юйтана «youmo» и «дух комического» обладают одинаковым онтологическим статусом. Для Линь Юйтана «youmo» является не просто литературной техникой, стилем, но уникальным отношением к жизни. Юмор – это «психологическое состояние» [1, с. 74], вид жизненной философии, «точка зрения, определенный взгляд на жизнь» [Там же], основанный на манере смотреть на вещи сквозь призму здравого смысла.

Линь Юйтан подчеркивает интеллектуальную сторону юмора. В юморе выражается разумное начало в человеке. Юмор обязательно обнаруживает себя в «понимающей улыбке», зарождающейся в душе в момент интуитивного понимания. Юмор связан с реальностью, и одна из его задач – показать иллюзорность человеческих фантазий. Юмор возникает в тот момент, когда тот, кто умен, «начинает понимать свое бессилие и ничтожество, свою глупость и противоречивость» [1, с. 74].

Линь Юйтан выделяет юмор как инструмент социальной критики и юмор как инструмент самоосвобождения. Юмор как инструмент социальной критики раскрывает правду об обществе. Юмор как средство самоосвобождения, самотрансценденции обращен вовнутрь человека, на индивидуально-личностном уровне участвует в конституировании личности, посредством юмора человек выражает себя. Линь Юйтан ценит в юморе искренность, естественность. Человек, который относится к себе с юмором, в отношениях к себе избегает лицемерия, позы, тщеславия. По мысли Линь Юйтана, юморист – это обычно пораженец, который получает удовольствие, рассказывая о своих собственных неудачах и трудностях.

Юмор предполагает дистанцию, умение возвыситься над серьезной стороной жизни, отнестись ко всему с улыбкой. Но дистанция, эмоциональное отстранение от ситуации не отменяет сочувствия со стороны наблюдателя, его со-участия в ситуации.

В юморе важен моральный аспект. В юморе заключено сострадание. Линь Юйтан подчеркивает, что подлинный юмор несовместим с цинизмом и презрением к миру. В этом заключается отличие юмора от сатиры.

Если юмор – это «смех с», то сатира – это «смех над». Ценности, которые транслирует юмор – терпимость, сострадание, открытость, уважение к человеческой индивидуальности. Чувство юмора предполагает наличие в одном явлении или лице и отрицательных, и положительных сторон. Юмористическое отношение возможно лишь тогда, когда положительные моменты перевешивают отрицательные.

Понятие «youmo» выходит за границы литературы. В 1935 г. Линь Юйтан писал: «Юмор расцветает всякий раз, когда развивающаяся нация благодаря избытку интеллекта способна беспощадно критиковать свои собственные идеалы. Ведь юмор – это интеллект, который сам себя бьет» [1, с. 74]. Продвижение «youmo» в 1930-е гг. оказалось созвучно идеям реформаторского движения, начавшегося еще в конце XIX века и ставившего целью преобразовать полуфеодальный, полуколониальный Китай в современное государство.

Начиная издавать «Лунь юй», целью Линь Юйтана не было посмеяться над другими или над самим собой. Цель Линь Юйтана была предельна серьезна – посредством «youmo» принять участие в преобразовании китайской культуры. Продвижение «youmo» было эстетической альтернативой китайской модернизации 1930-х гг., в которой доминировала гиперсерьезная преданность и забота о «спасении нации».

Без юмора люди становятся жесткими и лицемерными. В юморе заключена доброжелательность. Линь Юйтан никогда не утверждал, что проблемы, с которыми столкнулся Китай, могут быть разрешены несколькими моментами веселья. Вместо этого он просто защищал менее злой вид юмора в противоположность насмешке, злобе, возмущению, которые стали доминировать во всех слоях китайского общества.

Линь Юйтан создал слово «youmo» для обозначения в китайском языке заимствованного из европейской культуры понятия «humor». Представление и продвижение «youmo» – добродушного юмора – было одним из самых важных феноменов в культурной жизни Китая 1930-х. В условиях модернизации понятие «youmo» оказалось той гуманистической ценностью, которой Китаю недоставало.

Литература

1. Линь, Юйтан. Китайцы: моя страна и мой народ / Линь Юйтан. – М. : Вост. лит., 2010. – 335 с.
2. Михальская, Н. Вступительная статья / Н. Михальская // Д. Мередит. Испытание Ричарда Феверела. – М. : Правда, 1990. – 576 с.

Елена Иванова
Белорусский государственный университет

БИБЛЕЙСКОЕ СЛОВО В ПАСХАЛЬНОМ РАССКАЗЕ А. ЧЕХОВА «ПИСЬМО»

Произведения пасхальной тематики, традиционно печатавшиеся в весенних выпусках журналов, всегда являлись основой для создания мифологического пространства, глубинного философского подтекста, помогали оставаться на высоте общечеловеческих идеалов, что обусловлено доминантной ролью праздника Пасхи в православии.

Жанровая специфика таких произведений предопределяет своеобразие их содержания, целый комплекс мотивов и приемов, включающих цитаты из текстов Священного Писания, многочисленные аллюзии и реминисценции, тем самым формируя читательские ожидания. Однако в этих рассказах «мы имеем дело не только с литературной традицией, "памятью жанра", литературной игрой, но и с аксиологическим феноменом русского православия в форме народного христианства, к глубинным символам которого Чехов тяготел на протяжении всей жизни» [3, с. 9].

Основные черты пасхальных рассказов – это приуроченность времени действия к Пасхальному циклу праздников, «душеспасительное» содержание, противопоставление света и тьмы, трехчастная архитектоника: грех – обретение веры – прозрение, соотносящаяся с мифологическим инвариантом «жизнь – смерть – воскресение», сюжет преображения и нравственного перерождения, прощения во имя спасения души.

Последний мотив проникает в рассказы Чехова второй половины 80-х годов во многом под влиянием произведений Л. Н. Толстого. Так, библейские цитаты и реминисценции, а также символика христианского календаря формируют философский подтекст в рассказе «Письмо» (1887).

В православной церкви за три недели до Пасхи начинается духовная подготовка верующих к празднику: в воскресенье первой недели читают евангелие о мытаре и фарисее, второй – притчу о блудном сыне, третья неделя посвящена размышлениям о страшном суде. Именно эти эпизоды Священного Писания организуют глубинный философский подтекст рассказа Чехова.

В образе сына дьякона переплелись аллюзии на двух новозаветных персонажей. Имя героя позволяет соотносить его с апостолом Петром. Однако чеховский персонаж – прямая противоположность ученику Христа. Симон до своего призвания занимался ловлей рыбы, Сын божий нарекает его Кифа, то есть «камень», который должен стать опорой

Церкви (Мф. 16 : 18). Петруша, напротив, «презрительно и критически относился к рыбной ловле» [4, с. 157]. Сам отец подчеркивает разницу между ним и его святым покровителем: «Мой же Петр не камень, а тряпка» [4, с. 161]. «Неверяка-сынок» ассоциируется скорее с блудным сыном: он не соблюдает поста, «с какой-то мадамой живет, с чужой женой» [4, с. 156]. Но в произведении акцент сделан не на его раскаянии и возвращении, а на образе любящего и всепрощающего отца. Дьякон улыбается, когда говорит или вспоминает о сыне. Теплота родительского чувства подчеркивается и его фамилией – Любимов. Наивный и простаковатый дьякон искренне переживает за своего непутевого отпрыска.

Эти две мифологические ипостаси образа чеховского Петрухи сходятся в точке прощения: «Тогда Петр приступил к Нему и сказал: Господи! сколько раз прощать брату моему, согрешающему против меня? до семи ли раз? Иисус говорит ему: не говорю тебе: до семи, но до седмижды семидесяти раз» (Мф. 18 : 21–22). В свою очередь и притча о блудном сыне, заканчивающаяся примирением и прощением, показывает бесконечность милосердия Божия к грешной душе человека.

В рассказе происходит «столкновение двух “правд”, рассудочной и сердечной, суровой и простодушной» [2, с. 199], которые высказывают антагонисты: благообразный о. Федор и опустившийся о. Анастасий. Возможно, источником подобного противостояния являются противоречия Священного Писания. Так, в Евангелии от Матфея Иисус говорит, что послан на землю Богом карающим: «Не думайте, что Я пришел принести мир на землю; не мир пришел Я принести, но меч» (Мф. 10 : 34), а в Евангелии от Иоанна – Богом милующим, обещающим жизнь вечную: «И если кто услышит Мои слова и не поверит, Я не сужу его; ибо Я пришел не судить мир, но спасти мир» (Ин. 12 : 47).

В «Письме» устами благочинного говорит Бог карающий. Но, изливая свой гнев, священник сам впадает в грех, ведь на Пасху нужно всех прощать. Позицию Бога милующего выражает пьяница о. Анастасий: «А ты, дьякон, рассуди: наказующие и без тебя найдутся, а ты бы для родного сына милующих поискал! <…> не праведников прощать надо, а грешников» [4, с. 162]. «Борясь с желанием выпить», этот жалкий, запутавшийся грешник произносит слова из Покаянного Псалма царя Давида: «Во гресех роди мя мати моя, во гресех жил, во гресех и помру» [4, с. 163], начинающегося просьбой о прощении: «Помилуй меня, Боже, по великой милости Твоей» (Пс. 50 : 1).

Противопоставлением о. Федора и о. Анастасия в текст рассказа имплицитно вводится притча Христа о мытаре и фарисее. Два человека

пришли в храм, два грешника, вся разница между которыми состоит в том, что один не видел себя грешником, стал перед самым алтарем, он мнит себя достойной личностью перед Богом и людьми, а другой глубоко сознавал и переживал свою малость из-за грехов и, не смея пройти вперед, стал вдали.

По мнению С. Д. Абрамовича, «упрекаемый за пьянство благочинным о. Анастасий в своей новой ризе <…> выглядит во "внутреннем сюжете" <…> подлинно призванным на "пир брачный", ибо он-то единственный тут по-настоящему добр и великодушен. Само пьянство его есть символическая параллель евангельской теме пира со Христом, сопричастности Жениху. Да и имя "Анастасий" – воскресший – говорит само за себя» [1, с. 8]. Можно возразить исследователям, которые считают, что библейские аллюзии в данном рассказе содействуют исключительно ироническим целям. Напротив, в образе жалкого, забитого, униженного и спившегося Заявкина Чехов через библейскую «репродукцию» не высмеивает погрязшего в многочисленных грехах сельского священника, а возвышает его скрытую добродетельность.

В первой редакции рассказа о. Федор, вдохновленный пасхальной утреней и словами песнопения: « – …и друг друга обымем! – пели певчие – рцемъ: братие! И ненавидящим нас простим вся воскресением» [4, с. 516], в душе прощает и грехи о. Анастасия, и Петра, советуя дьякону пока не посылать письма. Но в окончательном варианте эта чересчур прямолинейная концовка была изменена Чеховым.

Приписка, сделанная любящим и скучающим по сыну отцом, необыкновенно трогательно говорит о победе добрых человеческих чувств, о прощении, идея которого торжествует в рассказе. Библейские цитаты и реминисценции способствуют созданию особой эмоциональной атмосферы произведения, проецируются на реально-бытовой план и тем самым поднимают его на уровень философских размышлений.

Литература

1. Абрамович, С. Д. Концепция личности у Чехова-повествователя в контексте идейно-эстетических исканий русского реализма : автореф. дис. ... д-ра. филол. наук : 10. 01. 01 / С. Д. Абрамович. – Киев, 1991. – 36 с.
2. Бердников, Г. П. А. П. Чехов. Идейные и творческие искания / Г. П. Бердников. – М.-Л. : Гослитиздат, 1961. – 507 с.
3. Собенников, А. С. «Между "есть Бог" и "нет Бога"…» : (О религиозно-философских традициях в творчестве А. П. Чехова) / А. С. Собенников. – Иркутск : Изд-во Иркут. ун-та, 1997. – 222 с.
4. Чехов, А. П. Письмо / А. П. Чехов // Полн. собр. соч. и писем : В 30 т. – Т. 6. – М. : Наука, 1985. – С. 153–163.

Арцём Кавалеўскі
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

ПАЭТЫЧНЫ ТВОР ЯК КАНСТРУКТ АЎТАРСКАЙ ПЕРСАНІФІКАЦЫІ І ЧЫТАЦКАГА ЎСПРЫМАННЯ

Тлумачэнне паэтычнага твора на думку некаторых даследчыкаў з'яўляецца сярэдняй, прамежкавай галіной літаратуразнаўства і літаратурнай крытыкі, якая не супадае наўпрост з фармальна-тэарэтычным вывучэннем паэтычнага тэксту як сістэмы. Інтэрпрэтацыя ў нашым разуменні – паняцце больш шырокае, яно цесна звязана, у першую чаргу, са спасціжэннем зместу твора, у аснове якога ляжыць той змест, які аб'ектыўна прысутнічае ў паэтычнай структуры. Гэты сэнс суб'ектыўна ўкладзены ў твор паэтам і суб'ектыўна ўспрыняты, адаптаваны чытачом. Кожны кампанент складана арганізаванай слоўна-мастацкай аўтарскай сістэмы ў рэшце рэшт разлічаны на чытацкае ўспрыманне вобразнай сістэмы (нават калі ўявіць практычную адсутнасць чытача як асноўнага рэцыпіента, то яго месца абавязкова зойме сам аўтар, аднак у дадзеным выпадку інтэрпрэтацыя страчвае сваю актуальнасць, бо не выходзіць за межы аўтарскай аперцэпцыі).

Тэарэтычная думка (літаратуразнаўства, крытыка, лінгвістыка) парушае гэта адзінства, расчляняючы твор і робячы акцэнт на розных аб'ектах даследавання, што вядзе да стварэння розных шляхоў іх спасціжэння. Сёння прыходзіцца канстатаваць, што літаратуразнаўства мінулага стагоддзя мела супярэчлівыя тэндэнцыі; з аднаго боку, былі здзейсненыя спробы вывучэння тэксту як такога па-за сувяззю з аўтарам і рэцыпіентамі, з іншага ж боку – досыць грунтоўна была распрацавана канцэпцыя сумеснай творчасці чытача і аўтара (прапанаваная Патабнёй) як адной з асноўных катэгорый эстэтычнага быцця мастацкага твора. Згодна з новай дактрынай даследчык паэтычнага тэксту праводзіць над ім шэраг аперацый, ён прапускае твор праз сябе, пераасэнсоўвае яго і інтэрпрэтуе, абапіраючыся на сацыяльную, культурную (духоўную ў шырокім сэнсе) парадыгму, дасведчанасць і вопыт. Праблема разумення і інтэрпрэтацыі мастацкага тэксту цесна звязаная з пошукам крытэрыяў ягонай агульнай эстэтычнай арганізацыі ў кантэксце светапогляду, індывідуальнага стылю ці стылю ўсёй літаратурнай плыні, філасофскага напрамку, прыхільнікам якіх з'яўляецца аўтар.

Аналіз паэтычнага тэксту прадугледжвае паглыбленае вывучэнне асобных элементаў мастацкай мовы (формы твора), асабліва тых, якія

наглядна дэманструюць эстэтычную спецыфіку паэтычнага тэксту. У актыў сучаснага літаратуразнаўства можна, напрыклад, уключыць комплексны падыход да мастацкага тропа, які заключаецца ў яго разуменні як сістэмы. Праз мастацкі троп выяўляецца кантэкст паэтычнага твора. Пры аналізе тропа асаблівая ўвага павінна надавацца яго паэтычнай каштоўнасці, якая рэгулюецца ўнутранымі законамі стварэння тропаў у дадзенай канкрэтнай мове і ў дадзеным канкрэтным творы. Структура тропа можа заставацца той жа самай, але пры змяненні, напрыклад, стылістычнага значэння і кантэксту значэнне тропа, як і яго ідэйна-эмацыянальны эфект, могуць змяніцца. Нездарма А. Патабня называў кожны троп мастацкім творам у мініяцюры: у тропе адлюстроўваюцца агульныя законы мастацкага цэлага, а характар ужывання тропаў заўсёды сведчыць пра індывідуальны аўтарскі стыль, мастацкую манеру напісання, у тропе выяўляецца ў сканцэнтраваным выглядзе тып вобразнага мыслення аўтара. Прычым справа не ў колькасці тропаў – кожны пісьменнік, кожны паэт адрозніваецца як характарам тропаў, так і актыўнасцю іх ужывання, – а ў іх сэнсава-эстэтычнай якасці, у тым, наколькі глыбока і трапна яны дапамагаюць раскрыццю мастацкай задумы аўтара, стварэнню цэласнай карціны паэтычнага твора, вобразнай аб'ёмнасці. Вобразная завершанасць, цэласнасць мастацкага твора ствараецца пры дапамозе арганічнага комплекснага спалучэння як вобразных сродкаў (тропы), так і «бязвобразных» слоў, шляхам прамога называння прадметаў і з'яў рэчаіснасці. Слова ў сістэме мастацкага твора выступае ў комплексе яго асаблівасцей – значэння, гучання, марфалагічнай аформленасці і сінтаксічна-рытмічнай арганізацыі. Асаблівае значэнне для стварэння мастацкай вобразнасці мае сама канструкцыя мовы, структура сказаў, адносіны паміж словамі, іх своеасаблівая граматычная аформленасць. Вобразная сіла трапнай дакладнай дэталі, прамой намінацыі «бязвобразнага» слова ў многім залежыць ад іх сінтаксічнага, шырэй – рытмічнага афармлення ў структуры мастацкага тэксту. Гэта найбольш выразна адчуваецца ў паэзіі, якая характарызуецца асаблівай упарадкаванасцю, раўнавагай, сіметрыяй розных адзінак. Паралелізмы, паўторы, разнастайна арганізаваныя сістэмы супастаўленняў і проціпастаўленняў – антытэзы, градацыі і іншыя структурна-граматычныя прыёмы дапамагаюць паэту вылучыць пэўнае слова, дэталь, падкрэсліць яго, сканцэнтраваць на ім увагу чытача.

Важным момантам комплекснага аналізу паэтычнага тэксту з'яўляецца адзін з асноўных яго аспектаў – стылістычны аналіз, паз-

бягаючы якога даследчык спрашчае даследаванне аўтарскай паэтычнай сістэмы. Стылістыка мастацкага тэксту вывучае слоўна-стылістычныя структуры, якія выкарыстоўваюцца для выражэння пэўнага зместу. Для таго каб разуменне паэтычнага тэксту было поўным і глыбокім, выкарыстоўваюцца такія прыёмы стылістычнага аналізу, якія дазваляюць разглядаць твор у адзінстве яго фармальных і змястоўных элементаў. Стылістычны аналіз у якасці сваіх мэтаў дапускае вылучэнне аднаго з бакоў твора – формы альбо зместу, але, тым не менш, у выніку імкнецца да разгляду гэтых катэгорый у дыялектычным адзінстве. Змест мастацкага тэксту не існуе па-за стылявымі формамі яго выражэння, а цэласнасць, адзінства твора вызначаецца фактарамі як змястоўнага, так і фармальнага ўзроўняў. Канчатковаю мэтаю стылістычнага аналізу з'яўляецца вызначэнне характару афармлення зместу, а таксама выяўленне эстэтычна значных структурна-стылістычных асаблівасцей мастацкага твора, таму прыёмы аналізу павінны накіроўвацца не столькі на моўныя факты, колькі на спосабы іх узаемадзеяння, арганізацыі. У гэтым выпадку ўвага акцэнтуецца на структурных прынцыпах мастацкага тэксту, на моўных прыёмах як асноўных фарматворчых канструктах. У якасці асноўнай і неабходнай перадумовы стылістычнага аналізу выступае лінгвістычны аналіз мастацкага тэксту, нягледзячы на тое, што ён няпоўна характарызуе ўласна мастацкую структуру тэксту, якая ствараецца за кошт спецыфічнай арганізацыі моўных сродкаў. На аснове лінгвістычнай характарыстыкі моўных сродкаў выяўляецца пэўны стылістычны прыём, вызначаецца і ацэньваецца роля кожнага моўнага элемента, які ў спалучэнні з іншымі элементамі ўдзельнічае ў стварэнні гэтага прыёму, а таксама структуры мастацкага тэксту ў цэлым. У гэтым рэалізуецца структурна-стылістычны метад аналізу мастацкага тэксту.

Владимир Капцев
Белорусский государственный университет

СТРАТЕГИЯ СОЗДАНИЯ МЕДИАМИФА (на примере Е. Евтушенко)

За последние полвека имидж писателя приобретает концептуальные черты. При этом всесторонний медиамиф основан на обоюдном интересе: СМИ видят в писателе медийную персону, писатель, в свою очередь, использует СМИ для самопрезентации. Личность Евгения Евтушенко – это попытка не только реализовать свой творческий потенциал через

новые творческие формы и актуальные темы в поэзии, но и первый осмысленный акт медийного мифотворчества, создание публичной поэтической биографии.

Евтушенко начинает создавать миф о себе с самого начала, изменив фамилию – Гангнус на Евтушенко (фамилия матери), год рождения – с 1932-го на 1933-й и место рождения – станцию Нижнеудинск на станцию Зима Иркутской области. Был исключен из Литинститута за поддержку романа В. Дудинцева «Не хлебом единым» в 1954 г.

Определяющая черта его имиджа – готовность быть постоянно на виду, моментально отзываться на текущие события. При этом медийная позиция Евтушенко – это постоянный активный поиск и создание ситуации, в которой он оказывается в центре внимания. Его миф о себе целиком основывается на публичности, когда творческая востребованность у читателя основывается на общественной и политической ролях поэта, его особом статусе в обществе: «поэт в России больше, чем поэт».

Здесь необходимо отметить актуальность поэтического слова, его документальность. Поэзия откликается на события в стране и мире практически одновременно с журналистскими сообщениями, однако у поэзии есть несомненное преимущество – своя особая гражданская традиция и экспрессивно-эмоциональный язык. Поэзию Евтушенко еще называют «поэтической журналистикой». Отклик не всегда был удачен в художественном плане, но имел огромный политический резонанс. Главный медийный парадокс Евтушенко не в том, что он создал поэзию «факта», приравняв ее к журналистскому репортажу, а в том, что его политическое лицо было разным в зависимости от события.

Миф о себе также строится на внутренней противоречивости, особой неуловимости поэтической личности: «Я разный – я натруженный и праздный. / Я целе- и нецелесообразный. / Я весь несовместимый, неудобный, / застенчивый и наглый, злой и добрый» (1955). Два принципа для самомифологизации, которые всегда интересны для читателя и зрителя, даже далекого от поэзии, – быть внутренне противоречивым и готовым оказаться в центре события, в том числе скандального. Поэт целенаправленно культивирует свою исключительность и на бытовом уровне. Так, Н. Бианки, секретарь «Нового мира», вспоминала случай, когда Евтушенко в повседневной беседе серьезно сказал: «Представь на минуту, какой был бы кошмар, если бы я не родился».

Евтушенко с равным успехом удалось свой медийный потенциал реализовать и в Советском Союзе и на Западе, что крайне редкий слу-

чай. С начала 1960-х Евтушенко – один из самых «выездных» поэтов СССР (побывал в 94 странах), его произведения переведены на 72 языка. В 1972 г. дал интервью журналу «Playboy». Отметим, что поэт на протяжении всей своей жизни понимал, что индекс узнаваемости также обеспечивается появлением «лица» на обложке. Эту тенденцию можно проследить, начиная с первых поэтических сборников, а в последнее десятилетие данный вариант не имеет альтернативы. В свою очередь, СМИ также не обделили автора своим вниманием, тем самым признавая его статус «лидера мнений» и медиаперсоны в одном ряду с политиками, спортсменами, поп-идолами. Здесь следует назвать культовые общественно-политические издания в России и за рубежом: «Огонек», «The Times», «Чайка».

Популярность становится залогом для создания медийного имиджа. Яркий, эмоциональный Евтушенко на протяжении всей своей жизни был востребован в медиа и как «герой времени», и как ведущий авторских программ. В 2013 г., будучи больным, он не смог приехать на празднование своего 80-летия из США, но дал ряд интервью и принял участие в телемосте со своими российскими читателями. 19 сентября он выписывается из больницы, а уже спустя месяц становится героем очередного проекта – цикла «бесед с Соломоном Волковым», где, по собственному заявлению, готов «набраться смелости для самоисповедальности». В 2014 г. в серии «ЖЗЛ: Биография продолжается» вышла книга И. Фаликова с характерным названием «Евтушенко: Love story».

В одной из своих ипостасей он совмещает литературу и общественную деятельность, занимаясь целенаправленным «возращением» русской поэзии (в рубрике «Антология русской поэзии 20 века» в «Огоньке» были впервые после долгого забвения опубликованы стихи репрессированных поэтов) или созданием ее целостного образа («Строфы века», сборник антологии русской поэзии в 4-х томах). Свою автобиографию он также представляет как поэтическую («Весь Евтушенко»), т. е. голос поэта-современника в поэтических документах эпохи. Главный принцип: биография поэта – это живое отражение времени, его потери и взлеты, запечатленные в поэтическом слове, которое дает возможность для поэта стать одним из главных «голосов» времени.

Евтушенко всегда отлично понимал, что медийная востребованность основывается на неординарном, эпатажном визуальном образе. Отсюда установка на яркие галстуки, «лоскутные пиджаки». Даже на I съезде народных депутатов Евтушенко вышел для выступления на трибуну в

белом костюме. Чтение стихов для Евтушенко – это эстрадный спектакль, своеобразный маленький перфоманс, читать и слушать его – это две большие разницы. Он придает большое значение визуальному образу, выступлению в качестве поэта на телевидении, понимая, что это принципиально иная перспектива для завоевания аудитории и самопрезентации.

Можно сравнить Евтушенко – «телевизионного героя» – с другим шестидесятником на телевидении – Робертом Рождественским (программа «Документальный экран» в 70-е гг.), чтобы ощутить, насколько Евтушенко получает удовольствие от собственной харизматичности. В наше время «шестидесятников» называли бы представителями молодежной контр-культуры.

Его писательское творчество и медийная биография являются неделимыми. Е. Евтушенко умело играл роль героя эпохи и понимал, что именно медийная стратегия – это залог успеха у публики, возможность находиться в центре внимания, устраивая своего рода состязание с самим собой. В собственном мифотворчестве он создает медийные поводы подобно поэтическим текстам, которые выражают поэтическую рефлексию на политическое событие. Такого рода внутренний заказ обеспечивает как популярность и востребованность, так и гражданскую позицию Евтушенко-поэта.

Уход поэта из жизни стал безусловным медийным поводом в России и Беларуси, сообщение о его смерти выносилось на первую полосу. Большинство называли Евтушенко «классиком», «человеком-эпохой». Журнал «Story» в майском номере представил фото поэта на обложке и слоган: «Он первым был – и он ушел последним», называя его последним из поколения «шестидесятников». И в этой фактической ошибке, на которую мало кто обратил внимание (к примеру, еще живы Ю. Мориц, А. Гладилин), есть парадокс информационного общества, в котором медийная личность уровня Евтушенко не приемлет вторых ролей и концептуальна в мифотворчестве теперь уже со стороны медиа.

Е. Евтушенко так и остался «разным» в воспоминаниях и оценках многочисленных друзей и недругов. Но даже сейчас сложно сказать, что перед нами – живой образ поэта, его собственный миф о себе или результат медийного мифотворчества. В целом преломление традиции отношения к поэту в России как явлению исключительному и во многом судьбоносному для своего времени и своей страны.

Екатерина Локтевич
Белорусский государственный университет

МИРОВОЗЗРЕНЧЕСКАЯ ПОГРАНИЧНОСТЬ А. А. БЛОКА: ПРОБЛЕМА ИНТЕРПРЕТАЦИИ

Еще в 1923 г. искусствовед М. Бабенчиков называл ошибочным представление о «раздробленности» духовного облика А. Блока, которое сформировалось в читательской среде и утверждалось литературной критикой начала прошлого века. Межсубъектность биографического автора он воспринял как оригинальное единство, целостность: «...на самом деле, Блок был, и неизменно оставался, неделимым» [1, с. 8]. Вопрос о сущности этой «неделимости» все чаще поднимается в современной науке о литературе. Так, Д. Е. Максимов обнаружил в лирике А. Блока «материал», характерный для иного сознания – сознания двойника поэта, и определил его как «признак трагического кризиса и болезни духа» [9, с. 162]. Этим можно объяснить насыщенность стихотворений автора «мотивами отчаяния, тоски, утрат, мотивами зловещих, нелюдских плясок…» [8, с. 161], приоритетность которых рассматривает И. Т. Крук. На *пограничность* религиозно-философских воззрений А. Блока обращает внимание И. В. Гречаник и выделяет основные черты мировоззрения поэта: «…антикантианство, ницшеанские, языческие и буддийские настроения» [4, с. 13]. К. А. Медведева подчеркивает, что А. Блок «создал свою философскую, социально-историческую, этико-эстетическую трактовку демонизма» [10, с. 63].

Современники А. Блока стремились проникнуть в тайну его лирики, разгадать феномен литературного дарования поэта. Так, в 1922 г. историк литературы А. Я. Цинговатов в эсто-психологическом этюде «Муза Блока…» [13] восхищался уникальностью «блоковской безвольности» [13, с. 5], «поэтического лунатизма» [13, с. 5], «магичности» [13, с. 5] и подчеркивал: «“Влекущая сила”, очарование, суггестивность, заразительность поэзии Блока остаются в новейшей русской литературе непревзойденными» [13, с. 5]. А. Ахматова называла А. Блока «не только величайшим поэтом первой четверти двадцатого века…, но и человеком-эпохой…» [5, с. 183]. Искренне восхищаясь талантом А. Блока, С. Городецкий утверждал, что «…ни его отчаяние, ни его “мировые запои”, ни его порывания к юному идеалу Прекрасной Дамы, ни арфы, ни скрипки его “Страшного Мира” не будут понятны, если не изучить большого русла, по которому он хотел идти – и не мог» [3, с. 14–15].

Таким образом, философско-эстетические, религиозные основания лирики А. Блока – ключ к пониманию феноменологической стороны его стихотворений.

Отметим, что в литературной критике начала XX в. нередко представлено и решительное неприятие, отвержение лирики А. Блока. Например, А. А. Измайлов понимал творчество поэта как «пародию на самого себя» [7, с. 48] и категорично утверждал, что «Блок, попавший в моду, стал разбрасывать свои стихи и прозу решительно повсюду, уподобляясь субъекту, страдающему несдержанием речи» [7, с. 47]. Сторонник субъективно-психологического подхода к анализу художественного текста А. К. Закржевский, высоко оценивая лирику А. Блока, тем не менее с сожалением отмечал наличие в ее образной системе «половинчатости» [6, с. 427], «земляной затхлости» [6, с. 427], «кошмарной удушливости» [6, с. 427], «ложного и мертвого пути» [6, с. 427].

Осмысляя динамику образа Прекрасной Дамы в связи с изменениями облика лирического героя А. Блока, З. Г. Минц вскрывает между ними уникальное сходство. Литературовед утверждает, что «“Двойники” лирического “я” сложно соотносятся с “двойниками” героини – при том что “я” и “ты” *при некоторых поворотах* лирической темы сами оказываются двойниками» [11, с. 358] (курсив наш. – *Е. Л.*). Анализ специфики инфернальных ипостасей субъекта сознания лирики А. Блока позволил З. Г. Минц увидеть парадоксальность корреляции лирического героя с другими субъектами и объектами сознания и речи: «…сила, красота и страстность “демонических” героев, – пишет она, – подготавливают рождение будущего гармонического человека» [11, с. 359]. В размышлениях о мере сложности дешифровки творческого пути А. Блока З. Г. Минц солидаризируется с С. Городецким и отмечает, что любой частный подход к его интерпретации «…будет допустимым, хотя и односторонним, упрощенным, любое перечисление аспектов – неисчерпывающим» [11, с. 361].

Нераздельность и неслиянность гармонии и хаоса в художественной системе А. Блока К. А. Медведева формулирует как единство сфер «там» и «здесь», подчеркивая, что центральные философские понятия поэта (*свет*, *тьма*, *миропорядок*, *беспорядок*, *ритм*, *звук*, *музыка* и др.) – «это не только “острия слов”… сферы “там”, но это и философское обобщение сферы “здесь”…» [10, с. 7]. Литературовед напоминает, что колыбелью демонического в области искусства А. Блок считает лирику, а смысл понятия «демонизм» сводится в системе философско-эстетических воз-

зрений поэта «к представлению о раздробленности “я” художника на множество двойников (“многих демонов”)» [10, с. 61]. Эти выводы, на наш взгляд, детально прорисовываются в процессе систематизации бытийных, инобытийных и небытийных образов поэзии А. Блока и анализа индивидуально-авторской коммуникативной стратегии.

«Двойничество в творчестве Блока, – пишет Д. Е. Максимов, – явление пути, неизбежный феномен развития поэта» [9, с. 158]. Литературовед заметил, что путь субъекта сознания лирики поэта движется от традиционного двойничества к его разветвлению: «…рядом с магистральным путем основного героя… намечались в потенции пути его двойников…» [9, с. 158]. Мы считаем, что первооснову такого двойничества и принципы его проявления можно раскрыть более полно, обратившись к процедурам и приемам системно-субъектного метода анализа поэтического текста.

Наиболее аргументированно философско-эстетические воззрения А. Блока представлены в культурологическом исследовании Н. Н. Суворовой, которая выявила в лирике поэта трансформацию «платоновской идеи “*двоемирия*”… в неоплатоническую и неогностицистскую идею “*многомирия*”» [12, с. 15]. Ученый предполагает, что в поэзии А. Блока идея «единого Абсолюта замещается представлением о множестве “иных миров”» [12, с. 15]. Ключ к пониманию представленного мировоззренческого синтеза Н. Н. Суворова видит в гипертрофированном толковании А. Блоком роли художника, его пророческой миссии: поэт «наделял его чертами богоборца, антагониста Бога, самовольно присвоившего пророческий дар» [12, с. 20]. Результаты, полученные исследователем, становятся очевидными в процессе анализа субъектно-образной структуры стихотворений поэта.

Разнообразие подходов к осмыслению лирики А. Блока вскрывает наличие малоизвестных семантических резервов художественного слова, переосмысленного русской поэзией начала XX в. Отсутствие специальных работ, направленных на постижение субъектно-образной структуры творчества поэта, требует дальнейшего научного осмысления лирики автора.

Н. А. Бердяев уверял, что «в суде над Блоком есть большая несправедливость и беспощадность» [2], ведь его трагическая судьба – «судьба беззащитной, обнаженной лирической души, которая способна противопоставить темным космическим волнам лишь поэзию» [2]. Религиозный философ напоминает о том, что «творчество совсем не связано

